ЛіМ
ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ГАЗЕТА
ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ
БЕЛАРУСІ

2 ЛЮТАГА 1996 г. № 5 (3829) Кошт 2 500 руб.

ЦЯГНІК СКРАНУЎСЯ...

Зінаіда ШАЎЧЭНКА: "Як ні сумна, але ўсе інвестфонды ў нас, шчыра кажучы, у безнадзейным стане. І не таму, што там сабраліся прайдзісветы".

5

ПРЫЧАСЦЕ

Вершы з новай кнігі Рамана ТАРМОЛЫ-МІРСКАГА

8

СОНЦА СУНГА

Апавяданне Ягора КОНЕВА

9, 12

АВАНГАРД? ГЭТА ЁМІСТА!

Аляксандр ЛІТВІНОЎСКІ: "Я адчуў, што гэта — не зусім Польшча, было вельмі дзіўнае адчуванне: навошта тут мяжа і такая жорсткая мытня? Але і тое, што гэта Беларусь, я не адчуў, на жаль".

10—11

КУДЫ ІДЗЁМ?

Яўхім ІВАНОВІЧ: "Бывае, даводзіцца чуць: за "бугром" дзяржавы таксама субсідзіруюць і дацірующь фермерскія гаспадаркі. Так, не без гэтага. Але ж робіцца тое не дзеля таго, каб стымуляваць іх вытворчасць, а, наадварот, каб затармазіць, нават прыпыніць яе на нейкі час".

15

ІМ РАЗАМ — 25!

ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР МУЗЫЧНАЙ КАМЕДЫІ БЕЛАРУСІ АДСВЯТКАВАЎ СВОЙ ПЕРШЫ ЮБІЛЕЙ

А ўсё, відаць, ніколі — ні ў 50, ні ў 60, ні ў 75 — не адчуе сённяшні імяніннік цяжару пражытых гадоў, як і мы — не ўбачым яго пабранзавелым ад саліднага юбілейнага ўзросту. Хаця святкаванне свайго 25-годдзя тэатр зладзіў на ўзроўні сапраўды салідным. Разгарнуў панараму рэпертуарных набыткаў, адвёўшы на яе агледзіны цэлы тыдзень. А днямі — 31-га ды 1-га — былі гала-канцэрт з удзелам гасцей ды юбілейныя ўрачыстасці: віншаванні, шанаванні, "капуснік"... Пра гэта мы яшчэ раскажам. Пакуль жа — угледзьцеся ў здымкі з лепшых спектакляў і пераканайцеся, што сярэдні ўзрост іх чыннікаў — 25. Жанр такі, абавязвае да маладосці...

На здымках Віт.АМІНАВА — майстар музычнай сцэны Ніна РАВІНСКАЯ; дуэт "зорак" — Наталля ГАЙДА ды Арнольд РАНЦАНЦ; салісты маладога балетнага калектыву Юлія ДЗЯТКО ды Кастусь КУЗНЯЦОЎ.

ЛІТ КОЛА ДЗЁН

Расія прынята ў Савет Еўропы... Калі глядзець з Беларусі, адзінай з постсавецкіх краін, якая пакуль не прынята ў гэтую міжнародную арганізацыю, то такое рашэнне бачыцца па меншай меры парадаксальным, калі не абсурдным. Бо, здавалася б, ужо толькі з-за падзей у Чачні дзверы ў Савет Еўропы перад Расіяй павінны былі б быць зачынены, як зачынены яны для краін былой сацыялістычнай Югаславіі, дзе таксама ідзе вайна; бо прычына, з-за якой не прымаецца ў шаноўную арганізацыю Беларусь — недэмакратычнасць некаторых законаў, — выглядае проста смешнай. Вядома, у тым, што з намі не лічацца, што з 1992 года не разглядаецца заяўка Беларусі на прыём у Савет Еўропы, вінаваты найперш мы самі — не былі настойлівымі, азіраліся на паводзіны суседкі і г. д. І таму яшчэ больш крыўдным ў і ганебным выглядае сённяшняе наша становішча: І тут беларусы апошнія... Памятаеце: "А хто там ідзе?"

УВАГА ТЫДНЯ

У адным інтэрв'ю "Комсомольской правде" тады яшчэ кіраўнік знешняй разведкі Расіі Яўген Прымакоў прызнаўся, што з першых дзён утварэння незалежных краін на тэрыторыі СССР Расія ніколі не забывала пра свае інтарэсы ў іх і, па мажлівасці, старалася кіраваць працэсамі, якія там адбываліся. Стаўшы міністрам замежных спраў Расіі, Я. Прымакоў, мяркуючы па ўсім, свайму крэда не здрадзіў. Дзейнасць на новай пасадзе ён пачаў з аб'езду былых рэспублік СССР. На Беларусі ён быў прыняты па вышэйшым разрадзе. Адбыліся перамовы з прэзідэнтам нашай краіны, з прэм'ер-міністрам, са спікерам парламента, з міністрам замежных спраў. І на кожнай з гэтых сустрэч абавязкова падкрэслівалася, што Беларусь і Расія — асуджаны на супрацоўніцтва. Гучалі і новыя тэзісы, тыпу: "Суверэнітэт — не ёсць незалежнасць" і "Залежнасць адной дзяржавы ад другой — не ёсць пагроза яе суверэнітэту, а нармальная з'ява". Каб жа было гэтак у жыцці, як на словах!

ПРЫЗНАЧЭННІ ТЫДНЯ

Людзі творчыя амаль два гады чакалі гэтага рашэння. За гэты час на вакантнай пасадзе міністра культуры "пабывалі" дзесяткі чалавек. І вось пазаўчора адным указам прэзідэнта ўсе чуткі і "вылучэнні" адкінуты ў небыццё: міністрам культуры Беларусі прызначаны Уладзімір Аляксандравіч Сасноўскі, цяпер ужо былы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама, гісторык па адукацыі і вопытны адміністратар, які шмат часу аддаў якраз працы ў галіне культуры, адукацыі і спорту. І яшчэ адно чаканае прызначэнне — галоўным рэдактарам выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" стаў паэт Генадзь Пашкоў.

ПРЫЗНАННІ ТЫДНЯ

Цікавае атрымалася інтэрв'ю ў карэспандэнта "Звязды" Валера Каліноўскага з першым намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета Юрыем Малумавым. Віцэ-спікер быў шчырым аж да самавыкрыцця, што ў нашай сітуацыі здаецца дзіўным, незвычайным, бо абсалютная большасць дзяржаўных чыноўнікаў у нас — зацятыя маўчуны. Ю. Малумаў адкрыта казаў пра свае адносіны да прэзідэнта: "Я буду чалавекам прэзідэнта ў парламенце...", да Канстытуцыйнага суда: "Я буду спрабаваць унесці змены ў Канстытуцыю, якія ліквідуюць Канстытуцыйны суд...", і асабліва — да беларускай мовы: "У рэальным жыцці беларуская мова мае нават большы (статус, чым руская). Для яе зроблена больш, чым для рускай мовы. За папярэднія чатыры гады руская мова проста ўзмоцнена выкаранялася з жыцця", "Прайшоў рэферэндум. Што змянілася? Нічога?", "У нас цудоўная сітуацыя з мовамі, я не бачу праблем", "Інтарэсы меншасці павінны быць улічаны, але яны павінны зразумець, што большасць выращыла іначай", "Вы лічыце, што этнічныя беларусы павінны абавязкова гаварыць на беларускай мове? Вы хочаце іх сілай прымусіць?" Але — досыць цытавання. Партрэт сённяшняга беларускага "дэмакрата" і змагара за дэмакратычныя ідэалы і без таго атрымаўся выключна дакладным.

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

"Нацыянальная ідэя — гэта кансалідацыя народа на аснове любові да сваёй зямлі, гісторыі і культуры, да саміх сябе і ўсведамленне ў гэтым агульнасці жыццёвых інтарэсаў. Чалавек, які ўсведамляе нацыянальную ідэю (нацыянальна свядомы), звязвае свой поспех і сваё шчасце з поспехам і шчасцем свайго народа. Нацыянальная ідэя здольная кансалідаваць усіх, незалежна ад палітычнай арыентацыі. Дарэчы, камуністаў і антыкамуністаў. Напрыклад, і Бразаўскас, і Ландсбергіс гавораць на адной мове. На Беларусі ж, аднак, камуністы служаць не нацыянальнай ідэі. Адсюль іх антыбеларускасць, варожасць да суверэнітэту і г. д... Сучасная Еўропа, яе шматдзяржаўнасць, яе дэмакратыя, сістэма эканамічных і гуманітарных каштоўнасцей гістарычна сфарміраваліся на аснове нацыянальнай ідэі як найбольш кансалідуючай натуральнай і ўсім зразумелай. Большасць еўрапейскіх краін ужо засвойваюць інцыя каштоўнасці, заснаваныя на нацыянальнай ідэі. Беларусь жа ў поўнай меры не вырашыла яшчэ вызначальных паняццяў: нацыянальная дзяржава, дзяржаўная беларуская мова і нават беларуская нацыянальная свядомасць, без якой немагчымая нацыянальная дзяржава".

(З інтэрв'ю Зянона Пазняка "Звяздзе" — "Хто змагаецца, той перамагае", 30 студзеня г. г.)

СКАНДАЛЬЧЫК ТЫДНЯ

За час, пакуль на Беларусі "не было" парламента, прэзідэнт паспеў памяняць усіх сілавых міністраў. Аднак цяпер давядзецца ім усё роўна прайсці праз парламенцкія калідоры. І падрыхтоўка да гэтага пачалася. Першым "засвяціўся" самы апошні па часе прызначэння — міністр унутраных спраў В. Агалец. "Міністра сапсавала кватэрнае пытанне", — піша "Свабода" і нагадвае пра кватэрныя махінацыі міністра, за якія некалі калегія МУС прапанавала Савету Міністраў вызваліць В. Агальца з займаемай на той час пасады і ўрад пагадзіўся з гэтым. Пасля абрання на Беларусі прэзідэнта, В. Агалец зноў пайшоў у рост і летась у снежні стаў міністрам. Як паглядзіць на гэта ВС, ці пойдзе ён на канфрантацыю з прэзідэнтам? І што новае даведаемся мы яшчэ пра іншых міністраў — бо час збіраць кампрамат прыйшоў.

"ДАПАМОГА" ТЫДНЯ

Вытворчае аб'яднанне "Гарызонт" атрымала першыя 3 мільярды рублёў з выдзеленых прэзідэнтам 25 мільярдаў. На чарзе — дапамога прэзідэнта вытворчаму аб'яднанню "Інтэграл". Без заробку сядзяць і рабочыя МТЗ, МАЗа, іншых прадпрыемстваў. Не за гарамі і сяўба — калгасам трэба будуць паліва і ўгнаенні... А вы кажаце — бюджэт, бюджэтнікі. Які ж бюджэт вытрымае на сабе ўтрыманне тых, хто якраз і павінен папаўняць гэты бюджэт? І адкуль жа будуць грошы настаўнікам і пенсіянерам, калі рабочыя сядзяць без іх (грошай)?.. Дарэчы, прэзідэнцкая дапамога не вырашыць праблем "Гарызонта", а дазволіць толькі выпусціць 1,5 тысячы тэлевізараў пры нармальным рэжыме работы 30 тысяч штук у месяц. А значыць, грошы будуць кінутыя на вецер, а вырашэнне праблемы — проста адсунута на нейкі час.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАВІНШАВАЎ ІВАНА ШАМЯКІНА

Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка 30 студзеня прыняў у сваёй рэзідэнцыі народнага пісьменніка Беларусі Івана Пятровіча Шамякіна.

Прыемнай падставай для сустрэчы паслужыла 75-годдзе майстра айчыннай літаратуры. У Блакітнай зале кіраўнік дзяржавы цёпла павіншаваў юбіляра, уручыў яму падарункі і кветкі. У сваю чаргу і Іван Шамякін прыйшоў да Прэзідэнта не з пустымі рукамі.

Ён падарыў Аляксандру Лукашэнку свой апошні трохтомнік і кнігу "Сатанінскі тур", прысвечаны падзеям нашага часу. А ў праведзенай гутарцы народны пісьменнік падзяліўся з кіраўніком дзяржавы тымі праблемамі, якія перажываюць цяпер беларуская літаратура і яго калегі па пяру.

Вольга ШЧАДРЫНА,
БЕЛТА

На здымку: у час сустрэчы.
Фота Аркадзя НІКАЛАЕВА, БЕЛТА

Я — НЕФАРМАЛЬНЫ БЕЛАРУС?..

БНФ пасля выбараў — гэта можа быць тэмай спецыяльнага доследу. Што страціў і што прыдбаў Фронт з таго, што ягоных прадстаўнікоў няма ў новым Вярхоўным Савеце? Ці ўтрымае Фронт свой электарат? Застанецца БНФ рухам альбо трансфармуецца ў партыю? Як складуцца ягоныя стасункі з іншымі аб'яднаннямі дэмакратаў? Адказаць на гэтыя пытанні — значыць, увогуле ахарактарызаваць палітычную сітуацыю ў Беларусі.

Вынікі парламенцкіх выбараў многімі ў нашай краіне і за мяжою ўспрыняты як параза беларускай нацыянальнай ідэі. У кагосьці яны спарадзілі спадзяванне на рэанімацыю СССР. Тыя, хто некаторы час пасля абвяшчэння незалежнай Рэспублікі Беларусь, сядзелі, як мыш пад венікам, і чакалі, што з гэтага атрымаецца, сёння святкуюць: нічога, маўляў, не атрымалася, зноў "запрасілі на царства" камуністаў!

Ды ўсё ж хаду гісторыі можна запаволіць, але немагчыма спыніць. Калі Беларусь не знікла пасля двухсот год расійскай акупацыі і польскай экспансіі, значыць нашай краіне Богам наканавана быць незалежнай. Пытанне толькі пра тое, якую цану нам яшчэ давядзецца за гэта заплаціць.

Нацыянальная ідэя сёння — так можна акрэсліць галоўную тэму, што абмяркоўвалася на сойме БНФ 13 студзеня. Галоўная пагроза суверэнітэту краіны зыходзіць з Усходу. У заяве "Аб стратэгічным курсе Расійскай Федэрацыі абароне дзяржаўных інтарэсаў Беларусі" ідзе гаворка аб указе прэзідэнта РФ Барыса Ельцына N 940 ад 14 верасня мінулага года "Аб зацвярджэнні Стратэгічнага курсу Расійскай Федэрацыі з дзяржавамі — удзельніцамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў". У тэксце дакумента, у прыватнасці, гаворыцца: "...На тэрыторыі СНД засяроджаны нашы галоўныя жыццёвыя інтарэсы ў галіне эканомікі, абароны, бяспекі, абароны правоў расіян, забеспячэнне якіх складае аснову нацыянальнай бяспекі краіны" (п. 1). Тэрыторыя дзяржаў СНД адкрыта называецца "зонай інтарэсаў Расіі" (п. 14). Ставіцца задача ўмацаваць Расію ў якасці "вядучай сілы" ў рэгіёне (п.4), для чаго плануецца ўцягнуць постсавецкія дзяржавы ў палітычнае аб'яднанне (п. 2) і "абаронны саюз" (п.12), дамагчыся аховы "межаў па перыметры СНД... супольнымі намаганнямі" (п.13), захоўваць "вядучае становішча Расіі на рынках СНД" (п. 19), ажыццяўляць інфармацыйную экспансію Расіі ў краіны СНД (п. 15) і г. д.

Рэалізацыя дактрыны "стратэгічнага курсу" на практыцы азначае падначаленне ўсёй дзейнасці СНД інтарэсам Расіі, адсоўванне іншых краін Садружнасці з міжнароднай арэны як самастойных суб'ектаў. Нядаўна віцэ-прэм'ер РФ А. Бальшакоў заявіў, што Расія нясе "адказнасць" (?) за краіны СНД... дарэчы чачэнская вайна якраз і паказвае ўсяму свету, як разумее Масква "адказнасць" за тыя ці іншыя тэрыторыі.

"У гэтай нябяспечнай сітуацыі ад Беларусі патрабуюцца неадкладныя знешнепалітычныя, эканамічныя і заканадаўчыя захады для адстойвання суверэнітэту, у прыватнасці — узгаднення палітыкі ў межах СНД з іншымі дзяржавамі, перадусім з Украінаю". — гаворыцца ў заяве сойма.

Сойм прыняў зварот "Да гадавіны расійска-чачэнскай вайны". "Мы асуджаем тэрарызм, лічым, што святая мэта не апраўдвае любых сродкаў. Але тое, што адбываецца цяпер у гэтай вольналюбівай каўказскай краіне — знішчэнне бомбамі і ракетамі цэлых гарадоў з жыхарамі, руйнаванне паселішчаў танкамі, выбары "пад рулямі расійскіх войск" — іначай як дзяржаўным тэрарызмам і генацыдам супраць чачэнскага народа назваць нельга".

Зварот перасцерагае ад ваеннага саюза з Расіяй, які перакрэсліць наш суверэнітэт і зацягне Беларусь у крывавыя войны за імперскія інтарэсы Масквы.

Не толькі звонку, але і знутры краіны існуе пагроза суверэнітэту Беларусі. Пра гэта заява "Да 700-х угодкаў дзяржаўнасці беларускага нацыянальнага герба "Пагоня" сем стагоддзяў таму, на мяжы 1295—1296 гадоў, у першай сталіцы Вялікага княства Літоўскага Наваградку вялікі князь Віцень абвясціў спрадвечны герб "Пагоня" дзяржаўным гербам нашай старажытнай дзяржавы. У заяве названы асноўныя вехі гісторыі "Пагоні". Сцяг з "Пагоняй" лунаў над беларускім войскам у часы вялікіх перамог і трагічных параз. Пад "Пагоняй" наш народ бараніў Радзіму ў бітвах на Сініх Водах, пад Грунвальдам, Клецкам, Оршай. Гэта сцяг Андрэя Тадэвуша Касцюшкі, Кастуся Каліноўскага, случакоў — воінаў БНР. Бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня" — афіцыйныя дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь (у адпаведнасці з Законам ад 19 верасня 1991 года).

"Інспіраваны і праведзены антыбеларускімі сіламі 14 траўня рэферэндум па сутнасці сваёй не законны. Ён адбыўся з шэрагам парушэнняў, і вынікі яго не маюць юрыдычнай моцы. Мадыфікаваныя кімсьці сталінскі сцяг і герб — абразлівыя для беларускай нацыі. Да таго ж на "рэферэндуме" 14 траўня 1995г. бальшыня народу Беларусі не здрадзіла гістарычным сімвалам і не прыняла "новы —стары герб і сцяг".

Сойм БНФ звярнуўся да ўсіх патрыятычных арганізацый краіны, да ўсяго беларускага народа правесці ў 1996 годзе святкаванне 700-х угодкаў дзяржаўнага герба "Пагоня". Сойм звярнуўся да Вярхоўнага Савета Беларусі з прапановай абвясціць 1996 год Годам Беларускага Дзяржаўнага Герба "Пагоня" і шырока адзначыць гэтую унікальную дату нашай гісторыі.

Сойм звярнуўся да Вярхоўнага Савета з заклікам не зацвярджаць вынікаў ганебнага рэферэндуму і стварыць камісію па расследаванні парушэнняў Канстытуцыі і законаў пры яго правядзенні.

Палітычныя апаненты беспадстаўна абвінавачваюць БНФ у экстрэмізме і этнацэнтрызме. Маўляў, Фронт трактуе Рэспубліку Беларусь як "Беларусь для беларусаў", як дзяржаву, у якой няма месца людзям іншай нацыянальнасці. Той, хто хоць крыху знаёмы з дзейнасцю БНФ і ягонымі праграмнымі дакументамі, ведае, наколькі абсурдныя гэтыя абвінавачванні. Праўда, нельга не здзівіцца своеасаблівасцям мыслення тутэйшага люду: шмат якіх бацькоў палохае, што іх дзяцей "прымусяць вучыць беларускую мову", і каб гэтага не адбылося, яны гатовы на якую заўгодна форму "інтэграцыі" з Расіяй, вынікам якой будзе служба іхняга сына ў расійскім войску з перспектывай бясслаўнай і пакутлівай смерці ў якой-небудзь "гарачай кропцы". Ляноту сваёй душы гэтыя людзі гатовыя аплачваць крывёй сваіх дзяцей.

На сойме ў чарговы раз было пацверджана, што лозунг "Беларусь для беларусаў" па аналогіі з "Амерыка для амерыканцаў" альбо "Францыя для французаў" быў бы актуальным у адносна нядаўнім мінулым, калі ўтвараліся нацыянальныя дзяржавы і праз дзяржаўнасць сцвярджаліся нацыі. Сёння — іншая сітуацыя. Сёння такія лозунгі могуць успрымацца як праява ізаляцыянізму, між тым як увесь свет шукае згоды дзеля вырашэння глабальных праблем. Сёння нацыянальная ідэя можа быць выяўлена словамі "Беларусь — наш агульны дом".

Дарэчы, яшчэ колькі год назад формулу беларускасці вывеў паэт Сяржук Сокалаў-Воюш: "Адзнака ў пашпарце яшчэ не права звацца беларусам" (верш "Я — нефармальны беларус"). Сёння пра гэта гавораць палітыкі.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

НАПАМІНАК!

Дзіўная рэч! Я да дробязей помню аблічча, твары многіх маіх даваенных аднакласнікаў, але не магу дакладна ўспомніць, што было на месцы некаторых сённяшніх мінскіх вуліц у даваенным Мінску. Хіба што дапамагаюць зарыентавацца асобныя забудовы: Дом урада, Дом афіцэраў (тады Чырвонай Арміі), Дом друку, Камароўка, плошча Свабоды і некаторыя іншыя "аб'екты", што захаваліся з таго часу ў зруйнаванай вайною сталіцы.

Вось і сёння не магу дакладна ўспомніць, дзе размяшчаўся даваенны іпадром. Толькі па нейкіх прыкметах здагадваюся, што недзе ў раёне цяперашняй Кастрычніцкай вуліцы, у лукавіне Свіслачы, тады далёкай Мінскай ускраіны... Аднак жа той дзень помню, нібы было гэта ўчора. Помню вялікі натоўп, які запоўніў плошчу былога іпадрома, шыбеніцы, што выстраіліся ў рад (чамусьці яны падаліся мне вельмі высокімі, ці не з двухпавярховы дом). Нібы сёння бачу некалькі "студабекераў", што пад'ехалі да іх. І як сёння чую цяжкі ўздых людзей, калі пад шыбеніцамі загайдаліся целы павешаных. Я стаяў далёка, мне было дрэнна відаць, як праходзіла сама працэдура пакарання смерцю. Потым ужо, калі разыходзіліся людзі, чуў ад тых, што стаялі наперадзе, што машына з адкінутым заднім бортам пад'язджала пад самую шыбеніцу, на шыю асуджанаму надзявалі пятлю, пасля чаго машына тутжа ад'язджала. Яшчэ запомнілася цяжкая цішыня, што навісла над натоўпам падчас экзекуцыі. Ні зласлівых выгукаў, ні радасці на тварах. Гэта было тым больш нечакана, што ўсё, пра што я згадваю, адбывалася ў канцы студзеня 1946 года, калі каралі фашысцкіх вылюдкаў, рукі якіх былі ў крыві тысяч нявінных ахвяр. Ды, відаць, для нармальнага чалавека само відовішча пакарання смерцю невыносна цяжкае...

Усё тое паўстала перада мной днямі ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе была наладжана выстаўка, прысвечаная пяцідзесяцігоддзю судовага працэсу па справе аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі ў часы гітлераўскай акупацыі.

Праходзіў працэс у мінскім Доме афіцэраў з 15 па 29 студзеня 1946 года. На лаву падсудных было пасаджана 18 чыноў нямецкай арміі, сярод іх — 3 генералы і 9 афіцэраў, якія абвінавачваліся ў знішчэнні мірнага насельніцтва ў гарадах і сёлах рэспублікі. "Подзвігі" іх знайшлі адлюстраванне ў прадстаўленых у экспазіцыі шматлікіх дакументах — загадах акупацыйных улад, фашысцкіх партызанскіх улётках, фотаздымках, ад якіх стыне кроў у жылах — штабялі трупаў у толькі што вызваленых лагерах савецкіх ваеннапалонных у Масюкоўшчыне і "Шталагу—352" пад Мінскам, лагерах смерці ў Трасцянцы, Азарычах, Магілёве і многіх іншых месцах.

Сярод экспанатаў выстаўкі — матэрыялы самога працэсу і вытрымкі з паказанняў злачынцаў: брыгадэнфюрэра СС Герфа, генерал-лейтэнанта Рыхерта, ваеннага каменданта г. Магілёва Эрдмандсдорфа, камісара гестапа Коха і іншых, якія на працэсе вылузваліся са скуры, каб давесці, што выконвалі толькі загады фюрэра, а самі ні ў чым не вінаватыя. І меў рацыю былы партызан-заслонавец А. Андрэеў, які выступаў на адкрыцці выстаўкі і якому давялося прысутнічаць на згаданым працэсе, сказаўшы, што распаўсюджанае ўяўленне аб тым, што ў ролі карнікаў на акупаванай тэрыторыі выступалі толькі эсэсаўцы, гестапа і іншыя гітлераўскія спецслужбы, не перадае ўсёй праўды — генацыдам супраць мірных жыхароў заплямілі сябе і вермахт.

Судовы працэс над гітлераўскімі злачынцамі ў Мінску набыў значны грамадскі рэзананс. Пра гэта сведчаць прадстаўленыя ў экспазіцыі газетныя матэрыялы, сярод якіх прыцягвае да сябе ўвагу вялікі артыкул Якуба Коласа "Суд ідзе!", змешчаны ў газеце "Советская Белоруссия".

І яшчэ адна адметная дэталь — цікавасць да Мінскага працэсу абудзілася сёння ў Германіі, грамадская думка якой у апошнія гады хіліцца да пакаяння за злачынствы нямецкай арміі ў час вайны супраць СССР. На выстаўцы дэманструецца нямецкая газета, назва якой па-беларуску перакладаецца як "Праўда прад знакам часу", дзе змешчана стэнограма Мінскага працэсу. Увагу наведвальнікаў прыцягне і афіша спектакля, пастаўленага летась у Гамбургу па матывах таго ж суда ў Мінску над фашысцкімі карнікамі. Пастаўлены спектакль пры садзеянні прыватнага гамбургскага інстытута сацыялагічных даследаванняў "Злачынствы вермахта ў 1941—1945 гады".

Напамінак! Гэтым словам я б вызначыў пафас выстаўкі. Напамінак пра тое, што было. Што ніколі не павінна паўтарыцца.

М. ЗАМСКІ

Варункі

НАШЫЯ БАЦЬКІ

На нашых бацьках (а часткова і на нашым пакаленні) перарвалася, у асноўным, беларускае слова. Для іх — 50-гадовых і старэй — яна яшчэ мова бесперапынная, нават калі зараз яны і гавораць па-расійску ці на трасянцы.

Мой бацька гаворыць па-расійску. Ягоная сям'я выехала, уцякаючы ад голаду, з калгаса перад вайною, абжываць "вызваленую" Карэлію. Пасля разрабаванай калектывізацыяй Беларусі — гэта быў рай.

Там, на Поўначы, яны перажылі вайну, і дзеці, абзавёўшыся сем'ямі, пачалі вяртацца на Беларусь толькі ў 60-х.

Баба Марыя, нягледзячы на чвэрць стагоддзя жыцця ў Карэліі, сваёй мовы не змяніла, так і прагаварыла там па-беларуску. А бацька, вярнуўшыся, толькі навучыўся чытаць. Праўда, ён з такіх рускамоўных беларусаў, якія без усялякіх агаворак ЗА Беларусь. Ён ніколі не пярэчыў маёй беларушчыне, а толькі падтрымліваў яе.

Маці пражыла ў Карэліі меней. Гадоў з дзесяць. Уцякала з вёскі праз вярбоўку ўжо ад пасляваеннай галадухі. Смеючыся, распавядала, як, толькі навучыўшыся "чигирикать", кпілі, перадражнівалі тых з беларусаў, хто быў з новых перасяленцаў, не прызнаючыся спачатку, што самі таксама — беларусы.

Пасля таго, як вярнулася з бацькам і намі, дзецьмі, на Беларусь, чым долей жыла, тым болей, проста на маіх вачах, абсыпалася з яе руская мова. Забываліся знікалі расійскія песні, а спявалася толькі сваё. Гаварыла яна так, як гавораць на яе Мазыршчыне — спеўна і прыгожа. І маё замілаванне мелодыкай нашае мовы, любоў да слова — ад яе, ды ад яе маці, маёй бабулі Соні. У вёсцы ў яе я бавіў кожнае лета. Бабуля ўвогуле па-расійску неўмела.

Светлагорск, дзе мы пасяліліся пасля Карэліі, — быў "всесоюзной стройкой". Толькі ў нашым пад'ездзе жыла добрая трацінa небеларусаў. Часам маці, вострая на язык, чуючы абгаворы беларускага, што пачало апошнім часам з'яўляцца і там, весела кідала сваім сяброўкам-суседкам: "Беларускія парадкі вам не падабаюцца? Нічога, прыйдуць нашыя беларусы да ўлады, яны вас усіх у 24 гадзіны адсюль павысяляюць".

Цесць з цешчаю — з Лоева. Гаварылі, як яны кажуць, "палоеўску" — на дзесяць беларускіх слоў адное расійскае. А дзяцей ужо вучылі па-расійску.

Цесць, які скончваў школу яшчэ перад вайною, заўсёды падкрэслена казаў: чаравікі, брыль, цукеркі. Але, як праўдзівы камсамолец-інтэрнацыяналіст 30-х гадоў і як праўдзівы камуніст, які ўсё жыццё на раённым узроўні нёс святло ідэй партыі ў народныя гушчы, мовы не любіць, хаця і гаворыць на ёй. Парадокс? Толькі не для нас, хто добра памятае ўсю падступнасць гэтых камуністычных ідэй.

Іхняе пакаленне праэксперыментавала на сваіх дзецях, на ўсім наступным пакаленні, адарваўшы іх ад свайго роднага, беларускага на карысць хімернай ідэі пра выхаванне новага "савецкага" чалавека, фактычна пазбавіўшы сваіх дзяцей нацыянальнай маралі.

Зараз гэты "савецкі" чалавек, не маючы нічога святога за душой, цынічна рагоча, чуючы словы: Радзіма, мова, дзяржава. Для яго яны — пусты гук. Ён гатовы прадаць сваю зямлю хоць д'яблу, абы болей заплаціў. І ён ля ўлады.

Ды ўсё роўна я рады бачыць цесця і чуць ягоную гаворку. Пры спатканнях падкрэсліваю сыну: маўляў, чуеш, і твой дзед размаўляе па-беларуску. Менавіта гэта ў ім — нашае, праўдзівае, няштучнае, тое, што мы пастараемся захаваць.

Алесь БЯЛЯЦКІ

ТАЛЕНТЫ! ВАС ШУКАЕ... ПРЭЗІДЭНТ

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі заснаваны спецыяльны фонд Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Савет фонду ўзначаліў народны артыст СССР Мікалай Яроменка, а ў склад савета ўвайшлі народны мастак Беларусі Гаўрыла Вашчанка, народная артыстка Марыя Захарэвіч, старшыня Беларускага саюза музычных дзеячаў Міхаіл Дрынеўскі, паэт, дырэктар выдавецтва "Юнацтва" Валянцін Лукша, кампазітары Ігар Алоўнікаў і Эдуард Зарыцкі, прадстаўнікі творчых калектываў, навучальных устаноў.

Мэта фонду — фінансаванне мерапрыемстваў, прадугледжаных адпаведнымі рэспубліканскімі праграмамі ў галіне культуры і мастацтва, накіраванымі на стварэнне ўмоў для пошуку, станаўлення і развіцця таленавітай моладзі.

Паступленні ў фонд будуць накіроўвацца з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі, сюды ж будуць паступаць добраахвотныя ўзносы беларускіх і замежных грамадзян, прадпрыемстваў, арганізацый і іншых юрыдычных асоб. Гэта могуць быць як грашовыя сродкі, так і матэрыяльныя, культурныя каштоўнасці.

Сродкі фонду могуць быць накіраваны на выплату стыпендый, аказанне матэрыяльнай дапамогі, набыццё музычных інструментаў і матэрыялаў для заняткаў выяўленчым мастацтвам, арганізацыю стажыровак, ажыццяўленне творчых праектаў, удзел моладзі ў конкурсах, выстаўках, сімпозіумах, іншых акцыях, звязаных з развіццём культуры, а таксама для арганізацыі фестываляў, канцэртаў, выставак, публікацый і іншых мерапрыемстваў па заахвочванні маладых талентаў, дзеля аказання дапамогі ў навучанні адоранай моладзі, удасканаленні яе прафесійнага майстэрства.

У ПРЭЗІДЫУМЕ СП

На чарговым пасяджэнні прэзідыума рады Саюза беларускіх пісьменнікаў, што праходзіла ў панядзелак, 29 студзеня, абмяркоўваліся два пытанні. Першае было звязана з вылучэннем твораў на атрыманне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь. Як вядома, яны прысуджаюцца раз у два гады. Значыць, чарговае прысуджэнне адбудзецца напярэдадні 1997 года. Вылучаць творы могуць розныя арганізацыі. У Саюзе пісьменнікаў спачатку свае прапановы робяць творчыя секцыі і сакратарыят, іхнія прапановы выносяцца на тайнае галасаванне членаў прэзідыума.

Так адбылося і гэтым разам. Асаблівых пярэчанняў супраць тых, хто быў вылучаны секцыямі і сакратарыятам, не было. Праўда, з'явіліся дапаўненні. Пасля падвядзення вынікаў галасавання стала вядома, што прэзідыум рады Саюза беларускіх пісьменнікаў вылучыў: на атрыманне Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы — раман Г. Далідовіча "Заходнікі", прэміі імя Якуба Коласа — кнігу паэзіі М. Купрэева "Правінцыйныя фантазіі", у галіне дзіцячай літаратуры — кнігу У. Ягоўдзіка "У царстве Вадзяніка", на прэмію імя К.Каліноўскага — зборнік сачыненняў школьнікаў на чарнобыльскую тэму "След чорнага ветру".

Другое пытанне парадку дня — план асноўных мерапрыемстваў Саюза пісьменнікаў на першае паўгоддзе 1996 года. У прыватнасці, на пасяджэннях прэзідыума будуць заслуханы справаздачы сакратароў абласных аддзяленняў СП, абмеркавана публіцыстыка на старонках штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" і часопісаў. Па прапанове Г. Бураўкіна ўнеслі на разгляд яшчэ адно пытанне, якое, як на сённяшні дзень, дык набывае першаступеннае значэнне — пра тое, як у школах пачувае сябе беларуская мова.

Запланаваны і два "круглыя сталы". На адным з іх у полі зроку прысутных будзе такое пытанне, як масавая культура і яе ўздзеянне на нацыянальную культуру, на другім — гаворка пойдзе пра тое, як літаратура садзейнічае выхаванню патрыятызму, адданасці Бацькаўшчыне.

Змястоўнай плануецца і работа творчых секцый. Тут і абмеркаванне аповесцяў, што апублікаваны летась часопісамі "Полымя" і "Маладосць", разгляд паэтычных зборнікаў, якія выйшлі ў "Бібліятэцы часопіса "Маладосць", і дыялог беларускіх і нямецкіх пісьменнікаў "Гісторыя і сучаснасць", і гаворка пра творы, што пабачылі свет у часопісах "Вясёлка", "Бярозка", "Першацвет".

Як вядома, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка выдзеліў Канфедэрацыі творчых саюзаў (у тым ліку і СП Беларусі) 500 мільёнаў рублёў. Саюз беларускіх пісьменнікаў, які афіцыйна ў канфедэрацыю не ўваходзіць, вырашыў кантактаваць з ёй адносна таго, як размеркаваць гэтыя сродкі.

КОЖНЫ ВЫРАШАЕ САМ...

У апошні дзень студзеня Мінскі Гёте-цэнтр наладзіў для групы журналістаў папярэдні прагляд і абмеркаванне праекта "Сервільнае мастацтва". У рамках гэтага праекта мінчукі змогуць азнаёміцца з трыма дакументальнымі фільмамі, створанымі ў ФРГ з 1990 па 1993 год, — гэта значыць, непасрэдна пасля ўз'яднання Германіі. Пасля таго, як знікла штучнае дзяленне Германіі на Усходнюю і Заходнюю, як сама гісторыя закрыла пытанне "немцы — адзіны народ альбо народ, які складаецца з дзвюх нацый?", немцы маюць магчымасць спакойна, так бы мовіць, па-сямейнаму паразважаць пра сваю нядаўнюю трагічную гісторыю.

Тры фільмы — гэта кінадакументальны трыпціх на тэму "мастацтва і ўлада". Гэта аповяд пра трох мастакоў — кінематаграфіста, кампазітара і скульптара, чыя творчасць непарыўна знітавана з тым часам, калі ў Германіі панаваў нацыянал-сацыялізм. Ці нават дакладней будзе сказаць, іх мастацтва ў свядомасці многіх людзей знітавана з нацыянал-сацыялізмам.

Кінарэжысёр Лені Рыфеншталь (фільм "Улада вобразаў: Лені Рыфеншталь"), кампазітар Норберт Шульцэ ("Той, хто цалаваў сатану ў азадак") і скульптар Арно Брэкер ("Эпоха багоў") працавалі на гітлераўскі рэжым. Яны, калі так можна сказаць, аздаблялі фасад будынка Трэцяга рэйха, будынка, у сутарэннях якога катавалі нявінных людзей. Якімі ж крытэрыямі ацэньваць іх жыццё і творчасць? Не будзем спяшацца выносіць прысуд — лепей азірнёмся на ўласную гісторыю... і без вялікіх намаганняў знойдзем у аналах "сацыялістычнага рэалізму" нашу, савецкую Рыфеншталь, савецкіх Брэкера і Шульцэ.

Падабенства — вельмі вялікае. Розніца ж — нязначная: у нас — серп з молатам, у іх — свастыка. Але і тут, і там — гігантаманія ў архітэктуры і манументальным мастацтве; і тут і там — экзальтаваны натоўп і цынічныя правадыры.

Між тым, зробленае названымі майстрамі цалкам адпавядае разуменню "мастацтва". Тут і высокі прафесіяналізм, і своеасаблівая эстэтыка, і разуменне псіхалогіі заказчыка і аўдыторыі, на якую разлічаны гэтыя творы. Яно, нарэшце, адлюстроўвае свой час і мае чыста дакументальную каштоўнасць.

...Праблему "мастак і ўлада" чалавецтва вырашае не адно тысячагоддзе. І, мабыць, ніколі не вырашыць. Кожны творца ва ўсе часы вырашае сам: быць яму сытым альбо мець чыстае сумленне.

П. ВАСІЛЕЎСКІ

P.S.

Фільмы будуць дэманстравацца ў кінатэатры "Піянер" (вул. Энгельса, 20). 8 лютага ў 18 гадзін — "Улада вобразаў: Лені Рыфеншталь". 9 лютага ў 18 гадзін — "Эпоха багоў". 10 лютага ў 15 гадзін — "Той, хто цалаваў сатану ў азадак".

Уваход свабодны.

ТАДЭВУШУ КАСЦЮШКУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

4 лютага а 12 гадзіне ў кінатэатры "Змена" г. Мінска адбудзецца кінасустрэча, прысвечаная 250-годдзю з дня нараджэння Тадэвуша Касцюшкі. Будуць дэманстравацца фільмы — дакументальны "Паланез для касінераў" і мастацкі "Паром" (паводле апавядання У. Караткевіча "Паром на бурнай рацэ").

У сустрэчы прымуць удзел аўтар сцэнарыя фільма "Паланез для касінераў", гісторык У. Емяльянчык, рэжысёр Р. Ясінскі, мастацкі кіраўнік студыі "Летапіс" У. Халіп, рэжысёр фільма "Паром" У. Бокун.

Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

Даведкі па тэлефоне: 35-30-13.

ЧАРЛЬЗ ДЗІКЕНС — ГОСЦЬ КУПАЛЫ

Напрыканцы мінулага года ў Мінску ў музеі Янкі Купалы адбылася выстаўка, прысвечаная жыццю і творчасці класіка англійскай літаратуры Чарльза Дзікенса. У экспазіцыі, дастаўленай з лонданскага дома-музея вялікага пісьменніка, былі прадстаўлены фотадакументы, ілюстрацыі да яго твораў, аўтарскія рукапісы і рэчы знакамітага англічаніна.

На цырымоніі адкрыцця выставы прысутнічалі — дырэктар музея Чарльза Дзікенса Дэвід Паркер, Пасол Вялікабрытаніі ў Рэспубліцы Беларусь Джон Эверард, аташэ па культуры Брытанскага савета Эндру Хаутон і міністр культуры і друку Рэспублікі Беларусь Анатоль Бутэвіч.

На здымках: дырэктару музея Чарльза Дзікенса Дэвіду Паркеру ўручаюць беларускія сувеніры; выстава прымае першых наведнікаў.

Фота Віктара ТАЛОЧКІ, БЕЛТА

Пошта

ІНВАЛІД У СЁННЯШНІМ СВЕЦЕ

Што і казаць, такая ўжо чалавечая натура — пакуль чалавек малады ды здаровы, яму здаецца, што такі ён будзе заўсёды. І мне, прызнацца, гэтак здавалася ў маладыя гады. Але, як кажуць, ад бяды ды хваробы не заракайся. Дзесяць гадоў назад проста за рэдакцыйным сталом я атрымаў цяжкі ішэмічны інсульт і стаў пажыццёвым інвалідам 2-й групы. Але і сёння не магу ў гэта паверыць, хоць і засталіся паралізаванымі левая рука, нага і шчака. Пашанцавала яшчэ, што застаўся здольным да разумовай працы.

Мая нататка пра тое, як адчуває сябе інвалід у сённяшнім свеце. Скажу адназначна — адчуває сябе кепска. І матэрыяльна, і маральна. Ад усведамлення таго, што адчуває сябе лішнім, нікому не патрэбным чалавекам.

З пачуццём крыўды чытаю пра тое, якім клопатам і павагай акружаны інваліды ў тых жа капіталістычных краінах, дзе, як нам унушалі дзесяцігоддзямі, "чалавек чалавеку воўк". І вось гэтыя "ваўкі" пераабсталявалі грамадскі транспарт такім чынам, каб чалавек на мыліцах ці ў інваліднай калясцы мог лёгка траліць у тыя ж аўтобус ці метро. Нават ліфты ў многіх дамах прыстасаваны спецыяльна для інвалідаў. Я не кажу ўжо пра розныя льготы, якімі карыстаюцца інваліды ды пенсіянеры.

Дарэчы, пра льготы. Дасюль у грамадстве не заціхае хваляванне, выкліканае ўказамі прэзідэнта А. Лукашэнкі аб пазбаўленні большасці пажылых людзей розных ільгот. "Власть-предержащие" тлумачаць гэта тым, што Беларусь ператварылася ў краіну льготнікаў і што дзяржаўная казна не можа вытрымаць такой нагрузкі. Так, у нас сапраўды шмат хворых людзей, шмат інвалідаў, ды хіба яны ў гэтым вінаватыя, хіба можна забываць, ува што абышліся народу Беларусі апошняя крова-пралітная вайна і той жа Чарнобыль, які не дадаў здароўя людзям?

На словах наш прэзідэнт быццам і спачувае інвалідам і старым людзям-пенсіянерам. Але мне падаецца, што спачуванне гэтае, так бы мовіць, не арганічнае, а таму і не вельмі шчырае. Аляксандру Рыгоравічу ўсяго толькі 41 год і, мабыць, яму здаецца, што пенсійны ўзрост — гэта так далёка. Зусім не далёка! Як кажуць, і агледзецца не паспееш, а — "зима катит в глаза".

Але будзем справядлівымі — сёе-тое ўсё-такі ў нас для інвалідаў робіцца. Гэта не толькі бясплатны праезд у гарадскім транспарце для інвалідаў вайны і працы 1-й і 2-й груп (вось толькі з прыгараднай электрычкай справа чамусьці затармазілася, так і няма той аб'яўленай льготы); гэта не толькі скідка пры аплаце за лекі ў аптэках і яшчэ тое-сёе. Немалую дапамогу інвалідам з парушаным апорна-рухальным апаратам аказвае і нова-пабудаваны Беларускі пратэзна-артапедычны цэнтр з навейшым абсталяваннем, са шпіталем для інвалідаў перш за ўсё вайны.

Але ўсё роўна праблем хапае. Возьмем маральны бок справы. Да дакументаў, паводле якіх прадастаўляюцца льготы інвалідам вайны, ніякіх пытанняў няма. Але ж ёсць яшчэ і інваліды працы. І тут пры вызначэнні інваліднасці так званымі камісіямі ПЭК (працоўнай экспертызы) дапускаецца вялікая блытаніна. Чамусьці прычыну інваліднасці многім запісваюць так — "ад агульнага захворвання". Пры гэтым маецца на ўвазе і тыя, каго няшчасце напаткала за станком, у шахце, за рабочым (у тым ліку рэдакцыйным) сталом, у навуковай лабараторыі і г. д. І ўсё гэта ніякія не "агульныя", а "вострыя" захворванні. У падобных выпадках менавіта так члены ПЭК павінны запісваць у дакументах аб інваліднасці. А калі захворванне здарылася ў час работы, то менавіта так і кваліфікаваць: "інвалід працы".

Пра ўсё гэта не раз пісалі інваліды ў Міністэрства аховы здароўя і сацыяльнай абароны, але, відаць, маральны бок жыцця інвалідаў не турбуе кіраўнікоў гэтых ведамстваў.

Або ўзяць так званае льготнае забеспячэнне інвалідаў прамысловымі і харчовымі таварамі. У свой час Мінскі гарсавет прыняў пастанову, паводле якой інваліды былі ўзяты на ўлік і замацаваны за пэўнымі гандлёвымі прадпрыемствамі. Адным з іх аказаўся сталічны ГУМ. Час ад часу адміністрацыя ГУМа пазванывала дадому інвалідам, паведамляючы, што менавіта можна ў іх набыць, напрыклад, тую ж бялізну. Што і казаць, патрэбная рэч. Але ж варта даведацца аб яе цане, як адразу знікае жаданне ехаць у той магазін. Ніякай пенсіі тут не хопіць.

Тое ж самае адбываецца і з набыццём харчовых тавараў у гастраномах, да якіх прымацаваныя інваліды. Напрыклад, ва універсама "Талін" адкрылі ў кафетэрыі так званы стол заказаў. Нярэдка чарга ў гэты "заказны стол" заканчваецца на вуліцы, і можна ўявіць сабе, чаго гэта каштуе інвалідам зімой. Але галоўны нонсенс у іншым: нярэдка ў агульнай гандлёвай зале для пакупнікоў выстаўлены тыя ж самыя прадукты, што і ў стале заказаў, а часам іх там нават і больш. Аднак і гэта не ўсё: цэны ў сталах заказаў на прадукты для інвалідаў такія ж самыя, як і ва ўсіх звычайных магазінах.

Вось і кажуць з абурэннем інваліды: "Якія ж гэта клопаты пра нас? Гэта ж проста здзек з інвалідаў!" Інваліду, бывае, у самае кепскае надвор'е трэба дабірацца ў транспарце да свайго "льготнага" стала заказаў, каб купіць там дарагія прадукты і цягнуць іх дадому, хоць у магазіне побач з домам ёсць тое самае, ды па той самай цане. Няўжо ўлады не маглі зрабіць нейкую скідку ў цэнах на прамысловыя і асабліва на прадуктовыя тавары для гэтай гаротнай часткі нашага грамадства.

Пытанні не простыя, але яны — крык душы абяздоленых людзей. Калі грамадства прэтэндуе на тое, каб лічыцца цывілізаваным, яно не можа не прыслухацца да гэтага крыку.

Якаў ЛІФАНАЎ,
інвалід працы, член Саюза журналістаў

ПАНУЕ ЯГО ВЯЛІКАСЦЬ ФАКТ

Біябібліяграфічны слоўнік "Беларускія пісьменнікі", шосты, заключны том якога перад Новым годам выйшаў у выдавецтве "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, несумненна, вядомы многім. Найперш тым, хто не проста цікавіцца літаратурай, а хоча ведаць больш пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, а таксама пра тое, у якіх выданнях яны друкаваліся, якія публікацыі пра іх з'явіліся ў розны час. Усё гэта ў даведніку ёсць. Інфармацыя, можна сказаць, вычарпальная. А галоўнае — біяграфічныя і біябібліяграфічныя звесткі тычацца ажно 1500 літаратараў. Прытым тых, якія не толькі жывуць (ці жылі) на Беларусі, але і за яе межамі.

Выхад кожнага тома станавіўся з'явай у культурным жыцці рэспублікі. Тым больш з'ява — выхад апошняга тома. Гэта сталася добрай падставай для таго, каб сабрацца разам, пагаварыць аб зробленым-здзейсненым.

Прэзентацыя даведніка "Беларускія пісьменнікі" праходзіла ў Доме літаратара. Аўдыторыя сабралася прадстаўнічая — навукоўцы, выдаўцы, пісьменнікі, журналісты.

Пачатак гаворкі паклаў выконваючы абавязкі галоўнага рэдактара выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" імя П. Броўкі Я. Малашэвіч. І адразу яна выйшла за межы канкрэтнай падзеі. І на тое былі прычыны. Колькі б мы ні гаварылі пра цяжкасці ў кнігавыданні (а яны вельмі адчуваюцца), тым не менш робіцца ўсё магчымае (а часам і немагчымае), каб патрэбныя кнігі своечасова прыходзілі і да чытача. Нідзе, сказаў Я. Малашэвіч, няма такой падтрымкі кнігавыдання з боку дзяржавы, як у нашай. Гэта асабліва тычыцца выпуску энцыклапедый, рознага віду энцыклапедычных даведнікаў.

Шасцітомнік "Беларускія пісьменнікі" выйшаў параўнальна хутка — першы том яго з'явіўся ў 1992 годзе. А перад гэтым была вялікая і карпатлівая работа па зборы матэрыялаў, ля вытокаў якой стаяў цяперашні дырэктар Скарынаўскага цэнтра А. Мальдзіс.

Адам Іосіфавіч у час свайго выступлення зазначыў, што выхад даведніка — свята ў беларускай літаратуры, культуры і ўвогуле ў грамадскім жыцці. Падобныя выданні з'яўляюцца раз у стагоддзі. Знаходзіліся скептыкі і ў нас, якія меркавалі, што наўрад ці можна падобны аб'ём работы асіліць. Тым не менш упэўненасць і аптымізм перамаглі. У выніку з'явілася унікальнае выданне, пра якое А. Мальдзіс сказаў дакладна і ёмка: "Гэта не пантэон для заслужаных, а даведнік, дзе пануе яго вялікасць факт".

Наконт фактычнай насычанасці. Вядома, могуць быць і недакладнасці, але іх, як слушна зазначалі выступоўцы, куды менш, чым магло быць у выданнях падобнага тыпу. А гэта — яшчэ адно сведчанне добрасумленнасці тых, хто стаяў ля вытокаў выдання.

Пра вартасці даведніка гаварылі дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларусі В. Каваленка, колішні галоўны рэдактар "Беларускай энцыклапедыі" народны пісьменнік Беларусі І. Шамякін, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў В. Зуёнак, намеснік міністра культуры і друку Рэспублікі Беларусь С. Нічыпаровіч, народны паэт Беларусі Н. Гілевіч, удзельніца рэалізацыі праекта па выпуску "Беларускіх пісьменнікаў" Л. Гарэлік.

Н. К.

Фелікс ШКІРМАНКОЎ

НЕ СОН

Можа, гэта прыснілася мне?
Але ж не, раптам сціснула скроні,
І з дакорам глядзіць на мяне
Вершнік толькі ўваскрэсшай Пагоні.

Не, не сон гэта — праўда, на жаль,
Зноў гвалтуюцца годнасць, свабода,
І спраўляюць манкурты свой баль,
"Паважаючы волю народа".

Волю тых, хто мільёны крадзе,
Хто уладу трымае ў кішэні,
Хто тлусцее на нашай бядзе,
Каму людзі, прабачце, да фені.

Што ж зрабілі вы, людцы мае,
На чый голасны кліч падаліся?
Адракліся ад мовы свае,
Ад сваіх каранёў адракліся!

Што яшчэ трэба з вамі зрабіць,
Як зняважыць, каб вы зразумелі:
Як жылі — абы толькі каб жыць,
Згодзен той,
хто ў бясконцым пахмеллі...

●

Калі святыні нехта абражае,
На бел-чырвона-белы сцяг плюе,
Мяне варожасць гэта не кранае:
То дзікуны паказваюць сябе.

Але калі такое робяць людзі
З вышэйшаю уладай у руках,
Мне сорамна, і боль сціскае грудзі,
І ад абразы слёзы на вачах.

І я адно прашу, малю у Бога,
Каб дапамог ён людзям зразумець,
Што ёсць у нас адзіная дарога,
Свой шлях, які не дасць і нам згібець.

г. Слаўгарад

Мітрэнгі

Тое, што прыватызацыя — адзін са сродкаў вываду эканомікі з глыбокага крызісу, сёння даказваць нікому не трэба. Відавочна, што прадпрыемствам павінны кіраваць прадпрымальныя, разумныя, ініцыятыўныя людзі, сапраўдныя гаспадары. Дзяржава аказалася кепскім гаспадаром і кепскім прадпрымальнікам: стаяць заводы, фабрыкі, людзі не атрымліваюць зарплату, трашчыць па ўсіх швах бюджэт.

Відавочна і тое, што дарогі назад, у сацыялізм, няма, трэба ісці наперад, да рынкавай эканомікі, як ва ўсім цывілізаваным свеце. Да яе можна прыйсці толькі праз раздзяржаўленне прадпрыемстваў, праз магчымасць грамадства ў асобе акцыянераў уплываць на іх дзейнасць. Грамадзяне Беларусі атрымалі такі шанц. Імянныя прыватызацыйныя чэкі "Маёмасць" забяспечваюць нам права ўдзельнічаць у працэсе прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці. Пяцьдзесят працэнтаў яе прадаецца на чэкі, права на атрыманне якіх маюць грамадзяне Беларусі, што пастаянна жылі на яе тэрыторыі на момант увядзення ў дзеянне закона "Аб імянных прыватызацыйных чэках" (ліпень 1993 года).

Чэкі паспелі атрымаць многія — пераважная большасць грамадзян краіны. Што з імі рабіць? Як імі распарадзіцца? Што новага ў падпісанай Прэзідэнтам Праграме раздзяржаўлення і прыватызацыі на 1996 год? Пра гэта — гутарка нашага карэспандэнта з начальнікам Упраўлення чэкавай прыватызацыі Міндзяржамаёмасці Зінаідай ШАЎЧЭНКАЙ.

ЦЯГНІК СКРАНУЎСЯ...

— Зінаіда Сямёнаўна, у чым сутнасць падпісанай Прэзідэнтам праграмы прыватызацыі на сёлетні год?

— Ужо сам факт падпісання такой праграмы дае падставу для аптымізму — хоць бы па той прычыне, што раней яе ўвогуле не было. Але перш-наперш хочацца нагадаць грамадзянам, што прыём заяў аб налічэнні імянных прыватызацыйных чэкаў "Маёмасць" будзе ажыццяўляцца толькі да 30 красавіка гэтага года, а выдачу сертыфікатаў ІПЧ "Маёмасць" аддзяленні АСБ "Беларусбанка" павінны завяршыць да 1 ліпеня. Таму ўсім, хто хоча прыняць удзел у прыватызацыі, трэба паспяшацца. А што да праграмы, дык канкрэтных лічбаў у ёй няма. Спецыялісты прыйшлі да высновы, што камандна-адміністрацыйны шлях у справе прыватызацыі неразумны. Праграма дазваляе актыўна прыцягнуць інвестыцыі ўжо на першапачатковай стадыі пераўтварэння дзяржаўных прадпрыемстваў у акцыянерныя таварыствы. Больш за тое, пры куплі акцый членамі працоўных калектываў палова выручаных сродкаў можа на працягу трох гадоў заставацца ў распараджэнні прадпрыемства і выкрыстоўвацца ў якасці своеасаблівага крэдыту, а ў бюджэт пералічваецца толькі пасля сканчэння гэтага тэрміну. Штучна падштурхоўваць калектывы да прыватызацыі ніхто не будзе, такая неабходнасць павінна выспець у іх саміх.

— Тым, хто працуе на прадпрыемстве, якое рыхтуецца прыватызавацца, працей. А што з інвестфондамі, якія гэтак актыўна запрашалі нас несці да іх нашы чэкі? Маўляў, без адпаведнай эканамічнай падрыхтоўкі грамадзянін не зможа зарыентавацца ў выбары адпаведнага прадпрыемства, а ў інвестфондах працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты, яны ўкладуць нашы чэкі з найбольшай выгадай для нас...

— Як ні сумна, але ўсе інвестфонды ў нас, шчыра кажучы, у безнадзейным стане. І не таму, што там сабраліся прайдзісветы. У большасці гэта нармальныя, кваліфікаваныя людзі, якія жадаюць атрымаць прыбытак не толькі для сябе, але і для акцыянераў. Але ў сувязі з тым, што ў нас вельмі марудныя тэмпы прыватызацыі, а інвестфонды законам і нарматыўнымі дакументамі пастаўлены ў адзін шэраг з іншымі фінансавымі структурамі, якія маюць права купляць і распараджацца чэкамі, яны не змаглі як след разгарнуцца, наладзіць сваю працу, нават тыя, што прыцягнулі акцыянераў і сабралі чэкі. Яны не здолелі гэтыя чэкі "ператварыць" у акцыі прадпрыемстваў, бо акцый тых мала, а калі яны і прадаюцца на аўкцыёнах, дык вельмі па высокіх цэнах, і таму гэтыя ўкладанні малаэфектыўныя для акцыянераў.

— Значную шкоду інвестфондам, кажуць, прынесла і прыпыненне іх дзейнасці?

— Безумоўна. Неабгрунтаванае, скажам так, распараджэнне аб прыпыненні іх дзейнасці адкінула іх на паўгода назад, падштурхнула да бездані, над якой яны сёння стаяць, і калі яшчэ адзін такі крок, дык яны апынуцца на дне, адкуль ніколі не змогуць выкараскацца.

На сёння інвестфонды сабралі недзе 17 мільёнаў чэкаў, а размясцілі — менш за мільён. А гэта азначае, што яны не працуюць, не прыносяць прыбытку ні грамадзяніну, які абмяняў свае чэкі на акцыі, ні дырэктару ці праўленню фонду.

— Значыць, спадзявацца нам, уладальнікам чэкаў, якія мы перадалі інвестфондам — сваім пасрэднікам, на нейкі прыбытак, на жаданыя дывідэнды няма падстаў?

— Баюся, што няма. Пры ўсім жаданні інвестфонды сёння не могуць забяспечыць прыбытку сваім акцыянерам, і цяжка сказаць, ці змогуць яго забяспечыць заўтра альбо праз нейкі час. Іхнія магчымасці абмежаваныя, бо абмежаваныя ўмовы іх удзелу ў прыватызацыі. І яшчэ адно. Калі аддавалі свае чэкі ў інвестфонд, вы пры гэтым заключылі з ім дагавор, згадзіліся на ўмовы, якія агавораны ў статуце, у выніку вашы чэкі — гэта ўжо не ваша ўласнасць, а ўласнасць фонду. І толькі сход акцыянераў можа вызначыць, якую частку чыстага прыбытку атрымаеце вы, а якую частку аддаць на развіццё фонду, забеспячэнне яго дзейнасці, аплату падаткаў, на ўтрыманне ягонага штату, офісаў, на рэкламу і г. д.

— Сумна ўсё гэта чуць. Аказваецца, не трэба было спяшацца. Трэба было чакаць і трымаць у сябе чэкі. І ўсё ж — што рабіць тым дзесяткам тысяч чалавек, якія паверылі, скажам, Першаму інвестфонду і аддалі яму свае чэкі?

— Першы інвестфонд, мне думаецца, незаслужана заблакіравалі. Не было такой неабходнасці, нават калі ў кіраўніцтва фонду і былі нейкія парушэнні. Калі на нейкім заводзе, скажам, дырэктар дапускае парушэнні, завод жа не зачыняюць, выпуск прадукцыі не спыняюць. Дырэктара могуць звольніць, аддаць пад суд, але ж завод — працуе. А з "Першым" паступілі па-іншаму: узялі і адабралі ў яго ліцэнзіі, забаранілі яму працаваць з чэкамі, удзельнічаць у рынку каштоўных папер. Каб заняцца нечым іншым, яму трэба рэарганізоўвацца ў нейкую новую структуру. У дачыненні да ўсіх фондаў несправядліва было спыняць іхнюю работу на паўгода, а для Першага гэта абярнулася трагедыяй, бо сёння з гэтага піке ён наўрад ці выйдзе. Каб выйсці, ён павінен ліквідаваць дапушчаныя парушэнні, а зрабіць гэта не можа, бо ліцэнзіі не ўзноўлены, рахункі і дакументы арыштаваны. І вось ходзім у выніку па замкнёным крузе і не можам знайсці прававы калідор, каб выйсці з яго. Там кіраўніцтва ўжо цалкам звольнілася, самаўхілілася праўленне, нават заснавальнікі, якія ўклалі туды велізарныя сродкі, лічаць іх назаўсёды страчанымі і не спадзяюцца іх вярнуць. Удар гэты мы вымушаны былі прыняць на сябе. Людзі ідуць да нас, пішуць скаргі ў адміністрацыю Прэзідэнта, у пракуратуру, у Кабінет Міністраў, але — усе лісты сцякаюцца ў наша ўпраўленне. Першы інвестфонд, па ўсім відаць, ужо не паявіцца на рынку, а мы прымаем меры, каб вярнуць шараговым акцыянерам іхнія чэкі. Гэта будзе не раней, чым у канцы лютага. І таму яшчэ раз хачу супакоіць усіх укладчыкаў Першага інвестфонду: усе чэкі вернуцца на вашы рахункі, падманутымі сябе вы не лічыце.

— Што ж, як кажуць, хто паспяшыў, сам сябе насмяшыў. Пра інвестфонды — памаўчым. Дык, можа, лепш свае чэкі прадаць? Намінал яго сёння складае 35 тысяч рублёў. Мае чалавек, скажам, сто чэкаў. Перамнажаем — тры з паловай мільёны рублёў. Няшмат, вядома, але ўсё ж грошы. Лепш мець сініцу ў руцэ, чым жураўля ў небе — ці не так?

— Так і не так. На чэкавым рынку кошт чэка застаецца вельмі нізкім. Ніхто яго за 35 тысяч рублёў не купіць. Ніхто і паловы гэтай сумы не дасць. 1000—1200 рублёў — вось сённяшняя цана чэка. Калі ж гаворка ідзе аб продажы пакетаў прыватызацыйных чэкаў, тады цана крыху большая — ад 2100 да 4500 рублёў. Зазначу, што пакет — гэта не менш чым тысяча чэкаў. Зрэшты, жыццё не стаіць на месцы, і можа стацца так, што кошт чэка пойдзе ўгару.

— Намінал аднаго чэка на момант прыняцця закона аб прыватызацыі складаў 25 тысяч рублёў, пасля дэнамінацыі — 2500, пасля 30 кастрычніка мінулага года — 35 тысяч рублёў. Выходзіць, наогул не трэба было спяшацца іх атрымліваць?

— Чэкі не абясцэньваюцца, яны, наадварот, растуць у цане. Усе чэкі праіндэксаваны — і тыя, што сабраны ў інвестфондах, і тыя, якія знаходзяцца на спецыяльных рахунках іх уладальнікаў, незалежна ад часу іх налічэння. Сёлета таксама чакаецца індэксацыя. Але трэба ведаць, што індэксацыя чэка не азначае, што ён прыносіць нейкую прыбавачную вартасць. Індэксацыя гаворыць толькі пра тое, што на гэты чэк прыходзіцца вось столькі дзяржаўнай маёмасці; гэта той самы аб'ём дзяржаўнай маёмасці, які падрос, павялічыўся ў цане за год. Карацей кажучы, гаворка ідзе пра рост кошту чэка з улікам інфляцыі.

— Значыць, можна падбіваць бабкі: з інвестфондамі мы прагарэлі і прадаваць чэкі не выгадна. Дык — куды іх дзець? Што з імі рабіць?

— Лепш за ўсё купіць за чэкі акцыі прыватызаваных прадпрыемстваў, якія прадаюцца ва ўсіх аддзяленнях ашчаднага банка. Прыватызацыя ідзе шляхам стварэння адкрытых акцыянерных таварыстваў, і ўсе акцыі выстаўляюцца на продаж. Вядома, прыярытэтнае права тут аддаецца працоўнаму калектыву, аднак жа астатнія акцыі свабодна прадаюцца насельніцтву.

— А лімітнае размеркаванне акцый у залежнасці ад наяўнасці прыватызуемых аб'ектаў на дадзенай тэрыторыі? Яно хіба спрыяе прыватызацыі? І з чым яно звязана, Зінаіда Сямёнаўна?

— Найперш з тэхнічнай базай, працэсу прыватызацыі, з яе недасканаласцю і недастатковасцю. У нас няма замкнёнай камп'ютэрнай сеткі, адсутнасць яе і спараджае гэтае лімітаванне.

І яшчэ. Калі пакет акцый да ста тысяч чэкаў, яго выстаўляем у адным раёне па месцазнаходжанні ашчадбанка, таму жыхары іншых раёнаў ужо не маюць магчымасці набыць іх. Калі ж пакет акцый ад ста да пяцісот тысяч чэкаў, мы раздаём яго па аддзяленнях банка вобласці. А калі ён звыш пяцісот тысяч, тады ўжо размяркоўваем па ўсёй рэспубліцы.

Само сабою, форму продажу акцый трэба ўдасканальваць, і мы працуем над гэтым.

— А што вы можаце параіць нам, уладальнікам чэкаў, каб не памыліцца з выбарам?

— Сёння ёсць у продажы акцыі шматлікіх прадпрыемстваў, але даць канкрэтную параду, якія акцыі набываць, а ад набыцця якіх устрымацца, я не магу. Будаваць дыяграму змен попыту, прапаноў, цаны можна тады, калі ёсць у наяўнасці нерухомая сістэма каардынат, — як будаваць любы графік. У нашым жа выпадку такой сістэмы няма, ёсць толькі "х" і "у", а сама сістэма плавае. Мы не ведаем, што будзе з вытворчасцю заўтра, хто выжыве, а хто — не, сёння столькі трэба плаціць за газ, электраэнергію, заўтра — невядома колькі, і можа здарыцца такое, што сёння прадпрыемства стратнае, а заўтра яно акрыяе, стане на ногі, і наадварот...

Ёсць сёння, скажам, у продажы акцыі аб'яднання "Керамін", гэта былое аб'яднанне "Будматэрыялы". На будаўнічыя матэрыялы, трэба думаць, попыт будзе заўсёды. Напрыклад, на тую ж аблiцовачную плітку заказчыкаў і сёння хапае — і дзяржаўных, і так званых камерцыйных, і прыватных.

Інакш кажучы, для любога прадпрыемства патрэбны такія складнікі, як устойлівы рынак збыту сваёй прадукцыі, наяўнасць даступнай сыравіны і, нарэшце, ступень зношанасці асноўных сродкаў вытворчасці. Пэўныя дадзеныя пра гэта можна знайсці ў праспекце эмісіі акцый, якія ёсць у кожным аддзяленні ашчадбанка. Там можна даведацца, што гэта за прадпрыемства, якая яго прадукцыя, куды яна ідзе, які на яе попыт. Калі каго цікавіць больш поўная інфармацыя, можна звярнуцца непасрэдна ў само акцыянернае таварыства, урэшце — звярнуцца па дапамогу да спецыяліста. Нават калі вы ў нечым і памыліцеся, усё роўна вашы чэкі не будуць страчаны, гаворка можа тут ісці толькі пра больш ці менш выгаднае іх размяшчэнне.

— Чэкі, акцыі, сертыфікаты — усё гэта яшчэ досыць нязвычна для нашых людзей. Вось, напрыклад, такое пытанне: якое права дае акцыя яе трымальніку?

— Акцыя дае права на ўдзел у кіраванні прадпрыемствам і права фінансавае, права на атрыманне даходаў, тых самых дывідэндаў. Нашы людзі, думаецца, менш за ўсё цікавяцца першым правам — правам на ўдзел у кіраванні, ніхто з іх, бадай, і не збіраецца купляць акцыі дастаткова буйным пакетам, каб сапраўды ўдзельнічаць у кіраванні. Для гэтага трэба мець як як мінімум 5 працэнтаў акцый. Людзей цікавяць найперш даходы па акцыях. Што на гэта сказаць? Калі прадпрыемства прыбытковае, дык тады ёсць спадзеў і на дывідэнды — яны выплачваюцца менавіта з прыбытку. Само сабою, не ўвесь прыбытак прадпрыемства ідзе на выплаты дывідэндаў, бо інакш прадпрыемства працавала б на самаз'яданне. Большая частка прыбыткаў звычайна ідзе на развіццё вытворчасці, і гэтым найперш павышаецца фінансавая вага акцыі. Залежнасць прамая тут: развіваецца вытворчасць — павялічваецца вартасць, вага акцыі. Намінальны кошт акцыі, дарэчы, ні аб чым не гаворыць, ці прынамсі, мала аб чым. Ён вызначае долю ў статутным фондзе на момант стварэння акцыянернага таварыства. Далей жа гэтая доля расце разам з ростам вытворчасці і абсалютна не адпавядае свайму фактычнаму кошту.

— І апошняе пытанне, Зінаіда Сямёнаўна. Нават хутчэй не пытанне, а — выснова, якая напрошваецца з нашай гутаркі: пакуль што спадзявацца на вялікія дывідэнды не даводзіцца...

— Скажу адназначна: велічыня ці памер дывідэндаў у нас не можа быць пастаяннай і адзінай крыніцай даходаў ніводнаму грамадзяніну. Трэба мець пакет Ракфелера, каб на тое спадзявацца. Тым не менш... Увесь свет на рынку каштоўных папер карыстаецца акцыямі. Чэкі будуць у абарачэнні да 1 ліпеня 1999 года. Да гэтага часу плануецца завяршыць рэфармаванне большасці аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці, якія падлягаюць прыватызацыі. А вось акцыі — гэта пажыццёва. Іх можна падараваць, перадаць па спадчыне. Сёння пакуль што свабодна прадаць іх цяжка, трэба шукаць пакупніка, бо рынак каштоўных папер у нас практычна адсутнічае, закладваюцца толькі ягоныя пачаткі. Ёсць усё ж падставы спадзявацца на тое, што праз нейкі час, праз год, другі, трэці, і ў нас усё зменіцца ў лепшы бок, будзе стымул для руху і развіцця, і тады акцыі стануць неад'емнай яваю нашага жыцця, яваю звычнай, шырокараспаўсюджанай. Настане час, як і ў іншых краінах, што прайшлі падобны шлях развіцця, калі кожны з нас зможа пайсці, скажам, у фондавы магазін і прадаць свае акцыі пад час, калі нам вельмі спатрэбіліся грошы...

Адно магу сказаць на завяршэнне: акцыі прыватызаваных прадпрыемстваў — справа надзейная, бяспройгрышная.

Гутарыла Марыя ГІЛЕВІЧ

"АД РОДНЫХ НІЎ..."



Такі назоў атрымала вечарына, што адбылася 16 студзеня ў "Беларускай хатцы". Тут прайшла прэзентацыя факсімільнай кнігі Ларысы Геніюш, якая ўпершыню ўбачыла свет у 1942 годзе пад небам чэшскай Прагі. Арганізавала і правяла вечарыну няўтомная руплівіца беларускага культурнага адраджэння спадарыня Ала Ходан.

Пасля яе ўзяў слова адзін з ініцыятараў перавыдання вершаў нашай слыннай паэткі-эмігранткі паэт Міхась Скобла. Ён распавёў слухачам пра нялёгкі шлях названай кнігі (а выхад яе ажыццявіўся за кошт недзяржаўных сродкаў) да сваіх удзячных і цярплівых чытачоў. Гучалі вершы Л. Геніюш, якія чытала яна сама (запіс на магнітную стужку).

Голас паэткі ўразіў усіх сваёй цеплынёй і маладосцю, менавіта тымі рысамі, якімі надзелена ўся яе творчасць.

А. КУЛІН

Выступае М. Скобла.

Фота С. ЛОЙКІ

САМА ПІША, САМА АФАРМЛЯЕ

Вольга Угрыновіч, нягледзячы на яшчэ зусім малады ўзрост, у асяроддзі мастакоў чалавек вядомы. Нарадзілася, гадавалася ў сям'і знакамітых мастакоў Угрыновічаў, дм і на аддзяленні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускай акадэміі мастацтва вучылася паспяхова. Яе дыпломная работа, абароненая летась, прыцягнула ўвагу адмысловым спалучэннем керамікі, шкла, металу...

А да ўсяго Вольга — паэтэса. Першыя яе вершы бацькі занатавалі яшчэ тады, калі дзяўчынцы споўнілася ўсяго чатыры гады. Калі ж падрасла, друкавалася ў часопісе "Бярозка", пазней — у часопісах "Зрок", "Першацвет", "Маладосць".

І вось — першая кніга В. Угрыновіч "Сусвет на далоні", што з'явілася ў "Бібліятэцы часопіса "Маладосць". Прытым — у аўтарскім афармленні. У анатацыі да кнігі пра вершы паэтэсы сказана, што гэта "спроба асэнсаваць сябе ў навакольным свеце, вызначыць вытокі і памкненні, размежаваць сон і яву, мінуўшчыну і прышласць. Знайсці раўнавагу паміж парадаксальнымі з'явамі, заваладаць Ключом разгадкі Спрадвечных Таямніц і бясконцых пытанняў вызначэння Свайго Быцця".

ЛЮТАЎСКАЯ АФІША ДОМА ЛІТАРАТАРА

"Першы беларус у Краіне Узыходзячага Сонца" — так называецца вечарына памяці вучонага-філолага, падарожніка і дыпламата Восіпа Гашкевіча, запланаваная на 8 лютага.

А вось 90-годдзе з дня нараджэння вядомага гісторыка Мікалая Улашчыка будзе адзначацца 14 лютага.

Аўтарская вечарына Ніла Гілевіча "Мой белы дзень" збірае прыхільнікаў таленту народнага паэта Беларусі 22 лютага.

27 лютага пройдзе прэм'ера дакументальнага фільма рэжысёра Сяргея Лук'янчыкава па сцэнарыі Рыгора Барадуліна "Акафіст Уладзіміру".

Сябры Полацка-Глыбоцкай літаратурнай філіі Саюза беларускіх пісьменнікаў запрашаюць усіх жадаючых 29 лютага на сваю вечарыну "Галасы Прыдзвіння".

Не забудзьце: згаданыя мерапрыемствы пачынаюцца ў 18 гадзін 30 хвілін.

27 лютага ў 15 гадзін збіраецца секцыя прозы, секцыя ж літаратуры для дзяцей і юнацтва — у гэты ж час, але 28 лютага.

З ПОШТЫ АДДЗЕЛА КРЫТЫКІ

УНІВЕРСАЛЬНАЯ... З ПАМЫЛКАМІ

Калі ўпершыню бярэш у рукі гэтую кнігу ў яркай бліскучай вокладцы, сэрца напаўняецца радасцю: вось яшчэ адна кніга па геаграфіі — і такая на выгляд прыгожая, і такая аб'ёмная; гэта ж шчасце, што, нягледзячы на цяжкасці ў эканоміцы, кнігі працягваюць выдавацца...

Але пасля больш блізкага знаёмства з энцыклапедыяй пачуццё радасці хутка змяняецца на пачуццё разгубленасці, а потым і абурэння. На вокладцы ж напісана: "Энцыклапедыя", ды яшчэ "універсальная", але ж гэта, прабачце, зусім не тое... Энцыклапедыя — гэта навуковае і даведачнае выданне, якое дае сістэматычныя па алфавіце, па тэмах веды (універсальная), або сукупнасць звестак у адной якой-небудзь галіне ведаў (спецыяльная). Артыкулы ж разглядаемай энцыклапедыі размешчаны бессістэмна. Гэтую кнігу нельга назваць і хрэстаматыяй, бо хрэстаматыя — гэта зборнік урыўкаў лепшых твораў пісьменнікаў або ўзораў навуковых сачыненняў, якія прызначаюцца для вучэбных мэт. Нельга назваць выданне і кнігай для чытання, у ёй столькі памылак, што вучні толькі заблытаюцца, дзе правільна напісана — у школьным падручніку ці ў гэтай энцыклапедыі.

Незразумела, чаму А. Варатнікоў лічыцца складальнікам, а не аўтарам выдання, бо ні пад адным з артыкулаў не падпісана крыніца, адкуль браўся матэрыял, тым больш, што з першых старонак чытач папярэджваецца наконт строгага захоўвання пры карыстанні энцыклапедыяй аўтарскага права.

Прааналізуем першую геаграфічную частку так званай энцыклапедыі. У ёй больш за 100 артыкулаў, але ўсе яны размешчаны "абыякава". Напрыклад, спачатку ідуць артыкулы "Адкуль да нас прыйшла геаграфія", "Форма Зямлі і яе паверхня", "Рэльеф зямной паверхні", "Як даведаліся, што было на Зямлі да чалавека", а потым артыкулы з апісаннем прыродных зон, гор, акіянаў... Немагчыма зразумець логіку і ў будове саміх артыкулаў, і ў падборы матэрыялу для іх.

Дадзеная энцыклапедыя — гэта энцыклапедыя памылак, недарэчнасцей, нават ляпсусаў. На с. 5 складальнік піша, што сёння "каждый человек знает, что такое география и чем она занимается"... Але тое, што ведаюць школьнікі, відаць, не ведае складальнік. Бо геаграфія ў яго ўяўленні — адна фізічная геаграфія, ён не ведае, што яшчэ існуе сацыяльна-эканамічная (а раз не ваде, то няма ў "энцыклапедыі" і адпаведных артыкулаў).

Калі разглядаць фізіка-геаграфічныя артыкулы, то з іх няма чаго ўзяць, бо ў асноўным гэта звычайная кампіляцыя артыкулаў раней выдадзеных падручнікаў, дапаможнікаў і г. д. Тут вы не знойдзеце артыкулаў і матэрыялаў пра карысныя выкапні, пра глебы, пра мацерыкі, прыроду асобных дзяржаў свету. Анічога няма пра каналы, пра балоты, пра эндэмічныя і рэліктавыя віды раслін і жывёл, пралівы, залівы, астравы... Замоўчваецца гісторыя адкрыцця рускімі мараходамі Антарктыды, уклад рускіх і беларускіх даследчыкаў у вывучэнне Зямлі. Складальнік не мае ўяўлення пра біясферу, пра вучэнне аб наасферы і пра многае іншае.

Акрамя таго, што складальнік "Геаграфіі..." не ведае геаграфіі, дык яго пазнанні ў іншых навуковых галінах на ўзроўні XVIII — пачатку XIX ст. Напрыклад, чаго вартае сцвярджэнне, што "коралл — это отвердевшее морское растение" (с. 239).

Хібы, недакладнасці, памылкі сустракаюцца літаральна на кожнай старонцы. Складальнік увесь час карыстаецца нейкімі старымі фактамі, напрыклад, на с. 178 гаворыць, што мінімальная тэмпература ў Антарктыдзе 88,3 °С (1961 г.), а чаму не выкарыстаць новыя дадзеныя — 89,2 °С (1983 г.), тым больш, што менавіта апошнія дадзеныя ўжо больш за 10 год выкарыстоўваюцца ў школьных падручніках. А што робіцца з лічбамі? Глыбіні мораў або завышаюцца, або заніжаюцца. Тое ж назіраецца і ў адносінах да плошчаў некаторых мораў (Аравійскае — 4592 тыс. кв. км., а не 3683 (с. 51), даўжынь рэк і г. д.

Шмат ляпсусаў і ў пытаннях, звязаных з геаграфічнай наменклатурай. Аравійскі паўвостраў называецца паўвостравам Саудаўскай Аравіі (с. 51, зблытана назва паўвострава з назвай дзяржавы), Малайскі архіпелаг называецца Інданезійскім (зноў падмена назваў), ужываецца чамусьці старая назва вострава Шры-Ланка — востраў Цэйлон, паўвостраў Лабрадор называецца востравам (с.96). Недапушчальна таксама Бразілію лічыць аскепкам Гандваны (с. 11).

Увесь час А. Варатнікоў блытае паняцці "тэктанічная пліта" і "платформа" (с. 12), Цянь-Шань адносіць да маладых гор альпійскай складчатасці (гэта ж герцыніды!), піша, што на ўзбярэжжы Паўночнага Ледавітага акіяна і ў тундры "лета кароткае, усяго 2-3 месяцы", або што лета "з чэрвеня да верасня"(?).

Шматлікімі асабістымі заўвагамі складальнік уводзіць у зман юнага чытача. У яго "бутэлькавае дрэва" расце толькі ў зоне саван Аўстраліі, быццам яго няма, напрыклад, на Бразільскім нагор'і. Калі заходзіць гаворка пра адкрыццё Аўстраліі, нічога не гаворыцца пра галандца Янсзана (1605 г.), які першым з еўрапейцаў высадзіўся на ўзбярэжжы заліва Карпентарыя. Пры тлумачэнні пытання геалагічнай гісторыі Зямлі А. Варатнікоў называе толькі эры архейскую, пратэразойскую і кайназойскую, а астатнія "хавае" ад чытача. У гэтай энцыклапедыі гаворыцца, што ў нетрах трапічнага лесу "обитают бегемоты" (!) (с. 35). Цяжка здагадацца юнаму географу, што разумець пад фразамі: "ратангі...цягнуцца звычайна на 300-400 метраў" (уверх ці ў даўжыню?).

А чаго варты стыль! Вось асобныя прыклады: "Назвы мацерыкоў па частках свету" (с. 8), "яры пакрыты... невысокімі ўзгоркамі" (с. 9), "Арктычным летам павялічваецца таксама і фауна" (с. 17), "раўніны тундры пазбаўлены расліннасці... расліннае покрыва тундры складаюць перш за ўсё мхі і лішайнікі" (с. 19), "траваедны грызун" (с. 21), "лета субтропікаў з'яўляецца радзімай апельсінаў" (с. 28), "дрэвы растуць кучкамі" (с. 32), "даліны рэк...зносяць з сабой усе абломкі" (с. 39), "У Паўночнай Амерыцы самымі вядомымі з'яўляюцца Кардыльеры (з Андамі)" (с. 41),"Сёння вадой занята 70,8% сушы" (с. 42), на долю Ціхага акіяна "прыходзіцца больш за 50% усяго жывога з колькасці сусветнага" (с.49) і да т.п.

Вельмі цікавымі, а галоўнае — "пазнавальнымі" з'яўляюцца сцвярджэнні: "Ібн Батута ў **14**

"География и астрономия. Универсальная энциклопедия школьника" ("Валев", 1995).

ПРЫГОДЫ... БАЛЕТНАГА ТУФЛІКА

Нажаль, нашы выдавецтвы не часта радуюць дзяцей кніжкамі, якія б прыадкрывалі ім таямніцы розных відаў мастацтва. Асабліва гэта тычыцца самых маленькіх чытачоў. Калі старэйшыя яшчэ могуць пазнаёміцца з кнігамі "дарослымі", дык малечы даводзіцца хіба спадзявацца на тое, што "дзядзькі" і "цёткі" нарэшце пра іх успомняць. На шчасце, успомнілі. У выдавецтве "Беларусь" выйшла аповесць А. Вольскага і Л. Макаранкі "Шукальнікі Маленькага прынца", што мае падзагаловак "Пра незвычайныя прыгоды Алеся і Балетнага Туфліка". Адным словам, гаворка пра балет, а адрасавана яна найперш, як сказана ў анатацыі, дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

Пагадзіцеся — зрабіць гэта не так і проста. Каб і даходліва, зразумела атрымалася і з элементамі гульні, тымі самымі прыгодамі, што таксама надаюць усяму апавяданню адзнакі спектакля, дзе галоўнымі дзейнымі асобамі акурат і з'яўляюцца Алесь і Балетны Туфлік. Зрэшты, і сярод дарослых далёка не ўсе ўспрымаюць балет як від мастацтва, і не кожны здатны адчуць, наколькі шмат можна сказаць (і расказаць!) мовай руху, жэсту, танца! А тут жа чытачы, нават слухачы, калі згаданую гісторыю яны пачуюць з вуснаў бабулі ці дзядулі, альбо бацькоў — дзеці...

За напісанне кніжкі ўзяліся людзі, дасведчаныя ў літаратуры і мастацтве. Няма патрэбы прадстаўляць Артура Вольскага — паэта, празаіка, драматурга, "чалавека тэатра". А Людміла Макаранка — вядомая журналістка, спецыялізуецца на асвятленні пытанняў музыкі, балетнага мастацтва. Ім, як кажуць, і карты ў рукі...

Яны здолелі спалучыць пазнавальнасць з займальнасцю, апошняя ж пачынаецца з пастаянных адкрыццяў. Так быў прадвызначаны выбар галоўнага героя. Ім стаў звычайны вясковы хлопчык Алесь, які на канікулы прыехаў у горад. Шмат новага, незвычайнага ўбачыў ён, але галоўнае было ў тым, што... Пра гэта — у першых радках аповесці:

"Ах, які цудоўны быў сёння дзень! І так шкада, што ён ужо скончыўся. Адно суцяшала Алеся, што побач з цёплым ложкам на століку ляжыць балетны туфлік. Як добра, што цётачка Аліна дазволіла пакласці яго тут...

Збіраючыся ў вялікі горад на зімовыя канікулы, ён нават і не падазраваў, што ёсць на свеце такія туфлікі. Мама сказала, што цётка Аліна — балерына. Але хлопчык нават і не здагадваўся, што гэта за прафесія".

Асобныя сакрэты яе Алесь адкрыў, калі папрысутнічаў з цёткай у рэпетыцыйнай зале. А яшчэ хлопчык паглядзеў балет "Альпійская балада" і вельмі перажываў, што адзін з галоўных герояў Іван загінуў ад рук фашыстаў. Цётка, як толькі магла, супакойвала пляменніка. Нават паабяцала назаўтра ўзяць на спектакль "Шчаўкунчык" і дазволіла яму ўзяць з сабой ружовы балетны туфлік.

Аўтары дакладна перадаюць душэўны стан Алеся, які за дзень атрымаў столькі новых уражанняў і вельмі блізка ўспрымае ўсё да сэрца: "Туфлік, напэўна, вельмі стаміўся. Яму таксама трэба спаць. Заўтра ж раніцай — зноў рэпетыцыя, а ўвечары — зноў спектакль. Ён ціха ляжыць на століку блізка Алесевай галавы. Але хлопчыку здаецца, што туфлік уздыхае, што ён жывы і вось-вось загаворыць..."

Туфлік і на самай справе загаварыў. І якраз з гэтага моманту пачынаецца дзівоснае падарожжа Алеся разам з яго новым сябрам у загадкавы і непаўторны свет балета. Аказваецца, гэта туфлік павінен выканаць просьбу другога туфліка: перадаць важную вестку Маленькаму прынцу. Вядома, хлопчык адразу згаджаецца дзейнічаць разам, ды Туфлік пералыніў яго:

"Э-э... Маленькага прынца яшчэ знайсці трэба, — зноў уздыхнуў ён, — а дзе шукаць яго, я і не ведаю. Балетаў шмат, і амаль у кожным ёсць прынц. Але які з іх нам патрэбны? Каб ведаць загадзя — усё было б вельмі проста. А так...

— Але ж ты сам казаў, што вестку трэба перадаць Маленькаму прынцу. Маленькаму...

— Так. Сёння мой сябар Туфлік папярэдзіў мяне, што я павінен шукаць у балетах менавіта Маленькага прынца. Ён паляцеў некуды,

стагоддзі апісаў на падставе асабістых назіранняў увесь ісламскі рэгіён ад **Паўночнай Амерыкі** (?); да Кітая" (с. 95), "Пасля нататкаў Марка Пола пачынаецца эпоха вялікіх геаграфічных адкрыццяў **Еўропы**" (с. 97), "на тэрыторыі **Эфіопіі** Белы Ніл зліваецца з Блакітным" (с. 72); на самай справе — на тэрыторыі Судана...

Шмат у энцыклапедыі супярэчнасцяў. Пра Калумба гаворыцца тройчы, прычым, у першых двух выпадках складальнік заўважае, што "вялікі падарожнік не падазраваў, што на самай справе ён адкрыў вялікі невядомы свет — Новы свет", а вось у апошнім, у астранамічнай частцы (с. 348), мы ўжо знаходзім, што "хітрэц" Калумб "мудраваў, калі пераконваў усіх, што адкрыў шлях у Індыю", бо "адкрыццё новага кантынента павінна было стаць дзяржаўнай тайнай, а гэта Калумбу растлумачылі дастаткова даходліва".

Калісьці М. Баранскі назваў карту альфай і амегай геаграфіі, а вось у дадзенай энцыклапедыі вы не знойдзеце ні карт, ні планаў мясцовасці. Праўда, ёсць фотаздымак карты Аленінскага паўвострава (уклейка), але пад ім надпіс "Фрагмент карты Еўропы" (!?). Ёсць і выявы паўшар'яў, але незразумелымі з'яўляюцца надпісы: "Паўночнае паўшар'е" пад заходнім і "Паўднёвае паўшар'е" пад усіходнім. І хоць карт няма, але ў шматлікіх артыкулах можна знайсці заклік да чытача: "згадайце фізічную карту" (і гэта ў энцыклапедыі!).

Няма і ілюстрацыйнага апарата, бо тыя ілюстрацыі, што змешчаны ў кнізе, проста не адпавядаюць яе артыкулам. Незразумела, навошта змешчаны фотаздымкі Тадж-Махала, Лондана, Масквы, Парыжа, бо гаворка пра іх не вядзецца. Нельга зразумець і надпісы пад некаторымі з фотаздымкаў: "Краявід. Нацыянальны парк ЗША" (які парк?), "Краявід. Беларусь" (краявід якой часткі Беларусі?) і г. д. А пад малюнкам "Зямля ў разрэзе" зусім няма ніякіх тлумачэнняў.

Шмат заўваг і да мовы энцыклапедыі. У адных выпадках яна вельмі спрошчаная, што перастае адпавядаць узроўню вучняў "6-11 класаў", а ў іншых ужо занадта "завумная". Напрыклад, вельмі цікава падаецца тлумачэнне паняцця **карат**: "1 карат = $2 \times 10^{(-4)}$кг" (а чаму не прасцей -0,2 г?)

Каб даць падрабязны разбор выдадзенага выдавецтвам "Валеў" "фаліянта", неабходна спісаць столькі ж паперы, колькі пайшло яе на сам рукапіс энцыклапедыі. Варта зазначыць, што выдавецтва "Валеў" мае вялікія магчымасці ў складанні і выданні цудоўных кніг. Якасная папера, прыгожыя, цікавыя фотаздымкі. Дзякуй, "Валеў", за імкненне працаваць на школу. Толькі хочацца перасцерагчы выдаўцоў ад супрацоўніцтва з людзьмі, далёкімі ад навукі і педагогікі.

Ігар ШАРУХА,
выкладчык МДПІ імя Куляшова
г. Магілёў

пакінуўшы сваю кветку, вось толькі не памятаю, якую, — Туфлік яшчэ цяжэй уздыхнуў. — А кветка без яго засумавала. Яна зусім завяне, калі прынц не вернецца".

Пошукі прынца — гэта падарожжа з балета ў балет. А паскорыць яго Алесю і Туфліку дапамагае дырыжорская палачка, па ўзмаху якой адбываецца чарговы цуд. І ў кожным з балетаў ("Шчаўкунчык", "Пятрушка", "Канёк-гарбунок", "Лебядзінае возера", "Спячая прыгажуня", "Папялушка") хлопчык сустракаецца з прынцамі, ды, як хутка высвятляецца, яны не тыя, якія патрэбныя яму. І толькі апошняе падарожжа прыносіць чаканую сустрэчу.

Канечне ж, і Алесю, і Туфліку патрэбен быў Маленькі прынц з аднайменнага балета: "Маленькага прынца яны заспелі сярод безлічы руж. А кветкі такія прыгожыя! І ён танцуе з імі. Толькі твар яго чамусьці невясёлы. Напэўна таму, што хаця гэтыя ружы вельмі падобныя на ягоную ружу, але ўсё-такі нечага ім не хапае".

У аповесці не толькі займальны сюжэт і шмат пазнавальнага матэрыялу. У тэксце выкарыстаны нотныя прыклады, таму пры жаданні можна прайграць адпаведныя моманты са згаданых твораў П. Чайкоўскага, Ф. Стравінскага, Р. Шчадрына, С. Пракоф'ева, Я. Глебава. Дарэчы, усе гэтыя прыклады пранумараваны, а ў канцы кнігі змешчаны іх паказальнік, таму лёгка разабрацца, урывак з якога балета ўзяты.

А калі прыняць пад увагу, што аповесць па-майстэрску праілюстравана Таццянай Беразенскай і Яўгенам Ларчанкам, то лепшага падарунка маленькім і не прыдумаеш. Асабліва, паўтараю, калі ўлічыць, што нашы выдавецтвы не часта радуюць дзяцей кніжкамі, якія б прыадкрывалі ім таямніцы розных відаў мастацтва.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Часопісы

УСЁ СВЕТЛАЕ — З ДАБРЫНІ І ЧЫСЦІНІ

Зразумей чалавек чалавека... Па-сапраўднаму адчуй, што на душы ў яго, а не толькі заўваж тое, што навідавоку. Гэта не так і проста зрабіць, але сёння асабліва патрэбна. Бо менее дабрыні і шчодрасці, бо гэткімі знешне агрэсіўнымі становяцца нават добрыя людзі. А ўсё — з-за штодзённай неўладкаванасці, з-за вялікіх і малых крыўд. Хоць ці могуць быць яны малымі, калі баліць душа? І вось ужо на папрок хтосьці гатовы адказаць папрокам, на адно крыўдлівае слова нехта "вылье" цэлы паток... А жыццё ж адно. І як сказаў нехта з вялікіх, яго трэба ўспрымаць такім, якім яно ёсць, але самому імкнуцца зрабіць яго лепшым. А гэта немагчыма без сапраўднага разумення чалавека.

Менавіта на такі роздум наводзіць адзін з вершаў Н. Галіноўскай, які, як на маю думку, у яе падборцы, змешчанай у "Маладосці", займае цэнтральнае месца. Н. Галіноўская, як вядома, больш выступае ў галіне дзіцячай літаратуры, у якой знайшла сваё прызванне (ды і прызнанне). Але і вершы "дарослыя", што з'яўляюцца — на жаль, досыць рэдка — з-пад яе пяра, напоўнены сваім бачаннем свету, успрыманнем людзей. Лірычная гераіня паэтэсы — наша сучасніца, з тых, каго мы бачым пастаянна поруч. І яна ж — асоба, індывідуальнасць, бо жыве менавіта сваім жыццём. Магчыма, і не заўсёды простым, але такая ўжо яе планіда:

Кажуць многія: "З каменным сэрцам...",
Бо не ведаюць сэрца майго.
Яно мае падвойныя дзверцы,
А за імі — бушуе агонь.
Не старайцеся стукаць у сэрца,
Калі цені на вашай душы:
Не адпусцяць цяпла, каб сагрэцца, —
Дзверцы сэрца майго — ледзяшы.
На мяне наракайце не дужа,
А прымайце такую, як ёсць.
Ёсць ахова — калючкі — у ружы,
І не кожны прахожы — ваш госць.

Творы і іншых аўтараў, прадстаўленых у "Маладосці", нясуць на сабе адбітак нашага часу, які змушае задумвацца над пражытым і перажытым. А яшчэ над тым, ці так жывеш на зямлі. Безумоўна, матывы для літаратуры традыцыйныя, ды на сённяшні час яны набываюць ярка выражаную агульначалавечую падсветку. Як, для прыкладу, у М. Маляўкі. Чарговы раз звяртаецца паэт да блізкага і дарагога яму чалавека, у якім бачыць пастаянную і надзейную апору. Нягледзячы на тое, што поруч гэтага чалавека няма. Няма фізічна, але маральная, духоўная прысутнасць нязменная: "І яшчэ не раз, калі буду падаць //У глыбокага смутку яму, // Абапруся на памяць // Пра маму".

.. Люблю чытаць Н. Гальпяровіча. Заўжды падабаецца ў яго дакладная ўзважанасць радка, пачуццёвая выверанасць. І зноў жа — уменне, адштурхоўваючыся ад традыцыйных матываў, нязменна заставацца самім сабой. Лірычнага героя Н. Гальпяровіча не зблытаеш з іншымі. І ці не найперш дзякуючы таму, што ў яго моцнае пачуццё знітаванасці з усім наваколлем. А яшчэ часам, неяк ненавязліва, прысутнічае пэўная віна... Тая віна, што звычайна з'яўляецца ў людзей з абвостраным успрыманнем усіх рэалій паўсядзённасці. Па-руску кажучы, "совестливость". Адсюль — як маральная праграма, як напамінак не столькі іншым, колькі сабе самому: "Калі душа, калі сляза, // Калі так хочацца хвіліны, // Каб нешта важнае сказаць, // Якое ты сказаць павінны, // Не здрадзь пасля, і не змані, // І не сапсуй жыццём далейшым // Той момант светлы і найлепшы, // Што з дабрыні і чысціні".

У еднасці з прыродай, у яе нерушавасці шукае спакой і лірычны герой Б. Давідзюка — дэбютанта "Маладосці". Праўда, аўтар узростам не такі і малады. Нарадзіўся ў 1953 годзе на Пружаншчыне, скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, працуе інжынерам-будаўніком, раней друкаваўся ў асобных перыядычных выданнях. Для Б. Давідзюка характэрна адмаўленне той катэгарычнасці, калі ва ўспрыманні рэчаіснасці існуе як бы нейкая палярнасць: з аднаго боку — усё лепшае, з другога — горшае. Праўда, яму пакуль не ўдаецца пазбавіцца ўплыву знакамітых паэтаў. Канечне, вучыцца ў выдатных папярэднікаў ніколі не лічылася за грэх, але ж важна, каб пры гэтым не гублялася аўтарская самастойнасць. Як у гэтых радках, што вельмі ж ужо знаёмыя "ясенінскай" тугой:

Не шукайце мяне вы там болей —
Без прымусу я ў восень пайшоў.
Лісце дымна згарае на доле,
І маіх не заўважыць слядоў.

Хоць, па шчырасці кажучы, сам па сабе малюнак паэтычны — запамінальны. І, у рэшце рэшт, важна, што Б. Давідзюк ведае цану слову, якое можа выклікаць адпаведны настрой, а ўжо праз гэты настрой лірычны герой і раскрывае сябе.

А вось А. Нікулін у "Маладосці" выступае не ўпершыню. У адрозненне ад Б. Давідзюка (я не збіраюся супрацьстаўляць гэтых двух, безумоўна, таленавітых аўтараў, проста іх падборкі стаяць поруч), у яго схільнасць паказаць лірычнага героя чалавекам сучасным ва ўсіх адносінах. Што ж, каму што падабаецца. Галоўнае, каб была паэзія. А вось яе, няхай гэта не падасца А. Нікуліну крыўдным, і замала. Асабліва ў першых двух вершах.

Магчыма, я памыляюся, але, скажам, у першым вершы нічога свайго:

Вар'яцкі свет, і ўсё жыццё як дым.
Любоў знайсці — як пекла пераплюнуць.
Так хочацца быць вечна маладым...
Чаго чакаць? Аб чым сягоння думаць?
Усё, усё жыццё — як вечны дым.

У "Хрысціянскай размове" адразу рэжа слых аўтарскае жаданне быць запанібрата з самім ... Богам:

Скажы мне, Божанька, скажы,
Каго распялі на крыжы?
Гаворыць Божанька: "На ім
Распяты пілігрым".

Як мне падаецца, апошнім часам нашы паэты (незалежна ад узросту) вельмі ж ахвочыя у розных варыянтах асэнсоўваць рэлігійныя матывы. Што ні твор, дык ці неабавязковы зварот да Бога. У гэтым нічога кепскага не было б, калі б напісанае, як кажуць, прапускалася праз сэрца, было аўтарам унутрана ўзважана і перажыта. А то нярэдка атрымліваецца, як у савецкія часы. Як вядома, тады ці не кожны творца лічыў абавязковым прамовіць слова пра партыю і пра Леніна. Няважна, што найчасцей гэта атрымлівалася на ўзроўні пасрэднага вучнёўства, галоўнае было — "пракукарэкаць". Але ж тады падобных "вершаў" хоць чакалі адпаведныя ідэалагічныя ўстановы. А цяпер, здаецца, а боку царквы такіх заявак не паступала! Навошта ж гэтак старацца?!

У цэлым жа снежаньскі нумар "Маладосці" наводзіць на ўсешную думку, што многія з яго аўтараў людзі зусім не філалагічнай адукацыі, ці, перш, чым атрымаць яе, набылі іншую прафесію. А гэта ці не найлепшае пацвярджэнне, што, нягледзячы ні на што, жыве родная мова, ёсць у людзей жаданне пісаць на ёй. А значыць, як бы цяжка ні даводзілася сёння, працэсы нацыянальнага абуджэння, Адраджэння — незваротныя. Няхай яны ў нечым апошнім часам і запаволіліся, але, думаецца, іх ужо ні чым не запыніць. Кажучы словамі галоўнага "прараба", працэс пайшоў. І гэтым разам — у належным кірунку.

Але — пра саміх аўтараў. Я. Кантылёў выступае з аповесцю "Распячатка чорнай скрынкі". Назва як быццам цягне на дэтэктыў, але гэта зусім не дэтэктыў, а твор, як раней любілі казаць, на вытворчую тэму. Апошняе, на жаль, аказвае аўтару не лепшую паслугу, хоць, зрэшты, галоўны герой атрымаўся. Ён запамінаецца сваёй жыццёвай (і прафесійнай) няўрымслівасцю, цвёрдасцю перакананняў, маральнай чысцінёй. Сяргей Шчуцкі з людзей, якім жывецца нялёгка і няпроста з-за іх нежадання ісці на пастаянныя кампрамісы, з-за рашучасці гаварыць праўду і толькі праўду. У нечым яны непрыкаянцы, але ўсё ж іх нельга назваць нешчаслівымі. Прынамсі, сябе такімі яны не лічаць, а ўсё з-за вялікага аптымізму.

Парадаваў і самы малады аўтар нумара Р. Равяка. Ён нарадзіўся ў 1975 годзе ў Баранавічах, скончыў мясцовы тэхналагічны тэхнікум, працуе інжынерам у родным горадзе і адначасова завочна вучыцца ў Магілёўскім тэхналагічным інстытуце. У "Маладосці" — дэбютант. Апавяданне "Ён заблудзіўся" вяртае ў трыццатыя гады. Галоўны герой твора "старшыня калгаса "Сталінец" Рыгор Суцяга" заблудзіўся ў лесе і блукаў ужо трэція суткі. З кожнай гадзінай спадзявання, што ўдасца выбрацца з гушчару, заставалася меней і меней: "лес цягнецца ажно да Украіны", а Суцяга — чалавек прышлы, вырас у горадзе, пасля заканчэння рабфака некалькі гадоў працаваў... У калгасе апынуўся па накіраванні партыі і, вядома ж, ненавідзеў усіх гэтых кулакоў, аднаасобнікаў, пра якіх начуўся шмат яшчэ ад бацькі, старога бальшавіка.

Калі Суцяга ў роспачы ажно заплакаў, ён нечакана пачуў стрэлы, кінуўся ў той бок:

"Нарэшце з-за дрэў заўважыў постаці людзей.

Прабегшы яшчэ крыху, Суцяга разгледзеў, што тыя ў форме НКУС. Яны шукалі яго, Суцягу! Які ж ён быў дурны! Ці можа партыя пакінуць без увагі знікненне старшыні? Знікненне Савецкай улады на месцы — гэта ж разрыў таго ланцужка, які звязвае ўсіх працоўных з кіраўніцтвам краіны".

Нкусаўцы ж расстрэльвалі ў лесе "ворагаў народа", і Суцяга, аказаўся выпадковым і непатрэбным сведкам, а таму яго лёс быў прадвырашаны:

"Суцягу схапілі і павалаклі да яміны. Краем вока Рыгор заўважыў у ёй целы забітых, што ляжалі адно на адным... Рыгора паставілі ля краю яміны. Ён не вырываўся і пакорліва стаяў, толькі незразумела аглядаўся па баках, не верачы ў тое, што адбываецца. "Можа, так і лепей, — падумалася раптам былому старшыні, — гэта ж толькі дурны сон і..."

Нейкі чырвоны вір падхапіў яго разам з пачутым стрэлам і панёс далёка-далёка".

Характэрна тое, што ніхто нават і не прыслухаўся да апраўданняў Суцягі, калі ён спрабаваў даказаць, што заблудзіўся. А калі б і паверылі, дык усё адно адпусціць Рыгора ніяк не выпадала. Нездарма ж пасля ўсяго, што адбылося, старэйшы нкусавец роспачна прамовіў: "Якое месца было... Крыху далекаватае, але ціхае... І вось табе госці... Ліха яго матары... Неспакойна тут робіцца. Трэба іншае месца для "вяселляў" шукаць, ды і бліжэйшае..."

На глыбокі роздум наводзяць апошнія радкі твора:

"Калі пачалі збірацца ад'язджаць, малады нкусавец з рэдкімі вусікамі пачаў нечаму ўсміхацца.

— Чаго ты? — старэйшы змрочна працяў позіркам.

— Ды так. Падумалася, а што, калі і праўда — чалавек заблудзіўся ў лесе.

Уся каманда здзіўлена зірнула на пустасмеха".

Гэтая ўсмешка яскрава сведчыць, хто выконваў прысуд. Адначасова відаць, у якім балоце, у якой прорве знаходзілася тагачаснае грамадства, калі хоць на якое сумненне былі здатны толькі ...пустадомкі.

Няцяжка ў апавяданні заўважыць і "ўзятае" ў В. Быкава з твораў на адпаведную тэматыку. Але, прыняўшы пад увагу ўзрост Р. Равякі, паўтараю, нельга за яго не парадавацца. Хацелася б, каб і надалей яму пісалася ўпэўнена і яго імя ў маладой беларускай літаратуры не згубілася.

Гэтым разам я свядома засяродзіўся на "Маладосці", хоць, вядома ж, можна было б сказаць нямала добрых слоў і пра "Полымя", "Беларусь", "Нёман". У іншых месячных аглядах звычайна больш увагі аддавалася таму ж "Полымю". Зрэшты, чытач і сам зарыентуецца, на што звярнуць першаступенную ўвагу.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

ЛІМ
ЧАСАПІС

ПЕРШЫ Ў СЁЛЕТНІМ ГОДЗЕ

нумар беластоцкага "Часопіса" завітаў на Беларусь. Па традыцыі ён адкрываецца календаром памятных дат. Гэтым разам і тых, што тычацца ўсяго года (для прыкладу, 260 гадоў назад, у 1736 годзе, у слуцкай мануфактуры пачаўся выпуск знакамітых паясоў), так і студзеня. А ў гэтым месяцы, пра што мы паведамлялі ўжо, — 130-годдзе з дня нараджэння Я. Карскага. Дарэчы, падрабязна пра яго дзейнасць, жыццё расказвае ў артыкуле "Заснавальнік" М. Гайдук.

Яркая старонка нацыянальнай гісторыі паўстае і з нарыса У. Арлова, у якім гаворка ідзе пра К. Семяновіча, які па сутнасці першым стварыў ...ракету. Гэта публікацыя перадрукавана з часопіса "Дело". А вось са "Звязды" перадрукаваны нарыс А. Вярцінскага "Супрасльскія званы".

Прадстаўлена і пастаянная рубрыка "Хроніка мясцовасці". Ёсць магчымасць завітаць у вёску Грыневічы, што мае багатую гісторыю.

Думаецца, чытач не пакіне па-за ўвагай публіцыстычны роздум М. Шаховіча "Ці нешта змянілася". Тым больш, што тое, пра што гаворыць аўтар, мае дачыненне і да нашага жыцця. Мяркуйце самі. М. Шаховіч, у прыватнасці, піша: "Раней усё змаганне за беларускасць у межах Польшчы адбывалася пад умоўным лозунгам: *Нам перашкаджаюць! Нас дыскрымінуюць!*". Цяпер жа, як сведчыць М. Шаховіч, "беларусы ў Польшчы пачалі сварыцца паміж сабою, змагаючыся за адно і тое ж — культурнае развіццё і правы сваёй нацыянальнай меншасці. Ранейшая адзінка падзялілася на старых і маладых і яшчэ Бог ведае якіх. Адным словам — былі камуністы і іншыя. Пачалася гульня ў вялікую палітыку за наштодзённыя справы". І яшчэ пра тое, што назіраецца сёння: "Калі на імпрэзы фэставага характару (адным словам — на гулянку) знаходзяць некалькі соцень мільёнаў, дык на выдавецкую дзейнасць — усяго пару дзясяткаў у год".

Ці не пра нас?

Н.К.

ВЕРШЫ УЛАДЗІМІРА ДУДЗІЦКАГА

прапануе ў сваім шостым, апошнім за мінулы год нумары часопіс "Спадчына". Узяты яны з альманаха "Ля чужых берагоў", які выдавецтва "Бацькаўшчына" выпусціла ў Мюнхене яшчэ ў 1955 годзе. Ёсць у нумары і традыцыйная рубрыка "Мемуары". У ёй змешчаны матэрыялы, якія дазваляюць яшчэ лепш зразумець нацыянальную даўніну. З "Дыярыушам князя Міхала Казіміра Радзівіла..." (публікацыя і пераклад В. Арэшкі) чытачы "Спадчыны" ўжо знаёмы: пачатак гэтага мемуарнага твора бярэ адлік яшчэ з 4-га нумара часопіса за 1994 год. А вось да другога унікальнага літаратурнага помніка — "Дыярыуша аб падзеях у Польшчы" Альбрыхта Станіслава Радзівіла прычыніцца можна толькі цяпер. Аўтар прадмовы "Паслядоўнік Льва Сапегі" і перакладчык — У. Свяжынскі.

Шэраг матэрыялаў прысвечаны 75-годдзю Слуцкага збройнага чыну. Гэта — успаміны С. Бусла "Слуцкае паўстанне" і ліст В. Русака К. Езавітаву (прадмова, каментарый і публікацыя У. Ляхоўскага). Пра С. Некрашэвіча расказвае Э. Іофе ("Першы старшыня Інбелкульту"). Народная творчасць у полі зроку І. Харламава ("Агоўскія куфры").

Вядомы педагог, мовазнаўца Я. Гладкі адразу пасля вайны стварыў у Нямеччыне (Ватэнштэт) выдавецтва. З брашуры, выпушчанай ім, перадрукаваны "запіскі з 1579 года" "Пад Полацкам дажджы", аўтарам якіх з'яўляецца сакратар С. Батуры Р. Гайдэнштайн.

Дзякуючы А. Вабішчэвічу можна пазнаёміцца з жыццём выдатнага беларускага адраджэнца К. Дуж-Душэўскага, а таксама з яго артыкулам "Беларусь і Рыжскі мір".

Увазе чытача прапануюцца ўспаміны беларускай дзяячкі, дачкі беларускага праваслаўнага святара, расстралянага фашыстамі, З. Каўшанкі "Бязодне", якая адбывала пакаранне ў савецкіх лагерах, артыкул У. Жабацінскага "Аблудным шляхам" (прадмова Э. Іофе), рэцэнзія М. Батвінніка на кнігу Г. Кісялёва "Радаводнае дрэва" ("Літаратура эпохі Каліноўскага"), матэрыялы пра станаўленне беларускай дзяржавы "Як адстойвалі ўсходнія землі" (дакладная запіска У. Ігнатоўскага, артыкул М. Скарэўскага "Беларускі рух у Віцебшчыне"), прапанаваныя А. Гесь (яна ж і аўтар прадмовы).

Паэзія

Раман ТАРМОЛА-МІРСКІ

З КНІГІ "ПРЫЧАСЦЕ"

ДЗЕНЬ РОСПАЧЫ

Не жалоба як быццам,
а плачуць медныя трубы.
Колькі твараў сягоння
ўпалі ў рукі нічком...
Я цалую цябе
ў твае дзяржаўныя губы,
Ты яшчэ не памерла...
Не будзеш ты мерцвяком!
Ходзяць ходырам сёння
твае распасцёртыя грудзі
І ўздымаецца бел-чырвона-белы твой сцяг.
Гэта толькі пачатак —
трасуцца наіўныя людзі.
Беларусь толькі ведае —
Гэта спрадвечны працяг...

ДАВЕР — ЗАПАЛКА НА СЯМІ ВЯТРАХ

Страляў, страляе, будзе страляць свет,
Хаця б для адганяння страху,
Каб чуў і ведаў дарагі сусед,
Што побач не адны манахі.

Канкрэтная граніцы палаца
Ідзе не па зямлі — па сэрцы,
І покуль баязліва яно б'ецца,
Находзіць будзе на касу каса.

Давер — запалка на сямі вятрах,
Ніколі не палае роўна
І генетычны чалавечы страх
Не робіць гэты свет бяскроўным.

●

У запарушанае вока
Чужое з пальцамі не лезь:
Табе далёкі і глыбокі
Чужога вока свет увесь.

Да парушынкі каб дабрацца,
Пералапаціш цэлы свет,
Бо не ў сваім лягчэй капацца, —
І страху менш і меней бед.

АПАФЕОЗ НЕБЫЦЦЯ

Гуляюць душы па сусвету,
А па музеях — чарапы...
Не зразумець гулянку гэту
Нам, неразумным і сляпым.
Стотысячную цыгарэту
Раскурвае крыміналіст,
Ды тайну змрочную дагэтуль
Не раскрывае чэрап-Ікс.
Глядзіць вачніцамі ў прастору...
Што бачыць: промні ці снапы,
Ці як на бераг коціць мора
Жывыя нашы чарапы?
У зачараванае кола
Вада з наветрам возьмуць нас,
Каб вываліцца выпадкова
Змаглі мы ў іншы кут і час.

МАЛПЫ БЕГ ДА ЧАЛАВЕКА

У Егіпце піраміды.
І на Марсе піраміды.
Тут і там аднойчы нехта
Быў адным і тым жа гідам...
Што ж вы сунеце ў сваячкі
Нам адну і тую ж малпу,
Што вярэдзіце балячку,
Быццам рукі — былі лапы...
Хіба родзічаў наш розум
Разумнейшых больш нявартны?
Можа, як зірнуць цвяроза,
Гэта Дарвінавы жарты.
Голаў людзям замарочыў
І... згубіўся ў іншым веку:
Хай прагледзяць дурні вочы —
Малпы бег да чалавека.

Час здагадку нам не выдаў,
Сфінкс маўчыць і фараоны.
Мне здаецца, піраміды
Перш за ўсё — зямлі кароны;
Доказ творчасці вялікай
Незямнога сябра-творцы,
Розум чый у космас клікаў,
Розум надзвычайнай моцы.

БОЛЬ НА ТРОХ ЛАПАХ

На лапах трох скакаў сабака
З такой пакутай на вачах...
Слёз не было,
а позірк плакаў.
Не білі больш,
а ён крычаў.
Ён прыпыняўся, азіраўся.
Залашчваў і залізваў боль,
І лапа зноўку валаклася,
І валакла боль за сабой.
Яна вісела,
як пытальнік...
Двухногія не раз, не два
Услед глядзелі спачувальна,
А ім — трохлапы спачуваў...
Не скардзіўся ён Чалавеку,
Ды чулі ўсе ягоны ўздых:
Якім патрэбна быць калекам,
Каб пакалечыць так другіх.
І аб'ядноўвала ўсіх гора,
Хаця ўсе розныя... Хаця
У кожнага
свая
апора,
Калі пакуты боль працяў.

●

Я слухаю людзей, каб не аглухнуць.
Я слухаю сябе, каб жыць...
І сваркі ўсе дзяржаўныя на кухні
Даўно не тычацца маёй мяжы.

У пыле слоў паперных і цагляных
Больш не адкашляцца, не прадыхнуць
Той ісціне, што знала бруд і глянец,
Каб пад канец на ўсё рукой махнуць.

●

Па слізкай кладцы
ад жыцця да смерці
Наканавана мне штодня ісці...
Звалюся каменем
ці здзьме, як смецце —
Я лёсу будучыню не спасціг.
За ўсё,
што ў нашай долі зараз дрэнна,
Віну на некага я не звалю,
Бо я ж не пасынак...
Я сейбіт крэўны
Дабра і зла,
што кінуты ў раллю...
На полі не ў пашане пустазелле.
Затое аж буяе між людзьмі!
Сягоння маскі ледзь не ўсе надзелі
З дзіцячымі і воўчымі вачмі.
Ды будзе каласіцца ў нас калоссе
І мары калыхацца міражом,
Перацалуемся, перагрызёмся
І ў новы век... ракеты запражом.

●

Раблю кругі ў мястэчку родным,
Па ціхіх вуліцах кругі.
Па іх вядзе інстынкт прыродны
Самоты ўдумнай і тугі.

Мяне перараслі ўсе дрэвы.
Яны мяне й перажывуць,
І справа ідучы і злева,
Калі цыганкі не салгуць.

Да што цыганкі... Сам цыганю
Няведама што пад настрой,
Сам рызыкоўна лёс арканю,
Па ўсіх прыкметах як не мой...

З РУК У РУКІ

Васілю ВІТКУ

Чытаеш першага...
Брыдка.
Другога чытаеш.
Гурток.
Чытаеш трэцяга...
І... Віткі
Прыгадваеш новы віток.
Бог, маладых упікнуўшы
Немаладога радком,
Просіць прачысціць душы,
А не пальчыкам вушы
У зале канцэртнай крадком.
Клавішы слоў і думак
Могуць — ды як! — выкрасаць
Для жыцця — паратунак,
Для барацьбы — рацьць.
Добра, як нашы розы
З рук у рукі ўпару
Удзячнасці апафеозам
Творцу...
Правадыру
Іх паднясуць грымотна
І наяве і ў сне...
Наш жа паэт сумотна
Толькі паправіць пенснэ.

Звыкла апусціць голаў.
Звыкла падыме ўверх.
Годны, як мудры гонар.
Чысты, як першы снег.

●

Дадому хочацца, дахаты...
Як не хвалілі б цябе тут.
Ёсць з'ява большая, чым сам ты,
І з'ява гэта — родны кут.

І з глыбінёй артэзіянскай
Крынічка чыстая ля ног
Шуміць не фестывалем канскім,
Але ж пры ёй Паэт і Бог!

●

Мне казала адна сімпатычная:
Калі кіне народ у касцёр
Усе цацкі дэмакратычныя,
Стане болей святла ад зор.

Мне клялася адна практычная:
Як зладзеяў пачаць караць,
То ўся брацця дэмакратычная
Супраць суддзяў падыме рацьць.

Мне асоба алкагалічная
Паказала кланіны гарэм...
Дэмакратыя ў нас сімвалічная:
Краты — дэмасу... Іншым — Эдэм.

●

Няма ні "ціхай", ні "крыклівай" —
Паэзіі... А ёсць адна,
З якой мы робімся шчаслівей
Ці спальваем сябе да дна.

Бо, як спрадвеку,
так і сёння,
Хто з талентам прыйшоў — не госць.
Ні гарлапанаў, ні ціхоняў
Няма... Паэты ў свеце ёсць!

●

Не стыкуюцца характары.
Думкі,
словы,
крокі,
Не раты ў сям'і, а кратэры,
Кожны агнявокі.
Зачасцілі ў дом псіхолагі,
Міліцыянеры...
Тут работа для заолагаў:
Людзі з розных эраў.
Траваядны з мясаедамі
Хіба ж ужывецца?
Нарадзіліся. Не ведалі.
Лепш бы не радзіцца.
Сын у горла угрызаецца.
Бацька жуе траўку.
І ніхто, ніхто не каецца
за сталом на лаўках.

АБ РОЎНАСЦІ

Пра роўнасць памаўчым, панове,
Таварышы і спадары.
На малітоўным гэтым слове
Куплялі нас правадыры.
У будучыню нас каталі,
Каб потым сесці на трубе,
Як на мышэй, глядзець катамі
У не мышынай барацьбе.
Мы прагрызаем нанаў норкі,
Пакуль наўкола гразь, слата...
У новай і гары і горкі
Зноў не паветра — пустата.
Гара і горка пылам стануць,
Як уздыхнуць нор жыхары.
Таварышу і спадару, і пану
Не ўбачыць сонейка ўгары.

ФЛЮГЕРЫ

У флюгера не божы дар — круціцца,
Бо круціць толькі вецер ім.
Таму няма чым выхвалящца тым,
Хто змог ля ног уладных прымасціцца.

Няведама куды упрочкі
Як ветрагонам прыйдзецца ляцець,
То флюгерам, уладнасці слядочкам,
Ці знойдуць яны месца на хвасце.

Каб усявышняму адбіць паклоны,
Адправіцца тут флюгер у царкву
(Вядома, пакланіцца б лепш царку!),
Бо не матляцца флюгеру са звонам.

БО НЕ АДМЫЦЦА

Вялікі чалавек —
як велічны Эльбрус:
Па ім тантацца абы-хто не зможа...
Ты, хто душой і родам беларус,
У роспачы не стой на раздарожжы.
Халодны з тымі будзь,
што бэсцяць родны кут,
Якім усё адно з зямлі ці з карты сцерці...
Не дай ім уцягнуць сябе ў ганебны бруд,
Бо не адмыешся пасля да смерці.
Што з прыхвастняў узяць...
І з нашае радні
Гарбатага душой не перайначыш.
Хвастамі давіляць хоць да якой гайні —
Пачэсная ў такіх заўжды задача.

Ягор КОНЕЎ

СОНЦА СУНГА

АПАВЯДАННЕ

1975 год

Скончыўшы дзесяцігодку, Алёшка паехаў з роднага Лепеля ў Мінск — паступаць у тэатральна-мастацкі інстытут, на мастацкі факультэт. Ён паспяхова здаў экзамены і на пачатку верасня пасяліўся ў студэнцкім інтэрнаце. Суседам па пакоі аказаўся кампучыец Салот Сунг — смуглаваты нізкі хлопец з шыракаскулым тварам. Яго шыю ззаду рассякаў пунсовы шрам — след асколка авіябомбы.

Да прыезду ў Мінск Салот Сунг дзесяць гадоў партызаніў у джунглях Індакітая, змагаўся з амерыканцамі. Паездкай на вучобу ў СССР яго прэміявала камандаванне за адвагу ў баях па вызваленні паўночных правінцый. Салот Сунг меў чын маёра, і, па армейскай звычцы, штодзень старанна шмараваў крэмам туфлі, а кожныя тры дні апранаў свежую кашулю.

— Цябе нехта пакрыўдзіў, Су?

— Я не атрымліваю лістоў з радзімы ўжо амаль год. Я не ведаю, што там адбываецца. Чытаю вашы газеты, гляджу ваш тэлевізар — хаця б слова пачуць! Такое адчуванне, нібыта Кампучыя ўвогуле знікла з планеты...

— Я таксама чытаю нашы газеты, гляджу тэлевізар — і нічога не чую пра тое, што ў свеце існуе такая цудоўная краіна, як наша Беларусь, і такі цудоўны народ як беларусы, — паспрабаваў суцешыць яго Алёшка.

— Але ты штодзень ходзіш па сваёй зямлі, — не супакойваўся Сунг. — А мая радзіма ў дзесяці тысячах кіламетрах адсюль.

Паўднёваазіяцкі сябра нагадваў чалавека, якога скінулі з самалёта, забыўшы даць яму парашут. Раптам у Алёшкі нарадзілася цікавая думка.

— Нам дапаможа Еўропа, — узняў ён указальны палец.

Увечары ён выпрасіў у сяброўак-аднакурсніц радыёпрыёмнік "Акіян", прынёс у пакой і крыху ўдасканаліў: прывязаў да антэны адзін канец тонкага дроту, а другі выкінуў у расчыненую фортку.

— Кажуць, дапамагае лепей слухаць галасы "з-за бугра", — патлумачыў ён Сунгу айчынны сакрэт.

Сябры пачалі слухаць па вечарах рускую службу Бі-Бі-Сі, "Радыё Свабода" і перадачы шведскага радыё. Першы час іх раздражняў шум і трэск, што заглушаў галасы дыктараў у эфіры, але праз тыдзень хлопцы ужо не звярталі ўвагу на такія дробязі.

Алёшку падабалася слухаць выступленні аналітыкаў, калі тыя прыкідвалі, колькі яшчэ месяцаў пражыве Брэжнеў, а вось доўга слухаць "Чырвонае Кола" Салжаніцына ці з'едлівыя аповяды Вайновіча ён не мог — цягнула на сон.

Толькі праз два тыдні добраахвотнага дзяжурства ля радыёпрыёмніка Алёшка і Сунг дачакаліся тэматычнай перадачы, прысвечанай становішчу ў камуністычнай Кампучыі.

— ...Кіраўніцтва Агнкі дэкларавала: "З васьмі мільёнаў жыхароў краіны для будаўніцтва камунізму дастаткова аднаго", — загучаў бясстрасны голас у эфіры. — Гэтае ўказанне выконваецца з усёй жорсткасцю. Як сведчаць людзі, якім пашанцавала ўцячы за межы Кампучыі, абязлюдзелі ўсе гарады. Насельніцтва краіны сагнана ў вёскі і арганізавана ў камуны.

Сунг кулём скаціўся са свайго ложка, прыпаў вухам да прыёмніка і, забыўшы пра канспірацыю, узмацніў гук.

— ...Скасаваны традыцыйныя сямейныя адносіны. Мужчыны і жанчыны ўступаюць у шлюб толькі з загаду партыйных кіраўнікоў. Скасаваны буддызм — рэлігія, якую спавядаюць дзевяноста пяць працэнтаў насельніцтва. Усе культавыя храмы ўзарваны. Інтэлігенцыя абвешчана па-за законам. За мінулае паўгоддзе былі фізічна ліквідаваны ўсе настаўнікі і ўрачы...

Алёшка ўсхвалявана захадзіў па пакоі, прыдумваючы, як падбадзёрыць Сунга. Тое, што яны чулі, нельга было вытлумачыць лагічна. Абодва не сумняваліся, што на гэты раз "закардоншчыкі" не падманваюць. І замест падбадзёрвання ў Алёшкі вырвалася :

— Што за канібалы вамі кіруюць?

— Будда вырашыў зведаць кампучыйцаў на трываласць і наслаў на іх чорных дэманаў, — апусціўшы галаву, сказаў Сунг.

З наступнага дня ён кінуў наведваць лекцыі. Калі Алёшка вяртаўся ў пакой, Сунг або маліўся, або, седзячы на падлозе, спяваў незразумелую песню, якую Алёшка вызначыў для сябе як плач па жывым нябожчыку. Сунг доўга цягнуў нейкую ноту, пляскаў у далоні, кланяўся на чатыры бакі з хуткімі прыгаворкамі і зацягваў новую ноту.

Калі стомлены Алёшка прасіў яго спыніць гэтае "мастацкае выццё" Сунг моўчкі перасаджваўся з падлогі на ложак, падгінаў пад сябе ногі, накідваў на галаву коўдру і працягваў ціха спяваць.

Праз два тыдні Сунга папярэдзілі з дэканата, што адлічаць, калі ён і далей будзе прапускаць лекцыі. Спалохаўшыся датэрміновага вяртання на радзіму, Сунг кінуў сваё спяванне і пачаў хадзіць на заняткі.

Пасля чарговага наведвання Сунгу закарцела зрабіць абажур для ляпмачкі ў пакоі.

— А то што за выгляд? — патлумачыў ён. Непрыгожа... Неэстэтычна...

Навастрыўшы аловак, Сунг з захапленнем пачаў маляваць звяроў на доўгай папяроснай паперы. У намаляваным ім карагодзе рушылі дзесяцікрылы цмок і заяц, слон з узнятым хобатам і лісіца, індык і тыгр, насарог і алень. Скруціўшы "звярыны" ліст у трубку, Сунг прымацаваў яго з дапамогай нітак і сашчэпак вакол лямпы.

Алёшка ўключыў святло — контуры звяроў пераскочылі на бледна-бэзавыя шпалеры.

Пстрыкнуўшы замком чамадана, Сунг дастаў некалькі металічных скрынак ды слоікаў з парашкамі. Паклаўшы на падлогу свінцовую пласцінку, ён разліў па яе паверхні ліловую вадкасць, запаліў палачку з сушаных траў і дзьмухнуў на яе. Ад мяккага вугалька на верхавінцы палачкі ўзвілася да столі бела-блакітнае полымя.

"Ці не збіраецца Сунг спаліць пакой?" — думаў Алёшка, лянiва сочачы за сябрам.

Белае полымя даткнулася да паляровага абажура — пачала раставаць у паветры папера. Задрыжалі адбіткі намаляваных звяроў на сценах. Раптам контур намаляванага тыгра заварушыў лапамі, пакруціў хвастом і падняў галаву.

— Сорак пакаленняў лекараў-чарадзеяў праклалі нябачны шлях Кампаданг, які бярэ пачатак у любой кропцы свету, а скончваецца на маёй радзіме, — сказаў Сунг, апусціўшы вочы да падлогі і склаўшы рукі на жываце. — Правесці гэтым шляхам можа чароўны тыгр, якога я выклікаў...

— Навошта?

— Каб ён адвёз цябе да маёй вёскі і назад. Распавядзеш, што там з маімі сваякамі. Аднойчы я ўжо хадзіў шляхам Кампаданга. Другі раз не магу. Ці не адмовіш у ласцы зрабіць гэтае падарожжа?

— Можна, — згадзіўся Алёшка, адчуваючы разам з тым незразумелы страх.

Сунг плескануў у далоні — намаляваны тыгр скочыў са сцяны на свінцовую пласцінку, і на тым месцы, дзе гарэла белае полымя, ператварыўся ў сапраўднага звера. Тыгр аддана паглядзеў на Алёшку, матлянуў галавой у знак пакоры і прысеў на заднія лапы. Абхапіўшы нагамі тыгрыную шыю, Алёшка так-сяк прымасціўся на звярынай спіне і знайшоў, што гэта надта нязручна.

Сунг зноў пляснуў у далоні, і тыгр адным скачком вылецеў з пакою, нават не разбіўшы шыбы.

— Мама! — закрычаў Алёшка, убачыўшы пад нагамі тралейбусы і пешаходаў.

Ён ухапіўся штосілы за вушы звера, які імчаўся над Мінскам на ўзроўні электрычных правадоў, але праз колькі часу зразумеў, што не трэба баяцца — той, хто рушыў шляхам Кампаданга, рабіўся нябачным і бесцялесным.

Тыгр праляцеў над плошчай Перамогі, ледзь не крануўшыся ордэнскай зоркі помніка. Яшчэ хвіліна — і Мінск застаўся ззаду. Унізе праносіліся пасёлкі, чыгуначныя шляхі, рэчкі і лясы. Страх прайшоў.

Яшчэ праз гадзіну бязмежныя палі змяніліся цёмна-жоўтым стэпам, а потым шэрай пустэльняй, за якой узвышаліся чырвона-бурыя скалы таямнічага Тыбету.

Чароўны тыгр узляцеў на такую вышыню, што Алёшка мог рукой дакрануцца да аблокаў. Яны пранесліся над вяровачным мастом, перакінутым між велічэзнымі камлыгамі гор. На шляху трапляліся такія вялікія пячоры, што здавалася, нібыта горы разявілі рот. Алёшка не на жарт перапалохаўся, калі чорная каменная вяршыня, якая здавалася непахіснай, раптам пакацілася ўніз і ад яе падзення скаланулася наваколле.

Праз гадзіну горы пачалі драбнець. Калі пачаліся джунглі, тыгр апусціўся на зямлю. Ад вільготнага паветра забалела ў грудзях. Дыхаць стала лягчэй, калі тыгр выскачыў з лесу і пабег над шырокай бурай ракой. З вады высунуўся кракадзіл і разявіў пашчу.

За ракой пачыналася ярка-зялёная раўніна. На беразе стаяў разбураны храм, каменныя тэрасы якога параслі пустазеллем. Храмавыя калоны, дах над якімі быў узарваны, здаваліся падобнымі да латухлых свечак. Калі тыгр прабег паўз руіны, Алёшка заўважыў на далёкім пагорку пагаду, слупы якой падтрымлівалі страху з загнутымі вуглямі. Далей цягнуліся рысавыя палі з пракаланымі каналамі, а за імі бачылася вёска, да якой і рушыў тыгр. Алёшка зразумеў, што менавіта там і жывуць бацькі Салот Сунга.

У паўсотні крокаў ад ускраіны вёскі чароўны тыгр спыніўся. Алёшка злез на зямлю і пайшоў сцяжынаю, уздоўж якой упоравень з галавой высілася цёмная трава з цвёрдымі сцяблінамі.

З густой травы выпаўзла на сцяжыну чорная змяя, якой захацелася пагрэцца на сонейку. Алёшка спакойна пераступіў праз яе.

Рухаючыся ўздоўж лясных зарасляў, Алёшка набліжаўся да ўскраіннага бамбукавага доміка, ды раптам з хмызняку, у пяці кроках ад яго, выйшаў салдат — маска абцягнута кавалкам маскіровачнай сеткі, а шнураваныя чаравікі падбіты лямцам, каб нячутна ступаць.

З джунгляў паказаўся салдацкі ланцуг, які паўколам ахопліваў вёску. Ззаду ішоў салдат з рацыяй за спінай. Пра тое, што побач з радыстам ідзе камандзір узвода, можна было здагадацца толькі па тым, што ён адзіны час ад часу аддаваў загады. Ніякіх знакаў адрознення на змятых гімнасцёрках Алёшка не заўважыў. Па загадзе салдаты спыніліся і знялі вінтоўкі з засцерагальнікаў. У вёсцы пачуўся плач дзіцяці.

— Наперад! — закрычаў камандзір.

Салдаты кінуліся на штурм соннай вёскі. Яны з лаянкай урываліся ў дамы і выганялі жыхароў у адной бялізне на вуліцу. Тых, хто спрабаваў абараняцца або затрымліваўся хаця б на хвіліну, забівалі на месцы.

Вяскоўцаў сагналі на плошчу, абкружаную з трох бакоў хацінамі і павецямі, ды загадалі сесці на зямлю. Падкраўшыся да павеці, Алёшка цікаваў з-за вугла і, хаця не ведаў чужой мовы, добра разумеў сэнс усяго, што гаварылі.

— Праклятыя прыслужнікі імперыялістаў! — закрычаў камандзір на сялян. — Нам дакладна вядома, што вы рыхтавалі змову супраць Агнкі! За гэта вы будзеце пакараны! Усе!

Ён падышоў да кораткага стрыжанага чалавека, які сядзеў з краю, абхапіўшы рукамі калені, і ўдарыў нагой.

— Тваё імя, сволач?

— Сін Салот, — стрымана адказаў чалавек, сухаватыя рысы твару якога нагадалі хлопцу твар Салот Сунга. — Я мясцовы лекар.

Нізкарослы салдат, які стаяў за спінай камандзіра, выцягнуў з рэчмяшка кароткую паліцу з жалезнымі шыпамі.

— Ты агент ЦРУ і КДБ! — зноў ударыў яго камандзір. — На цябе, прыслужнік імперыялізму, мы не будзем марнаваць патроны.

Нізкарослы салдат, зрабіўшы крок наперад, узняў паліцу і нанёс кароткі ўдар па галаве Сін Салота.

— Ты жонка гэтага савецкага шпіёна? — спытаў камандзір жанчыну, якая сядзела побач з лекарам.

Нізкарослы салдат па загадзе камандзіра раструшчыў жанчыне чэрап, а пасля двума ўдарамі забіў дзвюх дзяўчынак, што ў адчаі прыціскаліся да маці.

Алёшка адчуў, што губляе прытомнасць. Падаючы, ён засяродзіў увагу на расколіне ў бамбукавай сцяне, за якой хаваўся, потым усё перад вачыма нібыта заслалася туманам...

Апрытомнеўшы, хлопец здзівіўся — чаму зямля стаіць бокам, а дамы выцягнуліся гарызантальна? Ён сеў, памацаў галаву, адчуўшы, як моцна б'ецца жылка на скроні. Карнікі ўжо забілі ўсіх жыхароў вёскі. Над грудам мёртвых целаў, з якога тырчала катава паліца, кружыліся зялёныя мухі. Два салдаты, якім на выгляд можна было даць гадоў трынаццаць, успаролі цесаком жывот Сін Салота, вынялі печань, падзялілі і пачалі есці.

Разумеючы, што, калі застанецца тут яшчэ хвіліну, зноў паваліцца без памяці, Алёшка ўстаў і павалокся па сцяжынцы да таго месца, дзе чакаў тыгр. Узабраўшыся на спіну, хлопец абхапіў тыгра за шыю і ўткнуўся тварам у поўсць. Чароўны тыгр рушыў у адваротны шлях.

Алёшка настолькі быў уражаны ўбачаным, што не мог не толькі галавы ўзняць — нават вачэй расплюшчыць. Калі яны ўляцелі ў халодны струмень паветра, хлопец здагадаўся, што тыгр дасягнуў гор, калі ў патыліцу пякло сонца — разумеў, што звер ляціць над пустэльняй.

Алёшка падняў галаву, толькі калі тыгр ужо ляцеў над Мінскам.

Чароўны звер з седаком на спіне скочыў у адчыненае акно інтэрнацкага пакоя, Алёшка

(Працяг на стар. 12)

"КРУЦІ...", "ДЗЕ-Я"!

Кантамінацыя па п'есе Ф. Аляхновіча "Круці не круці — трэба памярці" і кнізе ўспамінаў "У кіпцюрох ГПУ" зазнала прэм'еру на сцэне драматычнага тэатра "Дзе-Я" 17 снежня 1995 года. Назва — "Круці..." На пачатку студзеня адбыўся яшчэ адзін спектакль. Перапынак (рэпетыцыі, тэхнічная работа) абвешчаны аж да лютага.

Між тым няма рэжысёра, які б так паслядоўна займаўся спадчынай вядомага драматурга, — няма такога рэжысёра, як Мікалай Трухан. Самым жа каштоўным у паслядоўным тэатральным звароце да неадназначнай Аляхновічавай спадчыны можна, бадай, лічыць... віхуру рэжысёравай фантазіі, запамінальныя вырашэнні вобразаў, выбудову адметнага сцэнічнага відовішча, дзе кожны складнік выяўляе развіццё або рух цэлага... І так далей, і да таго падобнае. Труханава праца над творамі Аляхновіча ўжо пачынае выдаваць на энцыклапедычную. Калі можна сабе ўявіць энцыклапедыю ў вобразах ды эмоцыях. Зрэшты, праз месяц "Дзе-Я" запрашае нанова ацаніць вартасці пастаноўкі, дзе сумясціліся рэаліі ды ірэаліі, недалёкае мінулае і адвечнае народнае ўяўленне пра існасць, трактаванне яе з пазіцый чалавека нашага стагоддзя і змяшэнне прыкмет эпох ды часінаў... Усё гэта на сцэне ажыццявілі І. Падлівальчаў (яму ж давялося займацца сцэнаграфіяй і касцюмамі разам з Т. Гузоўскай ды Ю. Назулькам), І. Нікалаеў, Г. Чарнабаева, Т. Міронава, Т. Папова, С. Яцэвіч, А. Якаўлеў, А. Радкевіч, Г. Гатоўчыц. Тое, што тэатр усё яшчэ падтрымлівае і ўтрымлівае горад Мінск — упраўленне культуры Мінгарвыканкама — дае спадзяванні на лепшую будучыню, а менавіта — што прэм'еры выпадуць не на адзін люты месяц.

Ж. Л.

На здымках: Г. Чарнабаева (Смерць) і Т. Міронава (Люцыпар).

Фота Аляксея МАЦЮША

ПРА ДЗЕДА МАРОЗА І ЛЕСУНА

Нашы дзеці добра ведаюць, хто такі Дзед Мароз. Сапраўды, гэта такая казачная істота, якая ўвасабляе мароз у выглядзе дзеда з доўгаю сівой барадой, у кажуху, зімовай шапцы, з кіем у руцэ, з мяшком падарункаў за плячыма. Дзед Мароз любіць толькі добрых, паслухмяных і шчырых дзяцей. У Навагоднюю ноч і на Каляды ён прыносіць ім свае падарункі. Але ці ведаюць нашы дзеткі, хто такі Лясун? Ведаюць, ды не ўсе. А Лясун — гэта таксама казачная істота...

Пра Дзеда Мароза, Лесуна, Снягурку, Феюдабрадзею, Ваўка і Зайца напісала Людміла Рублеўская. Увасобілі п'есу на сцэне артысты Слонімскага беларускага драматычнага тэатра пад кіраўніцтвам заслужанага работніка культуры Беларусі Мікалая Варвашэвіча. Спектакль мае назву "Дзед Мароз і Лясун".

Ролю Дзеда Мароза сыграў артыст Віктар Шчарбакоў. Яго герой атрымаўся разважлівым, спакойным і добрым. А вось вобраз Лесуна, які захацеў у лесе стаць Дзедам Марозам і захапіў мяшок з падарункамі, выдатна стварыў Уладзімір Навумік.

Сяргей ЧЫГРЫН

На здымку: сцэна са спектакля.

Музыка

АВАНГАРД? ГЭТА ЁМІСТА!

Адбыліся XV Міжнародныя кампазітарскія курсы, якія штогод ладзіць Польскае таварыства сучаснай музыкі. Пабываў на іх і прадстаўнік Беларусі — Аляксандр Літвіноўскі.

— Нягледзячы на тое, што шапікі напакаваны сёння мноствам размаітых выданняў, нашы суайчыннікі, неабыякавыя да падзей культурнага свету, часцяком наракаюць на інфармацыйны голад. А замежныя ўражанні творчых людзей — гэта заўсёды глыток свежай інфармацыі для чытачоў. Аляксандр, калі ласка: вашы ўражанні пра міжнародную музычную імпрэзу ў Польшчы...

— Такія курсы для кампазітараў ладзяцца штогод, збіраючы не толькі маладых творцаў, але і тэарэтыкаў музыкі, музыколагаў, студэнтаў. Сярод сусветных знакамітасцяў, якія тут пабывалі ў якасці выкладчыкаў, — Яніс Ксенакіс, Анры Пусэ, Клаус Губер, Луіджы Нона, Марк Капытман, Майкл Найман, Вітальд Лютаслаўскі, Кшыштаф Пендэрэцкі...

— З Пендэрэцкім вам пашчасціла пазнаёміцца пазалетась, на гэтых жа курсах, у Казімежы Дольным...

— Так. А вось на гэты раз, хаця курсы фундаваліся Міністэрствам культуры і мастацтва Польшчы, удзельнічалі спонсары з брытанскага і французскага бакоў, — месца імпрэзы было перанесена з казачнага сярэднявечнага мястэчка Казімежа Дольнага ў горад Беласток. Тут працуе філіял Варшаўскай акадэміі імя Шапэна і да таго ж ёсць традыцыя правядзення музычных семінараў. Што датычыць міжнародных кампазітарскіх курсаў — кожны раз яны прысвячаюцца пэўнай тэме. Скажам, курсы, на якіх мне давялося пабываць пазалетась, прысвячаліся музыцы кіно і відэа. Цяпер тэма фармулявалася так: "Голас чалавечы як музычны інструмент". Я ж апошнім часам — так надарылася — скарыстоўваю ў асноўным гэты "інструмент", голас чалавечы: як у множным ліку, так і ў адзінкавым.

— Сапраўды, харавой музыкай вы займаецеся надзвычай плённа і рознабакова: кантаты "Вяселле", "Зборная суботка", Імша для мужчынскага хору, песні на тэксты з "Малітоўніка" ксяндза Станкевіча, і гэта яшчэ не ўсё. Ёсць і містэрыя "Францыск", дзе важкая роля адведзена басу сола...

— Мабыць, вось гэтая праца, "Францыск", найбольш адлавядала тэме курсаў, прысвечаных голасу не ў звыклым, а якраз у нетрадыцыйным, авангардным разуменні гэтага "інструмента". Для ўдзельнікаў заняткаў была нібыта рэстаўравана добра забытая авангардная стылістыка з выкарыстаннем голасу, стылістыка 50—60-х гадоў. І для новай генерацыі кампазітараў мела вялікую цікавасць і карысць — знаёміцца, кантактаваць непасрэдна з тымі творцамі, якія займаліся ў 60-ыя гады менавіта гэтай праблематыкай.

— Хто ж тыя людзі?

— Напрыклад, Дарэл Рансуік, англійскі кампазітар, мультыінструменталіст, наогул асоба неардынарная, бо сумяшчае ў сабе дужа багата разнастайных прафесійных аспектаў творчасці. Ён і цудоўны спявак, аранжыроўшчык, кантрабасіст, джазмен, прадзюсер... Раз-пораз ён мяняў, разнастаіў формы сваёй прафесійнай дзейнасці. Скажам, быў адным са стваральнікаў вядомага калектыву "Электрафенікс". Калектыў якраз і знаны тым, што ў яго партытурах з'яўляліся гукі нетрадыцыйнага галасавога здабывання, гэта ўжо факт культуры.

З Дарэлам Рансуікам у мяне склаліся вельмі цёплыя адносіны. Мне ён падараваў два свае кампакт-дыскі, дзе ёсць музыка для ансамбля харыстаў, пераважна авангардная, музыка шумавая; ёсць опусы інструментальныя. Усё неверагодна цікава: стылёвая ігра, выкарыстанне старадаўніх мадзяляў, поўная свабода ў выбары стыляў, у іх камбінацыі, плюс чыста англійскі халаднаваты гумар і, канечне, дзівосная эстэтызаванасць, выпанчанасць усяго гэтага.

Дарэл прысутнічаў на курсах усе два тыдні, праводзіў індывідуальныя заняткі, групавыя лекцыі. Яны не былі лекцыямі ў традыцыйным разуменні: было практычнае навучанне тым тэхнічным магчымасцям галасавой палітры, якія выкарыстоўваліся ім ва ўласнай творчасці. Гэта была... майстэрня Рансуіка! Усе ўдзельнікі семінараў — а нас было дзесятка паўтара, з Англіі, ЗША, Японіі, Польшчы, Чэхіі, Аргенціны, — развучвалі, а пасля прадстаўлялі на канцэрце яго вядомую "Mouth Symphony" ("Ротавую сімфонію"). Праўда, выдавец-прадзюсер забараніў гэтую назву, палічыў яе непрыстойнай, таму на кампакт-дыску твор называецца "Voice symphony" — "Галасавая сімфонія". Але аўтар лічыць, што перайменаванне зніштажае саму задуму твора, так што ў вакальнага гуказдабывання. Ну, а я ж бачу, што сучасны кампазітар не можа замыкацца толькі на гэткай пазіцыі нетрадыцыйнага наватарскага гуказдабывання, вынайдзенай 20 гадоў таму. Цяпер мы можам выкарыстоўваць нейкія элементы — гэта ўзбагачае палітру любога адукаванага кампазітара. Вось у нас ёсць цудоўны вакальны ансамбль "Камерата", які выкарыстоўвае менавіта блізкую да захапленняў Дарэла стылістыку. Наогул, у нас нямала блізкага! У ягонай п'есе для фартэпіяна і магнітафоннай стужкі, напрыклад, дзе ёсць дзівосныя спалучэнні жывога тэмбру фартэпіяна, нейкай рамантычнай стылізацыі — і фонавых знаходак, я адчуў творчую роднаснасць, дзівосныя супадзенні з тым, што ёсць у маёй п'есе "Збег". Калі ж Дарэл паслухаў фрагмент майго "Францыска", ён выказаў і разуменне, і прыхільнасць да гэтай працы.



Беластоку на канцэрце мы выконвалі яго пад арыгінальнай назвай. А яшчэ пад кіраўніцтвам Рансуіка ўсе "курсанты" пісалі аналагічныя канцэптуальныя п'есы, пабудаваныя на шумах, на распяванні складоў.

Ну, а пра самога Рансуіка можна расказваць бясконца! Ягоныя творы сёння гучаць на оперных сцэнах, у канцэртных залах, на ТБ і ў кіно. Ён шмат часу аддаў працы з дзецьмі. А цяпер ён — прафесар кампазіцыі ў "Трынці-коледж мюзік" у Лондане. Яго вядомая кніжка "Рок, джаз і поп арэнджынг" перакладзена на японскую, нямецкую...

— У кожнай сферы дзейнасці чалавечай ёсць, вядома, і рамеснікі, і творцы, ёсць Майстры. А ў кожнага майстра ёсць "фірмовыя" сакрэты, якімі ён можа ні з калегамі, ні з вучнямі, ні з сынамі роднымі да канца не падзяліцца. І калі вы, Аляксандр, гаворыце, што майстар музычнай творчасці падчас курсаў дзеліцца сваімі прафесійнымі сакрэтамі, раскрывае толькі яму вядомыя спосабы працы з гукам, з голасам, — я не магу даўмецца, ці сапраўды ён выдае ўсё, дапускае тыражаванне? Ці тут спрацоўвае адмысловая мудрая шчодрасць майстра, які гатовы падзяліцца ўсім, бо ўрэшце застанецца тое "нешта" — непаўторнае, непераймальнае, — якое робіць яго майстрам і пазначае індывідуальнасць?

— Пэўна, я не ў той ужо ўзроставай кандыцыі, каб асабліва цікавіцца чужымі сакрэтамі... Для мяне творчасць Рансуіка ніякіх сакрэтаў і не ўтойвае. Я проста разумею, што там, перш за ўсё, ёсць талент, — вось што важна. А ўся астатняя "канструктарская" дзейнасць зразумелая, бо яна цалкам прафесійная, падпарадкоўваецца пэўнай кампазітарскай логіцы — і ўсё. Але ж майстар выклікае захапленне, бо ён відавочна таленавіты нават у вельмі простых, немудрагелістых рэчах. Там ёсць іскра Божая!

Сам ён, дарэчы, абагаўляе творчасць найвядомага амерыканца Джона Кейджа, якога ведаў асабіста. І лічыць, што той меў сапраўдную рэвалюцыйную пазіцыю ў адносінах

А ведаеце, што самае цікавае? Дарэл Рансуік прыязджаў у Мінск! Ён расказваў пра пастаноўку сваёй оперы ў дзіцячым тэатры...

— А! Вось цяпер я ўспомніла, дзе ўпершыню пачула гэтае прозвішча. У 1992-м ён працаваў разам з нашым рэжысёрам Цюпам над спектаклем "Чараўнік". Гэта было на сцэне тэатра музкамедыі, з удзелам каля 200 дзяцей. Іхняя творчасць, паводле ідэі аўтара, спалучалася з ягонай музыкай. З англійскай музыкай спляталася беларуская мова! Поруч з маленькімі артыстамі ды мастакамі і дарослыя ўдзельнічалі: дырыжор Глеб Аляксандраў, рэжысёр Вячаслаў Цюпа, сцэнограф Уладзімір Жданаў, артыст Герман Казлоў...

— ...І Дарэл увесь час пра гэты спектакль з прыемнасцю ўспамінаў.

— Прадоўжым, аднак, пра вашы беластоцкія знаёмствы.

— Адно з цікавых — Вітальд Шалёнэк, вядомы кампазітар, можна сказаць, польска-германскі, бо апошнія 25 гадоў жыве ў Нямеччыне, выкладае ў Вышэйшай школе музыкі. Некалькі гадоў таму ў нашу кансерваторыю прыязджала дзлегацыя з Заходняга Берліна, быў канцэрт, дзе госці гралі знаны твор Шалёнэка — яго цыкл вытанчаных апрацовак фальклорных песень. Аўтар — чалавек немалады і асоба гістарычная, кола яго сяброў — гэта майстры 50—60-х, Луіджы Нона, Барбер, Пендэрэцкі... Ён прысвячаў свае лекцыі праблемам санарызму і голасу чалавека як музычнаму інструменту. Прадстаўнік старэйшай генерацыі, ён, мне здаецца, не можа ў пэўных пазіцыях адпавядаць сучаснаму моманту: калі выходзіш за межы ўжо звыклай для яго культуры мадэрнізму, робіш крок убок, то ён можа цябе ўспрымаць як хулігана, а твор — як штось "немажліваслухальнае". Прынамсі, мяне і "злавіў" на тым, што ў маёй гітарнай "Інтавалатуры" надта жорсткія стылёвыя "мантажы".

Вітальд Шалёнэк вельмі любіць Стравінскага. І Шалэна, пра чые опусы для аркестра пераканальна гаварыў, што гэта "не шалэнаўскія" опусы, бо Шалэн — гэта санарыстычны фартэпіянны кампазітар...

— Значыць, курсы не абмяжоўваліся гаворкай пра "чалавечы голас як інструмент"?

— Вядома! Гэта былі сустрэчы з музычным авангардам у самых розных праявах. У нас выкладаў, напрыклад, кампазітар з Францыі Клод Лефеўр, вучань Дарыюса Міё і П'ера Булеза. Ён займаўся электраакустычнай музыкай, мае ўласную студыю. Ведаеце, якое ў яго званне? "Афіцэр мастацтваў"! Цудоўны, зычлівы чалавек, надзіва шчыры, адкрыты, як, відаць, тыповы француз. Яму надзіва ўсё, як моладзь кажа, "фіялетава": хто б што ні прынёс для паказу — усё добра, малайчына, працуй далей! Паслухаўшы майго "Францыска", сказаў штосьці накшталт "Клёва, чувак!" — і мы абмяняліся адрасамі... Ну, а сам Лефеўр падтрымлівае ў французскай музыцы тэндэнцыю, якая мае карані ў творчасці ранняга мадэрну, вобразныя сферы якой звязаны, напрыклад, са светам прыроды, жывёл, птушак. У творчасці ён выкарыстоўвае і многа праграмнай паэзіі, якая нясе сузіральныя адчуванні (досыць традыцыйная французская паэзія). Разам з Лефеўрам прыехала ягоная жонка Інге Борг. Яна займаецца менеджментам і

сувязямі ў Еўрапейскім цэнтры, таму прапанавала лекцыю "Нараджэнне і смерць фестываляў".

Яшчэ адна асоба — Марцін Брэзнік, ЗША. Надзіва дэмакратычны чалавек, амерыканец у тым разуменні, у якое мы ўкладаем усё лепшае: камунікабельны, адкрыты, інтэлігентны, адукаваны. Ён прафесар Іельскага універсітэта, на курсах быў мадэратарам, г.зн. аб'ядноўваў усе праграмы, меў і свае індывідуальныя заняткі, лекцыйная гадзіны. У яго ўласнай інструментальнай творчасці няма так званай "еўралейшчыны". Што пад гэтым разумець? Руцінную абцяжаранасць, залежнасць ад артадаксальнага мінулага. Дык вось, цяпер у амерыканскай музыцы ёсць прывабны новы свежы погляд на рэчы, няма залежнасці ад нейкіх узораў і стандартаў нямецкай школы, якая ўсё-ткі — "заканадаўца мод" у Еўропе.

— Аляксандр, а як амерыканскі калега ўспрыняў вашу музыку?

— Ён быў асабліва ўражаны... магчымасцю выкарыстоўваць сімфанічны аркестр! У ЗША такога нейк не назіраецца.

— Мабыць, гэта звязана з тым, што запрашэнне аркестра не танна каштуе для аўтара?

— О, у іх за ўсё трэба плаціць! Для іх нават запіс камернага складу на ТБ, у радыёстудыі — шалёныя грошы! І гэта аплачвае спонсар, як правіла, або універсітэт, або нейкія суполкі, — словам, там гэта ўсё надзвычай сур'ёзна і вельмі дорага. Музыка ж некамерцыйная, даходу яна не прыносіць, таму ўсё жыве-трымаецца на любові да мастацтва.

Між іншым, карані Брэзніка — у Беларусі, ягоная маці родам з-пад Пінска. Ён зусім сур'ёзна збіраўся туды ў хуткім часе наведацца, нават прасіў мяне паспрыяць у афармленні дакументаў. Ніякавата было тлумачыць, на якім узроўні правяцца ў нас такія працэдуры...

— Удзельнікамі беластоцкай імпрэзы былі не толькі творцы і музыколагі, наколькі я ведаю?

— ...І, думаю, не толькі на мяне асаблівае ўражанне зрабіла выдатная спявачка з Германіі Зігун ван Остэн. Яна — з ліку самых знаных вакалістаў XX стагоддзя, якія спецыялізуюцца на выкананні менавіта музыкі нашага часу. Многія кампазітары спецыяльна пісалі для яе. Яна супрацоўнічала з такімі асобамі, як Джон Кейдж, Эдзісон Дзянісаў, Крыстабаль Халфер, Луіджы Нона, Кшыштаф Пендэрэцкі. Аліўе Месіян лічыў Зігун лепшай інтэрпрэтатаркай ягоных твораў. Яна выканала мноства прэм'ер як у канцэртах сучаснай музыкі, так і на опернай сцэне (напрыклад, "Лулу", "Воцак" — у Штутгарце, Парыжы, Мадрыдзе, Лісабоне).

— А які быў ейны чын у Беластоку?

— У Беластоку... Яна мяняла ўборы, вельмі эфектныя, трэба сказаць... А калі сур'ёзна — у яе былі індывідуальныя і лекцыйныя заняткі, бо Зігун ван Остэн — майстар высокага класа, практык, які цудоўна ведае дыяпазон, спосабы гукаатрымання ў вакале. Яна і канцэрт давала. Рэпертуар быў сучасны. Гэта, я вам скажу, тэатр! Тэатр аднаго акцёра, усё што хочаце — толькі не спевы ў традыцыйным разуменні.

— Вакал там ёсць?

— Вакал там ёсць, але вакал нетэмпераваны, не канкрэтнай вышыні. Гэта тэатр голасу, гэта маналогі, прычым у сукупнасці, скажам, з якойсьці стужкай шумавой. Уражанне моцнае, бо ў яе вельмі ярка выяўлены сугестыўны дар, апроч таго, яна была ашаламляльна апранута — адзенне з нейкімі бразготкамі, усё блішчэла, звівалася. Хударлявая постаць, патлатая прычоска, вар'яцкія вочы, гэтыя галашэнні, усхліпы, сіпенне, — абсалютна ўся палітра перажыванняў чалавека: ад агрэсіі да замілаванасці, ад нейкай істэрычнасці да вялікай трагедыі, і ўсё гэта ў руху...

Такой культуры ў прынцыпе ў нас няма, і было б вельмі цікава гэтым заняцца. Зігун паслухала майго "Францыска", запрасіла ў Дармштат (які яна лічыць цэнтрам Сусвету!), прапанавала напісаць для яе п'есу. З вялікім задавальненнем зрабіў бы гэта. Проста патрэбны час і магчымасці для такой працы, а я пакуль заняты іншым.

— Зразумела. Візіт у Дармштат адкладваецца. Але ж мінулым летам, я ведаю, вы ў Германіі пабывалі — на сусветным форуме...

— Імпрэза была сапраўды салідная. Існуе сусветная арганізацыя — Асацыяцыя сучаснай музыкі, з цэнтрам у Амстэрдаме. Яна рэгулярна праводзіць фестываль "Дні сусветнай музыкі". Фестываль аб'ядноўвае сілы краін-удзельніц з усяго свету і штогод дае магчымасць прэзентаваць апошнія дасягненні сучаснай музыкі ў розных яе праявах. Летась месцам правядзення гэтай буйной акцыі быў горад Эсэн. У Германіі, мне падалося, не існуе паняцця "правінцыя". Кожны з гарадоў — развіты культурны цэнтр. Гарады размешчаныя непадалёк адзін ад аднаго, шчыльна, ствараючы як бы гіганцкі мегаполіс. Таму сетка фестывальных канцэртаў закранала і прадмесці, і суседнія Эсэну гарады Дуйсбург, Дортмунд.

Вядома, сучасная музыка — катэгорыя ёмістая, сюды можна ўключыць амаль усе з'явы, што маюць месца ў свеце музыкі наогул. У постмадэрнісцкі час, калі абагульняюцца і пераасэнсоўваюцца вынікі пошукаў у авангардной музыцы як традыцыі, галоўнай яе характарыстыкай робіцца перш за ўсё разнастайнасць.

— Напэўна, галоўнае ў вашых уражаннях таксама — разнастайнасць?..

— Вось калі ў свой час нам настойліва гаварылі пра крызіс буржуазнай культуры, дык нас, як мне цяпер падаецца, не зусім ашуквалі. Ён ёсць. Бо як і кожная галіна культуры, музыка — неаднастайная. Яна падобная да ракі з вірамі, хвалямі, але не без балотных затокаў. Плынь яе часам бывае зусім павольная, але ўрэшце рух усё ж такі ёсць. Праграма фестывалю дала магчымасць гэта адчуць. Яна была каласальная! За два тыдні — каля 30 канцэртаў. Прычым аніводная канцэртная пляцоўка не паўтарала іншую, нават у літаральным разуменні: ад класічных канцэртных залаў, раскошных оперных тэатраў — да катакомбаў, камнябойняў ды фабрычных цэхаў.

Сучасная музыка ёсць сучасная музыка, і арганізатары мелі на ўвазе момант сатворчасці, калі сам інтэр'ер трактуецца як частка творчага акта, выконваючы пэўную эстэтычную ролю. А ў Германіі вельмі модны постіндустрыяльны стыль, неад'емная частка якога — выкананне твораў на аб'ектах, якія былі сродкамі вытворчасці. Вельмі важны для арганізацыі такіх канцэртаў індустрыяльны антураж старых заводаў, фабрык, шахтаў. А нямецкі стыль пабудовы такіх аб'ектаў пачатку стагоддзя досыць мастацкі, бо калі будавалі, да прыкладу, фабрыку, то звярталіся да выдатных архітэктараў. Так што будынкі падаюцца архітэктурнымі помнікамі, гэта вельмі гарманічныя канструкцыі, якія выклікаюць сапраўды мастацкія ўражанні.

— І як пачувалася ў такім антуражы публіка?

— Было цікава назіраць! Публіка ўяўляла з сябе каларытную сумесь з тыповых буржуа ў раскошных "прыкідах" і самага дэмакратычнага люду, і ўсе яны аднолькава караскаліся да сваіх месцаў у цэхах ці шахтах ды пэцкаліся ў вугальным пыле. Адзін з канцэртаў праходзіў увогуле ў гіганцкай нафтавай цыстэрне, якую відаць за некалькі кіламетраў, калі едзеш па дарозе. Там дастаткова аднаго інструмента, каб атрымаць эфект цэлага сімфанічнага аркестра, і пад такую акустыку быў зроблены адмысловы музычны праект!

Наогул, кожны з канцэртаў базаваўся на пэўнай ідэі. Напрыклад, ладзілася серыя "Электронная раніца". Трэба было выязджаць вельмі рана ў адно з прадмесцяў Эсэна, дзе ў суперабсталяванай квадра-студыі музычнага каледжа праходзілі самі дзействы. Тут улічвалася, што зранку, са сну чалавек па-іншаму ўспрымае музыку, бо звычайна ж мы канцэрты наведваем увечары...

— У вас, як стваральніка ўласных электронных кампазіцый, быў, пэўна, асаблівы інтарэс?

— Я пераканаўся, што разуменне тэрміна "электронная музыка" там трохі адрозніваецца ад нашага. У асноўным заходніх кампазітараў цікавіць найперш тэхнічны патэнцыял развіцця гэтага музычнага напрамку, таму ўласна музыкі там практычна няма. Ёсць што заўгодна, перадусім разнастайныя шумы ды тэхнічная апрацоўка шумавых эфектаў, як, напрыклад, складанне паводле спектра акустычных гукаў альбо наадварот, пошук новых электронных гукаў, маніпуляцыя імі, камбінаванне гукавых плыняў, кампіляцыя з канцэптуальнымі ўкрапінамі, — вось такія электронныя кампазіцыі ўзору 95-га года. Што да нацыянальных прыкметаў... Можна прыйсці да высновы, што немцы ў гэтым сэнсе болей постіндустрыяльныя, чым хто іншы. Ім уласціва куды больш механістычнасці, чым прадстаўнікам іншых краін, у якіх нават скарыстоўваліся гукі фартэпіяна!

— Аляксандр, калі ласка, крыху пра іншыя праграмы.

— Шэраг кампазітараў, чыя музыка гучала там, быў шырокі і разнастайны. Чарлз Айвз, Луіджы Нона, Джордж Крамб, Генры Коўэл, Эдгар Варэз, Арнольд Шонберг, Яганес Брамс, Густаў Малер, а яшчэ Бетховен, Вердзі, Шуберт... Думаю, вельмі мудра было з боку арганізатараў украпваць у праграмы канцэртаў музыкі XX стагоддзя творы рамантыкаў, класікаў мінуўшчыны. Суседнічалі розныя імёны. "Матэты" Габрыэлі ў апрацоўцы Бруна Мадэрна, пераасэнсаваныя для сімфанічнага аркестра, — тонка зроблена, апафеоз прыгажосці, чысціні, арганічнасці і гармоніі. Я сам працую ў аналагічным напрамку, лічу гэта адным з найцікавейшых шляхоў у развіцці музыкі — зварот да аўтэнтычных вытокаў ды іх санарыстычнае пераасэнсоўванне.

На фестывалі былі прадстаўлены ўсе нацыянальныя школы — ад Еўропы да Амерыкі, былыя камуністычныя краіны таксама прысутнічалі. З іх асабліва ўразіла Албанія: нядаўна была адной з самых моцных таталітарных дзяржаў, а цяпер вельмі актыўна развіваецца ў авангардным напрамку, і тамтэйшыя кампазітары досыць упэўнена пачуваюцца на Захадзе.

— Чым жа радаваў Захад?

— Расказаць ёсць што. З'ехаліся лепшыя калектывы з усяе Еўропы — з Германіі, Францыі, Нарвегіі, а вянчаў імпрэзу аркестр Бі-Бі-Сі. Былі вялікія сімфанічныя гала-канцэрты. Канцэрт пад назвай "Ionisation" прадстаўляў амерыканскую музыку — Эдгар Варэз, Джон Адамс, Джордж Крамб; французскую — Артур Анегер; ізраільскую — Чаі Чырвонін, а таксама уверцюру Рыхарда Вагнера да оперы "Золата Рэйна": тыповы ўзор мінімалізму ў мастацтве, які лічыцца знаходкай 70-х гадоў нашага стагоддзя і мо таму ўспрымаецца вельмі сучасна і свежа. Асабліва свежа прагучала ў прапанаваным кантэксце музыка геніяльнага Варэза. Джон Адамс — таксама моцнае ўражанне: дасканалае валоданне прафесіяй, калі музычны мінімалізм даводзіцца да буйной мастацкай з'явы, гэта не надакучвае, гэта не прэсна. Маніфестацыйны урбанізм першай паловы стагоддзя — Артур Анегер, "Pacific-231", п'еса для сімфанічнага аркестра, з якой, скажам так, паўстае вобраз цягніка: нараджэнне і развіццё руху, хуткасць, кульмінацыя і прыпынак. Напісана ў 1923 годзе, а гучыць вельмі сучасна! Не магу абмінуць Вальтэра Цымермана, вельмі вядомага і моднага сёння нямецкага кампазітара, які прадстаўляў новы твор "Diastema" для двух аркестраў і аднаго дырыжора. І яшчэ вельмі папулярны цяпер кампазітар — Ташыо Хакасава, назва ягонага твора "Super Flumina Babylons" сталася нібы яднаючай для серыі канцэртаў.

У праграмах камернай музыкі гучала багата твораў нямецкіх кампазітараў, альбо тых, хто прайшоў гарніла Дармштацкай школы. Гэтая школа, я сказаў бы, артадаксальнага напрамку, бо стыль надзіва чысты і ў той жа час пазаасобасны. Да 95-га года яны захавалі непарушныя догмы, сфармуляваныя апалагетамі Дармштата 50-ых — Штокгаўзенам і "кампаніяй". Такую музыку пішуць і цяпер, яна лічыцца актуальнай і паводле яе вымяраюцца чысціня і сучаснасць гучання.

— Амаль тры дзесяткі "авангардных" канцэртаў — цяжка. Нават для прафесійнай эліты. А публіка вытрымлівала?

— Здавалася б, канцэрты, на якіх гучыць сучасная, авангардная музыка, скіраваныя на спецыфічную аўдыторыю, але склад фестывальнай публікі, як я ўжо казаў, быў вельмі стракаты. Было шмат аматараў музыкі, менавіта аматараў, а не прафесійных музыкантаў; журналісты, багема... На многія з канцэртаў, асабліва ва ўікэнд, трапіць было немагчыма. Апошні канцэрт прайшоў пад адкрытым небам, сабраў неверагодную колькасць публікі і доўжыўся ўсю ноч да ўсходу сонца. Людзі з вялікай ахвотай аддаюць свой вольны час мастацтву, гэта прыемна здзівіла ды прымусіла прыгадаць нашыя амаль пустыя залы. Прычым, асаблівай рэклямы фестывалю не было. Тут, відаць, праява прывілеяванасці, сацыяльнай абранасці, прэстыжнасці і, напэўна, большай адукаванасці насельніцтва.

— Дзякуючы вашым германскім уражанням, Аляксандр, мы зрабілі такі пазнавальны экскурс і ледзь не забыліся пра Беласток. А там, дарэчы, публіка была?

— Так, апроч удзельнікаў і гасцей курсаў, на канцэрты наведваліся слухачы, пераважна з ліку выкладчыкаў і студэнтаў Акадэміі музыкі. Але ажыятажу не было.

— Вядома, гэта ж не фестываль, а прафесійныя заняткі... А прызнайцеся: з лекцый збягалі? Жыццём Беластока пацікавіліся?

— Ой, беднаватае мястэчка!.. Я там ездзіў толькі па адным маршруце, але пашанцавала, што маю сяброў, якія мяне прытулілі, паказалі, напрыклад, мясцовыя саборы. Я адчуў, што гэта — не зусім Польшча, было вельмі дзіўнае адчуванне: навошта тут мяжа і такая жорсткая мытня? Але і тое, што гэта Беларусь, я не адчуў, на жаль. Там мноства надпісаў чамусьці па-руску, што мяне вельмі ўразіла. На рускай мове!!! Напрыклад, наконт штрафу за безбілетны праезд. Або — рэклама дываноў... Затое ў Беластоку я сустрэў удзельніка яшчэ мінулых курсаў — Даніеля Лужко! Ён беларус... з Уругвая! Але цяпер жыве ў Вашынгтоне. Дзядзька ў яго ў Брэсце, а вось продкі самога Даніеля эмігравалі досыць даўно. І ад беларуса ў яго хіба толькі бялявая чупрына, "сялянскі" твар і прозвішча. Спяшаўся ў Вашынгтон, рабіць доктарскую працу.

— А вы вярнуліся на радзіму і збіраецеся...

— У мяне шмат творчых праектаў, і "дома", і звязаных з прапановамі замежных калег. Забягаць наперад і штосьці гаварыць канкрэтна не люблю. Зробленае — гучыць. А працаваць на самую бліжэйшую перспектыву даводзіцца багата.

— Дай вам Бог на ўсё гэта сілы і здароўя, бо галоўнае ён вам ужо даў...

С. БЕРАСЦЕНЬ

Фота С. ЛАБАНДЗІЕЎСКАГА

ЗАВІТАЛІ Ў ЛІДУ

Перад навучэнцамі Лідскага музычнага вучылішча выступілі госці з Мінска — лаўрэат міжнародных конкурсаў кларнетыст Генадзь Забара і лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя Чурлёніса піяніст Алег Крымер.

Цікавай аказалася праграма іх канцэрта. Мяркуйце самі: Саната французскага кампазітара XVIII стагоддзя Дэўена і Варыяцыі на тэмы ранніх опер Вердзі нямецкага кампазітара XIX ст. Паўдэрта, Саната Шуберта для арпеджыоне і Пяць танцавальных прэлюдый сучаснага польскага кампазітара Лютаслаўскага. Ансамблевую ігру дапаўнялі сольныя выхады Алега Крымера, які іграў Гайдна, Шапэна. На "біс" была выканана п'еса француза мяжы XIX—XX стст. Дэлюна "Вецер, які плача". Такім чынам, слухачы пазнаёміліся з цэлым шэрагам аўтараў, якія рэдка гучаць.

Далёка не кожны мае ўяўленне пра арпеджыоне. Генадзь Забара расказаў гісторыю вынаходніцтва гэтага дзіўнага гібрыда віяланчэлі і гітары венскім майстрам І. Штауферам у 1823 годзе. Шуберт захапіўся незвычайнымі выяўленчымі магчымасцямі новага інструмента. Для нас жа важная тая акалічнасць, што беларускія музыканты вярнулі да жыцця паўзабытую шубертаўскую музыку.

Дуэт Забары і Крымера ўзнік пяць гадоў таму. У яго складзе — дзве яркія індывідуальнасці. Забару ўласцівы камерная манера ігры, тонкае адчуванне стылю твора, бездакорная філіроўка гуку, бліскучая тэхніка. Крымер — больш імпульсіўны, ён шукае і знаходзіць "энергетычныя кропкі" кампазіцыі. Менавіта ў спалучэнні класічнай стрыманасці першага і рамантычнай парывістасці другога — сакрэт прыцягальнай сілы іх мастацтва.

Пасля канцэрта мы пагутарылі з артыстамі. Сапраўдныя прафесіяналы, яны лічаць сваім абавязкам іграць усюды — у сельскай мясцовасці, у раённым ці абласным цэнтры — і іграць як мага лепш! Не па грошы і не па славу яны едуць у правінцыю. Імі кіруе ідэя служэння музыцы. Адзін мудры чалавек сказаў: дзе пачынаюцца грошы, там канчаецца мастацтва. Нашы музыкі цалкам падзяляюць гэтую простую думку. Дзе жартам, а дзе ўсур'ёз яны ўдзячныя Богу, што той не зрабіў іх багатымі. Такое маральнае аблічча гэтых разумных і таленавітых людзей!

Назаўтра яны прадоўжылі гастролі па Гродзенскай вобласці...

В. РАДЗІЁНАЎ,
старшыня Асацыяцыі кампазітараў Гродзеншчыны

"СВІРЫДАВУ ПРЫСВЕЧАНА"

У Беларускай акадэміі музыкі адбыліся навуковыя чытанні з музычнымі інтэрмедыямі "Свірыдаву прысвечана" (да 80-годдзя з дня нараджэння), у якіх актыўны ўдзел узялі педагогі, асістэнты-стажоры, студэнты. Канферэнцыю арганізавалі дзве кафедры БАМ: тэорыі музыкі (галоўны арганізатар і натхніцель чытанняў дацэнт Т. Цітова) і кафедра харавога дырыжыравання на чале з дацэнтам А. Зелянковай. (Пад яе кіраўніцтвам былі напісаны даклады асістэнтаў-стажораў кафедры харавога дырыжыравання Л. Румянцавай і С.Кунцэвіч, студэнткі Ю. Штэйн — па праблемах харавой музыкі Г. Свірыдава). Прафесар кафедры тэорыі музыкі Н. Юдзеніч, якая падтрымала ідэю правядзення канферэнцыі, стала навуковым кіраўніком дакладаў студэнтак Т. Сакалоўскай, А. Сеўрук, Т. Лапко, Н.Дожынай. Гэтыя выступленні былі прысвечаны вакальным цыклам Г. Свірыдава, трактоўкі ў іх паэзіі А. Пушкіна, М. Лермантава. Вялікую цікавасць выклікалі даклады дацэнта кафедры гісторыі музыкі Р. Аладавай і студэнткі аддзялення музыказнаўства Т. Шчарбаковай, якія акцэнтавалі ўвагу на сувязях творчасці і непасрэдна асобы Г. Свірыдава з беларускай музыкай. Пра фартэпіянную музыку кампазітара распавяла старшы выкладчык кафедры музычнай педагогікі А. Піліпенка, якая ілюстравала сваё выступленне за інструментам, чым прыемна ўразіла слухачоў. Дый практычна ўсе даклады ў якасці прыкладаў да сказанага суправаджаліся музыкай.

Безумоўна, музычнай кульмінацыяй чытанняў сталася праслухоўванне харавога цыкла Г. Свірыдава "Песняспевы і малітвы" (1993 г.), што нікога не пакінула абыякавым. А лірычнай кульмінацыяй — вечаровая размова за "салодкім" сталом. Чытанні "Свірыдаву прысвечана" мелі вялікі поспех і сталіся прыкладам высокага ўзроўню арганізатарскай і навуковай работы.

Наталля КСЁНЦ,
студэнтка БАМ

ЛіМ
ЧАСАПІС

ВЫСТАВА МАСКОЎСКІХ ЖУРНАЛІСТАЎ

У Нацыянальнай мастацкай галерэі (былы Палац мастацтваў) прэзентавана днямі выстава фатаграфій і карыкатур супрацоўнікаў расійскай газеты "Аргументы и факты" Барыса Крэмера і Андрэя Дарафеева.

Барыс Крэмер (1945 г. нараджэння) — карэнны масквіч. Дзіцячае захапленне фатаграфіяй натуральна перарасло ў прафесію. Пасля войска працаваў у друкарні, узначальваў лабараторыю Маскоўскай СГКБ "Легмаш". З 1973 г. фотаздымкі Барыса Крэмера сталі рэгулярна з'яўляцца на старонках цэнтральнага друку. З 1992 г. ён — фотакарэспандэнт, а пасля — загадчык фотацэнтра тыднёвіка "Аргументы и факты".

На выставу Барыс Крэмер прадставіў фотапартрэты многіх вядомых палітыкаў, спевакоў, артыстаў тэатраў і кіно, а таксама фотакалажы: "Сабачае жыццё", "Бомж", "Грачоў грае ў шахматы", "Рота ганаровага каравула" (зрэшты, назвы гавораць самі за сабе). Сам за сябе гаворыць і змест фотаздымкаў, здзеклівы і з'едлівы адначасова, такі характэрны для маскоўскага погляду на падзеі. На першым плане двое салдат з роты ганаровага каравула высока паднялі ногі, і праз парваныя падэшвы свецяцца голыя пальцы. "Новы рускі" каля шыкоўнага аўтамабіля пытаецца ў залатой рыбкі: што табе трэба? На фоне разбуранага Грознага каля бервяна з уторкнутай сякерай размаўляюць Ельцын і Грачоў, "Нічога, разбамбілі — адбудуем".

Не менш вартыя ўвагі і карыкатуры Андрэя Дарафеева, мастака "Аргументов и фактов". У тыднёвіку ён — з 1989 г.

І без перабольшання можна сцвярджаць, што над ягонымі карыкатурамі і калажамі смяялася ўся краіна. Ёсць і яго немалая заслуга ў тым, што павялічыўся наклад газеты.

Кажуць, масквічоў не любяць за снабізм. Але да іх незалежных крытычных водгукаў на расійскія падзеі варта прыглядзецца.

Валерый БАБЕЙ

А Ў НАС СВЯТА!

Танцавальнаму калектыву "Капрыз" пры Гомельскім абласным Доме настаўніка ўсяго каля трох гадоў, але поспехаў, якіх ён дабіўся, хапіла б і на добрае дзесяцігоддзе. Нядаўна "Капрызу", аднаму з нямногіх дзіцячых калектываў у вобласці, прысвоена званне ўзорнага. Ну, а з выпадку прысвоення — велізарны торт (на здымку).

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА

І АД СЦЭНЫ АДДАЛІЛІ... МАТЫВЫ

Пастаноўка спектакля "Рэвізор" па аддаленых (падкрэслівае) матывах Мікалая Гогаля не будзе ажыццёўлена Альтэрнатыўным тэатрам (Мінск). Запрошаны рэжысёр В. Цюпа, між тым, ужо правёў шэраг рэпетыцый. Фундатар пастаноўкі Г. Шульман (фірма "Клас-клуб") ужо ахвяраваў частку грошай на першыя выдаткі. Акцёры ўжо вывучылі тэкст і запаміналі мізансцэны. Першай і падставовай прычынаю неажыццяўлення называецца якасць твора, прапанаванага для ўвасаблення, — невысокая. Выказваецца меркаванне, што трупа Альтэрнатыўнага тэатра здаволеная такім вынікам (не блытаць з вызначэннем "задаволеная").

Ж. Л.

Паэзія

Віктар ЯРАЦ

ПАДКОВУ ШЧАСЦЯ ЦІ ЗНАЙШОЎ ХТО...

НЕБА НЕАБДЫМНАЕ

Годы — не лодкі,
а ўсё-ткі сплылі.
Восень з паглядам задымленым.
Што ж я запомніў на гэтай зямлі?
Толькі святло неабдымнае.

Холад, які прабіраў да касцей,
вецер з гаркотнаю сажаю
згадваю меней,
а ўсё-ткі часцей —
неба святло неабсяжнае.

Крыллем чароды ўсе крыўды змялі.
Сэрца — як поле абмытае.
Перазімуем,
каб зноў на зямлі
неба прывеціць блакітнае.

Што ж прарастае ў душы?
Адкажы,
далеч — прымоўклая чаіца?
Мокры лісток ля намоклай шашы
ў неба расстайна ўглядаецца.

•

Прыдняпроўскія ўзлессі, як песні,
запытацца так хочуць аб чым
у сцяжын, што прыводзяць да весніц
адзінокіх асенніх жанчын?

Вераснёвыя тонкія ніці
лёгка рвуцца і лёгка плывуць.
Варта небу ледзь-ледзь уздыхнуць —
як трапечацца ліст на ракіце!

Устрывожаным крыкам
чароды
ад зямлі адрываюць пагляд,
і праз слодыч асенняга мёду
чутна горыч асенняя страт.

•

Як пагарэльцу, сіратліва дню
ісці ў змярканне зябкае. Бы ў ранах —
дарога, што прасіла цеплыню:
— Не пакідай, цяплынь, мяне так рана.

Ні грукату, ні грому. Толькі шэпт
груш палявых, як голас прывітання.
Ступаю ў нечы чалавечы след,
іду за рэхам нечага дыхання.

Тут колькі сэрцаў сонцу і дажджу
сваё біццё дарылі ўдзень і ўвечар —
ядкажа, можа, толькі мурашу
бяссоны жвір, асуджаны на вечнасць.

Паслухаю дарогу ў цішыні.
Над ёю хутка скараспелак-зорак
запаляцца дрыготкія агні...

Аўтобус не заходзіць у пасёлак.

•

Маршчыны —
правады зямных турботаў,
начэй бяссонных,
зорнай вышыні.
Апорамі
трывог высакавольтных
ідуць за небасхіл расстання дні.

ПАДКОВА ШЧАСЦЯ

Сівізною свецяць далячыні.
Сцежка — напамінам праз гады:
у расстання — тысяча прычынаў,
у сустрэчы — ёсць адна заўжды.

Для мяне падковаю бліскучай
выблісне (пра шчасце памаўчым)
рэчка схаладнелая пад кручай,
над якой плыве з гародаў дым.

Сніцца строме доўгае стагоддзе.
Век, як конь, —
то бег, то кавыляў.
Ды падковы звонкія на лёдзе
нездарма хвалілі каваля.

Над шляхамі дзедаўскага краю
гукі даўніх зімаў паплылі.
А падкову шчасця — я не знаю —
ці знайшоў хто-небудзь на зямлі?

ГОЛАС ВЕСНАВЫ

Жалудамі дол дуброва ўсцеле.
Вецер перачытвае лісты.
І чакаеш: першы снег нясмела
ляжа на замёрзлыя сляды.

Учарашні дзень засне на голлі.
Снегірам ці разбудзіць яго?
А ля хат рабінавы агонь
ці развее сум, што сэрца коле?

Нібы з печы зыркія жарынкі,
разадзьме зноў зоркі вышыня
ў час начны, каб дрэвы і сцяжынкі
ўспомнілі: ідуць з якога дня.

І падкажа золкае бязмежжа:
— Свет яшчэ не мёртвы, свет жывы.
І над снегам свежым
рэхам свежым
адгукнецца голас веснавы.

У РОДНЫМ КРАІ

У родным краю ёсць крыніца...
М. Багдановіч

А ці ў сне, ці не ў сне
запытаю душу:
ці пачуюцца продкаў дакоры,
выдых жней і калоссяў разгойданы шум
у жытнёвым і песенным моры?
Ці гняздо зноў саўе
перапёлка сабе?
Ці саўе сабе песня гняздзечка
тут, дзе з конікам прашчур у полі гарбеў,
зерне сеяў, як зоры — Шлях Млечны?
Нібы промень — з імглы,
з нематы — птушаня,
прабівалася слова людское —
набывала імёны нябёс вышыня
і сцяжына, што ногі не коле.
А сягоння — ні казкі,
ні песні з палёў,
дзе калісь немаўлят спавівалі.
І дыханнем — гаркотней
сівых палыноў —
адгукаюцца прадзеды-далі.

•

Не заўважыў, адцвілі сады,
не прыкмеціў, як нырнуў у лета
поезд, не збаўляючы хады,
цалаваны прыдарожным цветам.

Прамільгнулі ў ранішнім тумане
цэркаўкі адноўленай крыжы,
ластаўка, што ў хуткім віражы
пасылае ранню прывітанне.

Станцыі, паўстанкі і масты,
гнёзды, як дазорныя прысадаў,
зноў пытаюць: што пакінуў ты
за спіной, вясной і далягляда м?

Стрэчу наварожаць ці расстанне
не цыганкі — колы цягніка?
І на што пад сонцам наракаць,
як світанне з ластаўкай растане?

ПАРАНЕНАЯ ЦІШЫНЯ

З тых гадоў, дзе лес пасляваенны
сосны, што не вывез акупант,
аддаваў для шахтаў і для хат,
помняцца не толькі дрэваў цені.

Сваякі заходзілі й суседзі —
хто пазычыць солі, хто — агню.
Сосны пахлі порахам,
і недзе
выбух зноў вярэдзіў цішыню.

СОНЦА СУНГА

(Працяг. Пачатак на стар. 9)

знясілена споўз на падлогу ды так і застаўся сядзець. Салот Сунг ласкава пакудлаціў тыгра па шыі, і той знік.

— Не трэба было пасылаць мяне, Су, па шляху Кампаданга, — цяжка вымавіў Алёшка.

— Чаму? — ціха спытаў той, здагадаўшыся па выразе твару, што сябра прынёс чорную вестку.

Алёшка падрабязна распавёў пра тое, што бачыў. Напрыканцы расповяду ў Сунга задрыжалі рукі. Раптам ён устаў, падбег да акна, узлез на падваконне і перакінуў нагу ў пустэчу. Не разгубіўшыся, Алёшка кінуўся ўслед, абхапіў за пояс і павалок углыб пакоя.

— Адпусці, — супакоіўшыся, папрасіў Сунг. — Апошнім часам мяне сталі падводзіць нервы. Але я не выскачу ў акно.

Алёшка паверыў яму ды адпусціў.

— Табе нельга вяртацца ў Кампучыю, — пераканана заявіў ён. — Цябе заб'юць, як забілі сваякоў і аднавяскоўцаў. Варта папрасіць палітычнага схавішча ў якой-небудзь сацыялістычнай краіне. Напрыклад, у Балгарыі?

— Я не здолею пражыць без Кампучыі, — спакойна адказаў Сунг, задумліва гледзячы на свае рукі. — Ад Зла нельга ўцякаць — яно паўсюль дагоніць. Са Злом трэба змагацца. Я вярнуся на радзіму, але не звычайным шляхам, а праз В'етнам, і адтуль — партызанскімі сцяжынамі...

— І не страшна вяртацца? — здрыгануўся Алёшка, прыгадаўшы паліцу, якой нізкарослы кат забіваў вяскоўцаў.

— Страшна. Паміраць у дваццаць чатыры гады заўсёды страшна. — Ніжняя сківіца Сунга вытыркнулася наперад, а пасма валасоў упала на зморшчаны лоб. — Але я не магу заставацца тут, калі там канібалы забіваюць тысячы людзей штодзень. Месца тым канібалам — на мушцы майго аўтамата. За апошнія трыццаць гадоў кампучыйцы перамаглі японцаў, французаў, амерыканцаў. Няўжо цяпер яны не перамогуць Пол Пота?..

Зборы ў дарогу занялі тыдзень. У дзень ад'езду Салот Сунг пакінуў сябру на памяць адзін са сваіх малюнкаў. На ім было намалявана барвовае рысавае поле, якое аблямоўвалі бурыя палосы траў. Над полем цягнулася чарада залацістых хмар, з-за якіх выглядала сонца.

— Добрае спалучэнне фарбаў, — пахваліў Алёшка малюнак. — У цябе сонца ўсміхаецца! — заўважыў ён асаблівасць, якая не адразу кідалася ў вочы. — Ты надаў яму рысы ўласнага твару.

— Бывай шчаслівы, Алёша. Успамінай пра мяне хаця б зрэдку, — пасміхнуўся Сунг, як сонца на яго малюнку.

— Пасля перамогі абавязкова вяртайся ў Мінск давучвацца на мастака, — паціснуў Алёшка яму руку на развітанне...

На працягу многіх месяцаў Алёшка лавіў усе звесткі, якія тычыліся Кампучыі. Позняй восенню ён ад душы парадаваўся паведамленню "Радыё Свабода" пра серыю паспяховых аперацый вызваленчай арміі Кампучыі, у выніку якіх ад палпотаўцаў былі ачышчаныя ўсходнія і паўночныя правінцыі.

Выключыўшы радыёпрыёмнік, Алёшка падышоў да сцяны, на якой вісеў малюнак Сунга, і паднёс руку да сонца, што ўсміхалася. Руку сагрэла нябачная цеплыня. Хлопец зразумеў, што Сунг змагаецца за радзіму, жывы і здаровы. Абрадаваны гэтай весткай ад далёкага сябра, жадаючы падбадзёрыць яго, Алёшка ўслых сказаў:

— Ты пераможаш, Сунг!

ЗАПІСКІ КАШІАПЛЁТА

ЛЮДЗІ ПАДЗЯМЕЛЛЯ

Павел МІСЬКО

ВЯРТАННЕ НА КРУГІ СВАЯ

Пачалося ўсё...

Не, калі папраўдзе сказаць, то пачатак трэба шукаць не ў дні творчага крызісу, і не ў 91-м, скрушным і горкім для мяне годзе, калі ўсё на свеце было няміла і нават лёгкі "шарык" валіўся з рук ("Уцякаў бы, бег, здаецца, сам не ведае куды..." — праўдзіва класік пісаў пра такі душэўны стан). Крыху адцягвала ўвагу ад асабістага гора тое, што рабілася ў былым Саюзе ССР і ў рэспубліцы. Глыталася ўсё, што падносіла прэса, радыё, тэлебачанне — і было гэтага мала, мала, мала... Не забірала шматлікая інфармацыя ўсю ўвагу, не дадавала раўнавагі, а яшчэ больш расхіставала.

Бадзяўся па вакольных лясах сталіцы-мегаполіса, па захламленых пералесках, гаях, палігонах, шукаў і там супакаення душы... І вось аднойчы, адпачываючы пад кашлатаю ялінаю, клаў маленькі агеньчык, слухаў гаючы пошум дожджыку, а рука з нажом стругала папруціну... І само сабою неяк атрымалася, што сагнуў на калена абруч. Звязаў яго кручаным дубнякам-віткаю. Адразу ж захацелася зрабіць яшчэ адзін, уставіць яго ўнутр гэтага крыж-накрыж, замацаваць зоркаю-ромбам. А зоркі як звычайна робяцца з расколатага дубца, з дзвюх палавінак яго, выструганых да патрэбнай таўшчыні і вышмарганых да гнуткасці і мяккасці сырыцы. Яшчэ раз успамінаў усё, як рабіў бацька — да вайны, пры немцах, пасля вайны, забяспечваючы кашамі многіх суседзяў ("Божухна, больш чым паўстагоддзя мінулася!").

І так мне раптам захацелася плесці такія ж акуратныя і крэпенькія кашы, звычайныя, побытавыя, як гэта па-майстэрску рабіў бацька (а чаго ён толькі не ўмеў!). І не толькі вялікія, але і малыя, маленькія і сувенірныя нават. Мяне пацягнула да гэтага рукамяства, як да нейкага душэўнага ратунку. Вось толькі трэба нашукаць, нарэзаць патрэбных дубчыкаў, арэхавых палак-прутоў. Найбольш прыдатныя для пляцення і прыгожыя дубцы з ракіты, вербалозу, лазы, а кустарнікаў гэтых — сотні відаў, і толькі нямногія з іх годныя для пляцення.

Займаўся гэтым і ў "Іслачы", куды паехаў адпачыць, развеяцца, а калі ўдасца, то і напісаць крыху. Дубцоў, праўда, знаходзілася там мала, а больш галінкі-парасткі — каля рэчкі, паўз дарогі. Плёў, схаваўшыся на схіле абрыву, адкуль адкрываўся цудоўны від на раку і даліну. У гэтым таемным месцейку хаваў да заўтра ўсе прычындалы.

Штосьці атрымлівалася — раздорваў сябрам, знаёмым, персаналу. Хвалілі, дзівіліся. А з малых і маленькіх цешыліся, як дзеці.

— Павучы і мяне... Здаецца, і я займаўся б гэтаю справаю, — папрасіўся раз Уладзімір Анісковіч. — Прывязу з сабою дадому кошык, на дачы спатрэбіцца.

Павёў у сваю "майстэрню" на абрыве, пасадзіў побач. Паказаў, расказаў самыя "азы".

— Пачні з самага элементарнага. На во дубец, раскалі роўненька папалам, выстругай. Можна калоць нажом да канца, а я нажом толькі пачынаю, астатняе ўсё пальцамі. Памаленечку, не спяшайся, не звіхтуй набок. А праз тыдзень мо і кошык выйдзе, — пасміхнуўся я.

Уладзімір — чалавек сур'ёзны, нетаропкі. А от жа... Я мо і гэтых слоў не паспеў сказаць, а ў яго ўжо "пшык" атрымаўся. Саскочыў раскол убок, адна палавінка дубца звялася на клін, завісла на адненькай кары.

— Нічога. Если долго мучиться, что-нибудь получится, — кінуў я банальную сентэнцыю. — Такіх кур'ёзаў чакае цябе дзесяткі. Пазнаеш яшчэ і што такое "не перагінай палку" і г. д.

Карацей, не хапіла іслацкіх дзён, каб слынны перакладчык з балгарскай паспеў чым-небудзь авалодаць. А вось здымачак, дзякуючы Міхасю Кеньку, з таго часу застаўся.

"Даўнавата не браў я ў рукі шашак!" — не раз паўтараў і я сабе словы Наздрова з "Мёртвых душ", бо і ў самога не-не дый канчалася канфузам, часам у такія моманты, калі вось-вось павінна было ўжо выйсці нешта такое, такое... Ну, калі не шэдэўр, то хоць людскае што-небудзь.

— Традыцыйны беларускі кошык, — сказаў мне нехта з пісьменнікаў. — А вось Яраслаў Пархута ўмее такія — як лебедзі! І белыя, з чышчаных карэньчыкаў яліны, сасны.

Я адклаў гэтую падказку ў памяці, каб пры нагодзе распытаць у Сільвестравіча пра тонкасці яго справы.

Пенсіянерскі статус і тое, што інфляцыя і ўсякія катаклізмы з фінансамі на прасторах СНД і Беларусі праглынулі ўсё, што адкладвалася на "чорны дзень"; жабрацкія ганарары ў выдавецтвах і перыядычных выданнях, немагчымасць надрукавання ўвогуле прымусілі задумацца: а ці нельга штосьці мець з гэтага кашаплётства? Нейкую дабаўку на хлеб-кефір... Бо і сястра-паштальёнка, папытаўшы неяк, якая ў мяне пенсія, здзівілася неймаверна:

— Усяго-о?!

— Усяго. На два разы машыну заправіць, каб да цябе на Случчыну з'ездзіць.

— Вось дык пісьменнікі... То ў цябе хіба не было з чаго налічваць? Столькі кніг выпусціў.

— Было. У год перад пенсіяй у мяне выйшла ажно тры кнігі. І ў Мінску, і ў Кіеве, і ў Вільні. Сярэдні заробак за месяц быў у дзесяць разоў большы, чым сярэдні па рэспубліцы.

— Во-ой... А ведаеш, што ў такой-та і такой, "калгасніцы", больш агіналася, чым рабіла, ніколі нават мінімуму працадзён не вырабляла, пенсія ў паўтара раза большая, чым у цябе? І што гэтыя правіцелі думаюць! Як жа пражыць у горадзе на такую пенсію? Тут дык хоць агарод яшчэ ёсць, гаспадарка...

"Так, буду... Буду плесці на продаж! — завірылі думкі. — Божухна, толькі як рашыцца на такое, адважыцца, як адолець сорам? Скажуць, да чаго дажыўся, дастукаўся пісьменнік... От каб хіба хто другі прадаваў, каб толькі плесці... Але дзе знойдзеш такіх ахвотнікаў? Пхі, кашы прадаваць... От каб якое заморскае шмаццё!"

І ўгаворваў, супакойваў, апраўдваў сябе: "Я ж не крадзенае прадаваць буду, і не спекуляваць чужымі вырабамі. Гэта ж мая праца, мазоль, пот..."

Некалькі выпадкаў паддалі мне адвагі. Кіраўнік гурта "Ліцвіны" Уладзімір Берберэў, убачыўшы мае кошыкі, кінуў коратка, што было так не ўласціва яму: "Бяру адзін! Колькі прынесці грошай?" Удзельніца яго гурта Наталля Матыліцкая, тады супрацоўнік Заслаўскага музея, узяла некалькі штук для экспазіцыі, а потым зрабіла паўторны вялікі заказ: "Ой, супрацоўнікі расхапалі тыя... Яны так спадабаліся ўсім! Пляціце яшчэ, некалькі мы ўключым у экспазіцыю з пазнакаю: слуцкі кошык".

Зяць Зміцер Сідаровіч прывёў неяк дадому барда Віктара Шалкевіча, акцёра Гродзенскага лялечнага тэатра. Убачыўшы мае вырабы, той "стрэльнуў у дзесятку": "Хо-хо... МісьКОШЫК! Вам трэба візітку ў кожны класці ці яшчэ нешта прыдумаць, каб заадно і аўтограф даваць".

Камплімент? Ці пад гумарным соусам шпілька? Ва ўсякім выпадку я пракаўтнуў і аблізнуўся.

І набраўся ўрэшце нахабства. "Обнаглел" — было б лепш сказаць, бо ў гэтым рускім слове ёсць дадатковы кплівы сэнс, які лепш перадае мой тагачасны стан.



П. Місько з унучкамі. Фота з сямейнага альбома.

ПРАДАЦЬ — ЯК СКОЧКУ СПАЙМАЦЬ.

(Як быццам з дзённіка).

Былі на Камароўцы. Не адзін, упрасіў сына: для падтрымкі духу і каб памог валачы. Наплёў здуру вялікіх, ледзь у мяшкі ўбавілі, разлічвалі на дачнікаў. Гадзіны дзве-тры пракалі параўнаць, і ў падмёткі ім не гадзяцца. Пастаяў крыху побач з імі, суцяшаючы сябе, што мае рэчы знарок больш утылітарныя, побытавыя, практычныя, а не мастацкія вырабы. Людзям жа патрэбны і такія. Да таго ж, тое, што я пляту, у многа разоў танней за іхнія мастацкія вырабы і г. д.

Касіў вачыма па баках, не паварочваючы галавы, не падымаючы яе. Знешне — як быццам штосьці разглядваю ў сябе пад нагамі. Каб хаця, не давядзі Гасподзь, не ішоў хто са знаёмых, не ўбачыў мяне тут.

І як на тое — Навум Цыпіс. Сяброўскія поціскі рук, сёе ды тое. Навум захапляецца кошыкамі. Шчыра ці ад далікатнасці натуры? Пазнаёміў з мастачкай Святланай. У яе на выступе сцяны і карціны, і не свае вырабы з дрэва, чароту. Дамаўляецца за мяне, каб узяла для спробы на рэалізацыю пару малых кошыкаў: усё роўна ж стаіць тут дзень пры дні. Мастачка дзелавая, ёй не першына гэтым займацца. Абгаворваем цану. "А што звыш — ваша..." "Ну што вы!" — адмахваецца яна. Абменьваемся тэлефонамі. (Дарэчы, яна іх усё-такі прадала за некалькі дзён, па меншай цане).

Яшчэ крыху пастаялі з Навумам. Дружна клянём час, абставіны, кіраўнікоў. Гражуся склікаць фотакарэспандэнтаў і заваліцца з кошыкамі, сесці плесці ў вестыбюлі Вярхоўнага Савета. Хай пабачыць Шушкевіч, хай усе пабачаць са здымкаў, чым нашаму брату даводзіцца займацца. Гэта ж тое самае, што камп'ютэрам заганяць кастылі ў шпалы.

А потым я ногі ў рукі і ходу з праспекта. Перавёў дух толькі ў падземным пераходзе каля ГУМа. Тут людскія Гальфстрымы імкнуць насустрач адзін аднаму, уздоўж доўгага раду сталоў з кветкамі. У асноўным рукы прадаюць, гваздзікі, цэны — галава кружыцца. Раскошныя, праўда, кветкі... Прадаўцы — дзяўчаты, ёсць і хлопцы.

Прыладкоўваюся каля прыватызаванага магазіна з неонавымі літарамі "Пераход", у чырвоным святле. А ўвогуле тут прыцемак, тое, што трэба, не так буду кідацца ў вочы. Толькі там, дзе кветкі, уключаны дадатковыя палкі-лямпы розных колераў, каб падхарашыць кветкі. Але ж "вазы" пад кветкамі — сметніцы з пластыкату з нарошчанымі дротам бартамі: "Не Эўропа... Правінцыя ёсць правінцыя" — думаю.

І во, удача — першы пакупнік. А потым і сама гаспадыня "Перахода", паўнаватая жанчына, купляе маленькі — для інтэр'еру, каб падвесіць з кветкамі. Зычліва дазваляе стаяць кошыкам на падаконніку. Аказваецца, і тэрыторыя ля сцяны "Перахода" лічыцца прыватызаванай, і ніхто без дазволу гаспадароў не мае права атабарыцца ля іх акна-вітрыны.

І ўсё. Больш — як зарвала. І падыходзілі, і цікавіліся, але... як быццам толькі ад таго, што няма чаго рабіць.

Разглядваю дзяўчат за сталамі з кветкамі. Кураць — усе; з нейкай ярасцю абдымаюць дымам пяшчотныя ружы. Цікава, чым пасля гэтага яны пахнуць? Кожная з кветніц — віртуоз у мацяршчыне, для іх людская мітусня быццам і не існуе, яны не зважаюць на тое, што людзі чуюць іх "красамоўства". Не хацеў бы я купляць у іх кветкі, каб і было за што. Ад такіх прадаўцоў аўра ў кветак — охо-хо... Бернард Шоў, наслухаўшыся мінскіх кветніц, не напісаў бы свайго "Пігмаліёна".

Вечарам заявіліся іхнія брыгадзіры, ці як іх называюць. Сталі кучаю супраць маіх кошыкаў, засланіўшы ад людзей. На мяне нуль увагі, як на казяўку. Нахабна-ўпэўненыя здаравякі ў тужурках. Прашу адстаўпіцца ўбок хоць на метр, курыць можна ж і там. Адзін з іх, Саша, вяжацца да мяне: "А хто ты такі, адкуль узяўся? Плаці за месца! Плаці, плаці, дзед, ты багаты! А то пайду зараз да Валерыя, ён цябе жыва выставіць адсюль!" — Рэкецір? Па сумяшчальніцтве? З чаго вы ўзялі, што я багаты? Што не ў рызманах стаю? — выкладваю яму. Падкрэслена "вы", хоць ён мне "тыкае", быццам разам свінні пасвілі. — Я ж вашых грошай не лічу, не разяўляю на іх рот — гэта раз. Канкурэнцыі вашым кветкам не раблю — гэта два. А тры — гаспадыня "Перахода" мне дазволіла тут стаяць". — "Бага-аты дзед... Ой, багаты!" — яшчэ некалькі разоў прабурчаў Саша, але ўжо не такім нахабным тонам. І, мабыць, расказаў сваім пра маю неўступчывасць, бо і яны, пагардліва адтапырваючы губы, зазіркалі ў мой бок.

А ёсць, аказваецца, і над імі бошы. Усе смугла-чарнявыя, "каўказскай нацыянальнасці". Брыгадзіраў як падмянілі: прыязна ўсміхаюцца ім, моцна ляпаюць далонь аб далонь, здароўкаючыся. З абрыўкаў размоў усякаю: пра тое, як сёння ідзе тавар, па якой цане, чаго трэба падкінуць. Цікава, самі "з Каўказа", а кветкі галандскія! Пра гэта сведчаць даўжэзныя каробкі з-пад іх, надпісы. Фірмачы? І так далёка-шырока раскінулі свае шчупальцы? Дастаўляюць жа таксама няйнакш як самалётамі, бо ўсё свежанькае, быццам толькі што з цяплічнай градкі.

Сёння Саша (другі Саша, прадавец кветак, а не брыгадзір-рэкецір) няйначай добра ўтаргаваў, бо частаваў суседак па сталах шампанскім. А мо быў "дзень імянін" ці, можа, "нараджэння"? Звяртаўся да прахожых на ўсіх еўрапейскіх мовах, абскубваючы іх, як гуску, па слоўцу-пёрку, па два, па сказу. Нават Кісу Вараб'янінава цытаваў: "Мсье жэ не манж... Гебез зі мір, біттэ... Купіце што-небудзь у былога дэпутата Дзяржаўнай Думы!"

Раблю вывад: чалавек начытаны. І, мабыць, яшчэ не забыўся, як служыў у войску ці праходзіў зборы. Бо раптам выйшаў з-за сталоў (балазе, вальней зрабілася ў пераходзе!) і пайшоў страявым уздоўж шарэнгі сталоў, узяўшы пад казырок, дзе "кіслі" дзяўчаты. Рэзкі паварот на месцы налева, да кветніц, прыставіў нагу: "Товарищи солдаты, матросы, офицеры, прапорщики и повара! Поздравляю вас з сотой годовщиной Великой Октябрьской Социалистической Революции!" За сталамі ўжо рогат і віск: "Сашка! Елэрэсэтэ! Артыст!" А ён яшчэ і адказ салдацкай шарэнгі з'імітаваў: "Гоў-гаў гоў-гаў, таварыш генерал!"

Холадна, сыра, скразняк. Сёння кветкі пахавалі ў скрыні-бункеры са шкляною сценкаю, у іх для цяпла гараць свечкі. На вуліцы невялічкі мінус ці каля нуля. На вуліцы то сыпле, то ляпае снег, і так ужо некалькі дзён. Стынуць ногі, тупы боль падымаецца па касцях да пяясніцы. А яшчэ і пальцы на руках абзываюцца, мабыць, застудзіў рукі, лазячы па палігоне і выгрэбваючы з-пад снегу дубцы, як алені ягель на поўначы капытамі. А як жа гэтыя дзяўчаты вытрымліваюць на стылым бетоне па дзесяць гадзін у дзень? Які букет хвароб, у тым ліку і жаночых, заробяць яны ў маладыя гады!

Адна з кветніц, не першы раз ужо бачу гэта, раней за іншых канчае работу. Ведаю, спяшаецца забраць дзіця з дзіцячага садка. Ці не маці-адзіночка? Грукоча-валачэ самаробную скрыню па праходзе да каморы на гэтым баку, дзе і магазін "Пераход". Не паспела, пераймае Саша-брыгадзір. Ідуць да падаконніка магазіна, спыняюцца воддаль ад мяне. Размова гарачая, зводзяць рахункі. Мо не па той цане прадавала, што была загадана? "Гані яшчэ чатырыста тысяч! І ведаць нічога не хачу!" Прадаўшчыца праз плач: "А дзе я іх табе сёння вазьму-у?" — "Твае праблемы! І ўвогуле, я цябе звальняю! Заўтра можаш не з'яўляцца!" У адказ яшчэ

(Працяг на стар. 14-15)

З ВІЦЕБСКА — У НЬЮ-ЙОРК

"Яўрэйскія мастакі ў стагоддзе пераменаў 1890—1990 гг." — выстава пад такой шматабяцальнай назвай адчынілася ў верасні ў Яўрэйскім музеі Нью-Йорка, які заснаваны ў 1904 г. і мае адну з найвялікшых у свеце калекцый па іўдаіцы. Выстава працягне работу да 28 лютага г.г.

На адкрыццё выставы была запрошана дырэктар Віцебскага мастацкага музея Іна Паўлаўна Холадава:

"Мяне вельмі ўразіла выдатная арганізацыя самой выставы. Рыхтавалася экспазіцыя два гады. Уявіце сабе, як дакладна прадумвалася канцэпцыя, падбіраліся работы. Год таму быў падпісаны кантракт з нашым краязнаўчым музеем. У Нью-Йорк з Віцебска трапілі тры работы Ю. Пэна "Развод", "Яўрэй у чорнай шапачцы" і "Тлумачальнік Талмуда". Была таксама прадстаўлена яшчэ адна работа мастака "Гадзіншчык" з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Дарэчы, на афішу выставы трапіла рэпрадукцыя менавіта гэтай работы, што і пачэсна, і прыемна, бо на выставе прадстаўлена каля 400 работ 50 аўтараў.

На выставе экспануецца жывапіс, графіка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, праекты, інсталяцыі, фотаздымкі, дакументы з музеяў ЗША, Расіі, Ізраіля, Беларусі, прыватных калекцый.

Экспазіцыя выставы падабрана без усялякай прадузятасці. Мы былі надзвычай рознымі ў гэтыя сто гістарычных год. Таму на выставе прадстаўлены геніяльны спявак рускай прыроды Ісаак Левітан, па-дзіцячы непасрэдны Марк Шагал, Л. Лісіцкі, гатовы перавярнуць свет з ног на галаву, партрэтыст Маісей Напельбаўм, які маляваў Сталіна, Дзяржынскага і ахвяру іх рэжымаў — Барыса Пастэрнака. Успаміны дваццацігадовай даўніны — у работах Б. Міхайлава, А. Касалапава, В. Комара, А. Меламеда. Праўда, калі Б. Міхайлаў "усхваляў" шчасце сацыялістычнай працы, маляваў партрэты перадавікоў вытворчасці і фізкультурнікаў, то А. Касалапаў з несхаванай іроніяй згадвае той час, калі фальш называўся праўдай, а за праўду адпраўлялі ў вар'яцкі дом".

На выставе прадстаўлены работы мастакоў, што мелі самае непасрэднае дачыненне да Віцебска. Гэта Марк Шагал і ягоныя чатыры работы "Над Віцебскам", "Пурым", "Равін з Віцебска", "Яўрэйскія могілкі", інсталяцыі І. Чашніка, Л. Лісіцкага, выдатныя палотны Р. Фалька.

А. ШУЛЬМАН
г. Віцебск

АД БЕЛАРУСІ — "ЗБАЎЦА"...

З 8 па 12 студзеня доўжыўся ў Луцку (Украіна) міжнародны фестываль "Калядная містэрыя", вялікае тэатральнае свята, аб'яднанае адвечным сюжэтам Нараджэння Хрыстова. Тэмай абмеркаванняў тэатразнаўцаў і крытыкаў былі "Традыцыі каляднай драмы ў тэатры лялек" і, паводле Гурыя Барышава, нашага знанага даследчыка, выступоўцы сабраліся самыя высокапрафесійныя. Імёны Хенрыка Юркоўскага, Барыса Галдоўскага, Ірыны Уваравай, Марэка Вашкеля, да якіх далучыліся вядомыя ўкраінскія калегі Язэп Федас, Галіна Батунова, Расціслаў Піліпчук — найлепшая гарантыя і сведчанне ўзроўню сустрэчы. Гуры Іларыёнавіч не толькі браў удзел у абмеркаваннях і тэатрэтызаванні, ён вёў увесь складаны трэці дзень "Каляднай містэрыі" і прызнаўся, што якраз такія спатканні тэарэтыкаў і даследчыкаў тэатра — ці не самая магутная частка міжнароднага фестывалю ў Луцку. Хоць і спектаклі, што традыцыйна паказваліся ўвечары, пэўным чынам ілюструючы тэарэтычныя напрацоўкі навукоўцаў, былі вартыя. Самае вялікае ўражанне гэтым разам на прафесара Барышава (а ён штогод бярэ ўдзел у луцкіх спатканнях) зрабіў спектакль "Пастаралькі" тэатра з М. Опале (Польшча): дасціпным трактаваннем старасвецкага сюжэта. Ад Украіны бралі ўдзел Луцк ды Іванафранкоўск, ад Расіі — Масква, нямецкі тэатр з Лейпцыга не даехаў па калядных маразах, затое Беларусь дала фестывалю... "Збаўцу". Спектакль Брэсцкага тэатра лялек паводле Ігара Сідарука ў рэжысуры З. Нуянзіна і мастацкім вырашэнні М. Данько пакінуў прыемнае ўражанне.

Ж. Л.

ЛЮДЗІ ПАДЗЯМЕЛЛЯ

(Пачатак на стар. 13)

мацнейшы плач: "Дзе я работу знайду? За што дзіця карміць буду?" — "Твае праблемы!" — холадна рэжа Саша.

Такі вось гаспадарчык, капіталісцік. І ніякаму прафсаюзу не паскардзішся.

З'яўляецца "каўказец", размова ўжо ўтрох. "Каўказец" палашчыў яе, пашаптаў штосьці на вуха. І, мабыць, засталася на рабоце, толькі ўжо не ў Сашавай брыгадзе.

. . . . . .

Спыняецца каля мяне хударлявы малады чалавек. Звяртаецца на чысцюткай мове, а не на языке. Слова за слова... Завуць Ілля, прозвішча — як у аднаго колішняга члена саюзнага Палітбюро. Працуе ў РБУ электразваршчыкам. Заробкі мізэрныя, жонка сядзіць з малым дзіцем дома. Ілля разглядае, любуецца кошыкамі, а потым дастае з торбы сувенірны саламяны капялюшык: "А гэта мае вырабы... Адзін удалося прадаць сёлета. Не сам, праўда, Таццяна з шапіка ТБМ памагла... Мала сёлета саломкі нарыхтаваў. Трэба будзе ў новым сезоне не праваронiць". Я хвалю яго вырабы, а ён прызнаецца, што і жонку заахвоціў да сваёй справы, пляцёнкі-стужкі робіць, сартуе-рэжа саломку. А сшывае капялюшыкі толькі сам, толькі сам.

Я дару яму для малога маленькі кошык. "А я вам капялюш спляту-пашыю. Вялікі, не сувенірны!" Я ледзь угаварыў яго не рабіць такога, бо цана капелюша намнога большая.

...Прычапіўся міліцэйскі патруль, абрыдла ім снаваць сюд-туд, не знаходзячы аб'екта для прыкладання сіл: "Не положено!"

Ну й ліха з вамі, пайду ўжо сёння, усё роўна людзей мала. Зайду ў магазін, куплю на выручку кавал дохлае каўбасы. Нешта ж усё-такі ўтаргавалася. Так і буду мераць свае кошыкі-грошыкі на каўбасу. А сорак пяць гадоў назад адзін аднакурснік усё мераў на батоны. Мы вымяркоўвалі са стыпендыі капейкі, каб можна было і ў кіно скакануць. А ён з намі ніколі не ішоў: "Вот яшчэ... За гэтыя грошы можна цэлы батон купіць!" Па іроніі лёсу ён потым стаў рэжысёрам на "Беларусьфільме".

...І сёння прыставаў міліцыянер, сам участковы. Няможна на маім участку, а вось там і там, дзе не яго участак, можаш стаяць. Жалезная логіка! І ўвогуле, як дробны прадпрымальнік я павінен мець патэнт, павінна быць уплачана за месца гандлю.

Гандаль не ішоў, схадзіў у райвыканкам — бліжэйшы, які трапіўся. Мажная цётка, сапраўды, усё пацвердзіла і пра патэнт, і пра аплату месца. "А колькі?" — наіўна пацікавіўся я. Аказваецца, столькі, што я на сваіх кошыках і за год не зараблю.

МЯНЕ ВЯРБУЮЦЬ

Першы зрабіў запрашэнне Вячаслаў Дубінка. Я ўжо чуў, што ён мае нейкі свой "Сіндыкат Мані Дулі" (назва яго кнігі). Бачыў часам, што нават на пасяджэнні праўлення Літфонду ўхітраецца зарабляць долары: працуе сабе, сашчэпвае скуранымі тасёмкамі скураныя футаралы для акуляраў. Паглядзеўшы мае кошыкі, патрымаўшы іх у руках, сказаў:

— Ідзі да мяне. З любымі прапановамі па выпуску прадукцыі.

— І з кошыкамі?

— Прыходзь, кажу, да мяне ў майстэрню там пагаворым. Каля вакзала я падвал арандую. Там на дзвярах такая кнопачка непрыкметная, пазвоніш.

Хадзіў. Глядзеў, распытваў, чым ён там займаецца. Толькі за арэнду памяшкання без вокнаў, без вентыляцыі плаціць ці не паўтара мільёна "зайцоў". Усё загрувашчана адыходамі вытворчасці — паперай, картонам, скурай. Ёсць нейкія дапатопныя станкі-прэсы і рэзальныя станкі. Вырабляе падарункавыя і настольныя запісныя кніжкі з рэльефнымі малюнкамі на скураных вокладках — для бізнесменаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, фірмаў, банкаў, нават штосьці такое для мітрапаліта Слуцкага і Мінскага рабіў і г. д.

— Набяру ў сумку ўзораў сваіх вырабаў — і па начальніцкіх кабінетах, паказваю. І купляюць, заказваюць... А вось тут... — адчыняе дзверы яшчэ ў адзін пакой ці кладоўку, — перабіваўся, спаў, пакуль займеў мінскую кватэру, адзін пісьменнік.

Акрамя канапы, у гэтай каморы ўсё было таксама занята стэлажамі і стусамі "другаснай сыравіны", з якое чалавек навучыўся рабіць грошы.

Вярнуліся ў першы, большы пакой, і Вячаслаў адразу пачаў абрэзваць на станку ўжо сшыты тоўсты блок запісной кнігі. Чалавек справы, няма калі ля-ля разводзіць. Так і ішла далейшая размова: ён працаваў, а я толькі азіраўся, круціўся, разглядваў.

— Так і робіш адзін на сваёй фабрыцы?

— Ну... Не-е, вечарамі то і жонка памагае... Глядзім тэлевізар і нешта робім, робім.

— А пішаш што ці не?

Вячаслаў уздыхае. Ясна, можна далей не распытваць.

Не пайшоў я да яго ў памочнікі. Не да душы яго "бізнес". Лепш ужо, калі засвярбяць рукі па фізічнай працы, спляту кошык. Заробкі ў параўнанні з ягонымі ("Адзін блакнот — пяць долараў!") мо і мізэрныя, але ж я не буду прыкуты ў ягоным падвале, як тыя старажытныя рабы на галерах.

А то яшчэ нейкая мадама з таварыства глухіх зацікавілася маёй прадукцыяй. "Гм, гм... А ведаеце што... Я падумаю, і вам скажу, дайце свае каардынаты. Можа, вы змаглі б весці ў нас нешта падобнае на курсы па лазапляценні".

Ну хіба школа для добрага чалавека нейкай дробязі? "Наце каардынаты..."

Падыходзіла жанчына і з саюза, што аб'ядноўвае майстроў народнай творчасці. Сказала, што іх штаб-кватэра недалёка адсюль, на вуліцы Леніна, зайсці са двара. "Падыходзьце, пагаворым... Авось чымнебудзь паможам. А зараз я спяшаюся". — "І са збытам прадукцыі паможаце?" — "А што? Можа, і са збытам".

Не схадзіў, усё адкладваў гэтую хадню на потым, адале і зусім забыў пра гэта.

Яшчэ крыху, то выйшаў бы я і на міжнародную арэну, а то, глядзі, і на сусветную. І ўсё дзякуючы аднаму вельмі вяльможнаму пану.

На дварэ плюхота і холад. Ці гэта са столі перахода накапала, ці людзі нанасілі за нагамі макрэчы — пасярод перахода ажно лужына стварылася. Людскія патокі дзеляцца на два рукавы, каб абмінуць гэтую лужыну. Толькі разявакі — тыя, што ў одуме ці пад градусам, і тыя, што талопяць вочы на кветкі і дзяўчат за імі, шлёпаюць напрасткі.

"Па тры грошыкі за дзень, куды хочаш, туды й дзень" — круціцца ў галаве, бо гандаль не ідзе. Кожны, хто зварочвае ў мой бок, змушае сэрца ёкнуць: "Ён!... Пакупнік!" Але чалавек, ледзь не цярнуўшыся аб мяне бокам і безуважна правёўшы позіркам па маёй прадукцыі, шпандорыць далей.

Звярнула і парачка, што ішла падручку. Ён высакаваты, у гадах, крыху бландзіністы ці рыжы. Палітон дэмісезонны, колеру не "наварынскага дыму з полымем", а хутчэй сукравіцы. Спадарожніца яго маладая і сімпатычная. Спыніліся на краі лужыны, аглядаюць кошыкі здалёк. Спадар-пан ветліва ўсміхаецца, і я заўважаю, што ў верхнім радзе бліжэй да правага вока зуб гнілы, выкрышаны.

— І гэта вы... То ест, усё самі рабілі? — кіўком падбародка паказвае на кашы.

— А хто ж мне... Сам, вядома, — адказваю. Такое пытанне задаюць шмат разоў.

— А многа тут кошыкажэй... Ну, такіх, што могуць іх вырабляць?

— Ёсць, вядома. І намнога больш майстравітых за мяне.

— Бардзо пшыемна... А пан ве, жэ ў Польшчы ест така фірма, якую вельмі б зацікавілі вашы кашы?

— Не вем, — кажу, — не чуў.

— Ест! — з нейкім гонарам усклікае цікаўны пан. — Я звяжу вас з ёю, а вы падбірайце пшыяцелюў. Вам даставяць матэрыял, галава не бэндзе балець на гэты конт. І збыт прадукцыі яны возьмуць на сябе.

"Нейкі палячок дурыць мяне", — падумаў я. Дзяўчына шмат разоў у час размовы парывалася памагаць пану падшукваць беларускія словы або тлумачыць тое, што ён казаў. Мо дачка яго ці перакладчыца? І ўжо была памкнулася дзіўная парачка адыходзіць, як пан з гнілым зубам не вытрываў. З інтрыгаю пасміхнуўшыся, сказаў:

— А вы ведаеце, хто з вамі тут размаўляў?

— Мо хто з польскага пасольства?

Пан пасміхнуўся яшчэ шырэй, і я заўважыў, што больш сапсаваных зубоў у яго няма.

— Граф Прушынскі! Чулі пра такога, ведаеце?

— А як жа! — падлесціў я яму. — І шмат чаго. Нават перадвыбарных улётак знайшоў быў стус во тут, на акне.

Пацешыўшы сваё самалюбства, пан Прушынскі злёгку, але з рэшткамі былое велічы кіўнуў на развітанне.

Забыў, напэўна, граф пра сваё абяцанне "звязаць". Заелі, мабыць, яго клопаты, як вошы, няма калі нават з зубамі парадак навесці. Дый як жа інакш? У вялікага карабля і плаванне вялікае, за ўсю Беларусь у яго "глова болі". Чалавек ледзь было не ашчаслівіў маю краіну, кінуўшыся змагацца за прэзідэнцкае крэсла.

РЭКЕЦІРЫ, РЭКЕЦІРЫ...

Саша-артыст сёння шмат чаго падапрануў пад свой нязменны плашч і стаў таўсматым мядзведзем. Нейкім тонкім бляшаным голасам, ды яшчэ з французскім гундосам імітуе вакзальнае радыё:

— Хряшдане праважаюшчыя! Праверце, ці не засталіся ў вас у кішэнях грошы ад'яжджаюшчых. Пафтарья-ю-ю... — І тут жа ўзрывае петарду.

Спалоханы ўскрык і віск дзяўчат, ухвальныя мацюгі. А яму, здаецца, больш нічога і не трэба, рагоча па-мефістофельску, нібы раскаты грому: "Го! Хо! Го!"

Са стадыёна валам валяць мяшэчнікі-гандляры. Сумкі ў іх клятчастыя ("мэйд ін ЮЭСЭЙ"), велізарныя, у пустую чалавека можна ўпакаваць. Адразу ля абменнага пункта банка "Комплекс", што арандуе ў "Пераходзе" куток, ствараецца чарга: спяшаюцца абмяняць выручку на долары. Пацікавіўся я раз, па колькі ж мяняюць... А як хто — і на трыццаць долараў, і на пяцьдзесят. Колькі ж усяго чыстаганам-доларамі паклалі за дзень ў кішэні, адзін Бог ведае. Як заведзена, ля чаргі ўвіхаюцца, адводзяць кліентуру ўбок, да падаконніка магазіна "дзікія" мянялы, робяць свой бізнес амаль адкрыта.

Каля мяне спыняецца цыбаты і бледны падлетак, рукі ў кішэнях.

— Дзед, гані грошы! — нямоцна, але пагрозліва звяртаецца да мяне.

Я ажно вочы вылупіў. Жартуе, жаўтароцік?! Дык жа не, паўтарае тое ж самае праз сціснутыя зубы, хоць у пераходзе і людна, і тлумна. Маланкаю мільгае ў галаве: "Леваю дам пад дых, праваю — у сківіцу... Усім корпусам сыграю, каб капыты задраў... А мо наступіць яму на наскі і галавою ў нос?.. Але ж лямант падыме, смаркач: "На невінаватага нападаюць!"

— Няма яшчэ грошай, — кажу спакойна. — Толькі што прыйшоў.

— А як пісталет да галавы прыстаўлю — будуць? — яшчэ больш пагрозліва шэпча школьнік.

І тады я амаль крычу, паказваючы на чаргу ў "Комплекс":

— Вунь дзе грошы! Долары нават! Чаму да іх не падыходзіш са сваім пугачом?

Дзэцыбелы былі для яго страшней за ўсё. Уміг "зліняў". растварыўся ў натоўпе. А я доўга не магу супакоіцца... Гэта ж да чаго дажыліся! Дзеці ўжо разбоем займаюцца, амаль сярод белага дня!

На падаконніку расстаўляе дыскі-пласцінкі Валодзя. Ёсць нават з прамовамі членаў усесаюзнага палітбюро на перадапошнім з'ездзе КПСС, Гімн Савецкага Саюза. Смяецца Валодзя: "Па семсот долараў буду прасіць. Замежнікі яшчэ цікавяцца такімі штучкамі".

Ён ужо даўно ў мяне ў падсуседзях. Гаспадару магазіна за дазвол карыстацца падаконнікам падараваў некалькі пласцінак. Працуе Валодзя таксама па прынцыпе "дастань-купі-прадай", у яго ўжо сталая кліентура. Некаторыя аматары дыскаў прыносяць яму пласцінкі на абмен, а той-сёй спрабуе ўсучыць свае, каб заадно прадаў.

Адзін з заўсёднікаў — міліцыянер з папачкаю пад пахаю. Перамацвае, перабірае, перакладвае. Валодзя, Уладзімір Канстанцінавіч, далікатны, інтэлігентны, цярпліва пакурвае, штосьці падоўгу ўталкоўвае міліцыянеру. Твар у Валодзі звычайна шэрахваравіты, а гэта ж ажно плямы зайгралі на шчоках. Калі натурысты пакупнік урэшце пайшоў, Валодзя пахадзіў нервова каля сваёй выстаўкі, наблізіўся да мяне.

— Як мне абрыд гэты курсанцік? Здаецца, паслаў бы на тры літары, а дагаджаеш, як ліхой скуле. Дыскаў дваццаць ужо аддаў яму за так ці за трэць цаны, а ён...

— Які курсанцік? — удакладняю я.

— Ну, гэты во, у міліцэйскай форме.

— І курсанты ў рэкеціры падаліся?! — не хаваю здзіўлення. — А што з яго будзе, калі скончыць сваю акадэмію, зойме пасаду? Чым тады хабар будзе браць? — і я расказаў яму пра хлапчука, які толькі што

таксама нахабна патрабаваў у мяне: "Дзед, гані грошы!"

— Вы рэдка бываеце тут... А мяне ж раз у аддзяленне міліцыі вадзілі. Тады ў мяне ляснула каля сарака пласцінак.

— Як гэта — ляснула?

— Ну як — звычайна... Забралі, не аддалі. Штраф хацелі ўляпіць, але неяк адбаярыўся, пасведчанне паказаў, даведку пра хваробу. Хадзіў потым, каб вярнулі пласцінкі... Дзіва што! Не ведаюць, маўляў, дзе яны падзеліся.

Не перапытаў я тады, што за пасведчанне ў яго. Многа пазней даведаўся — пасведчанне рэабілітаванага, ахвяры палітычных рэпрэсій. А колісь працаваў ці не ў мастацка-афарміцельскай майстэрні, дзе на вялікіх квадратных метрах малявалі партрэты правадыроў. І цяпер часам спыняюцца каля яго былыя калегі па майстэрні для размоў. Адзін стары, даўно пенсіянер, на Валодзева — "Ну як яны там?" адказаў коратка. "Галадаюць..." Гэта — пра былых сяброў-таварышаў. Перабіраючы пласцінкі, стары сказаў: "От вы ж знайшлі сабе справу, а яны..." — і раптам паціху заспяваў "Кацюшу", і Валодзя памог яму. Так складна-ладна атрымалася ў іх, на два галасы. Развіталіся цёпла, абдымаючыся.

"Знайшлі сабе справу..." Знайшоў справу Валодзя, ды не вельмі яна яго корміць. Бывае, па некалькі дзён не прадасць ніводнай пласцінкі. Расказваў раз, як аднойчы ў гасцях у таварыша пачаставалі яго пярлоўкай-цалкамі, запраўленай падсмажаным салам: "Нічога смачнейшага не еў, чэснае слова!". Другі раз сказаў, што заўтра ўжо прыйдзе ў паліто, хопіць прадаваць дрыжыкі: сястра падаравала сваё, амаль новае. Цеснае ёй стала... "У жаночым будзеш хадзіць?!" — "А цяпер такія, што не пазнаеш, дзе жаночае, дзе мужчынскае", — спакойна адказаў ён.

... Мужчына каля маіх кашоў стаіць. Мо пакупнік? Праўда, мужчыны купляюць вельмі рэдка. Падыходжу...

— Вашы кашы? Прадаяце?

— Мае. Прадаю, — кажу.

— Вось маё пасведчанне. Я работнік міліцыі. Прайдзёмце! — патрымаў ён каля мяне нейкія зашмальцаваныя корачкі.

Мог ён што хочаш паказаць, без акуляраў у мяне там усё расплывалася. А трэба было ўсё-такі дастаць акуляры і добра разгледзець дакуменцік.

— Во, бачыце, збіраю ўжо, пайду адсюль.

— Не, прайдзёмце са мной!

— Нікуды я з вамі не пайду, сваёй віны не бачу. Хабару хочаце? Не палучыце!

Міліцыянер паплямкаў губамі, нібы пераможваў пачутае.

— А я вас яшчэ магу прыцягнуць да адказнасці за паклёп. Прайдзёмце ў аддзяленне!

— А вы сілком мяне цягніце! А я вам такі скандал закачу — увесь народ збяжыцца. Ды яшчэ напішу на вас "телегу", што вы на валютчыкаў, на спекулянтаў нуль увагі, а да невінаватага ні ў чым пенсіянера прыстаяце, вымагальніцтвам займаецеся. Вам не то што ў Мінску — у рэспубліцы месца не знойдзецца!

Мо не трэба было, але ў запальчывасці я паказаў вокладку і маіх корачак. На гэты раз пачутае і ўбачанае ён разжоўваў даўжэй.

— А мне без розніцы, які ў вас саюз... Назад буду ісці, каб і духу вашага тут не было! — і ён павярнуўся, пайшоў да выхаду.

"Каб і духу вашага..." — гэта ўжо класічная формула адступлення. Ну і няхай ідзе! Я зноў дастаю з мяшка кошыкі.

— Я прыглядваўся да яго, — падышоў Валодзя. — Няма, здаецца, такіх у аддзяленні. Я іх там усіх ужо ведаю. У лапу хацеў — точна!

Пераход, пераход...

Гарадскія ўлады прадалі ў ім кожны закутак, ледзь не кожную метроўку плошчы. Вось і зусім нядаўна на стыку магазіна "Пераход" і кіёска "Саюздрук" з'явіўся стол з касетамі для магнітафонаў і касетамі відэа. Хацеў быў гэты стол размясціцца пад акном "Перахода", але гаспадар турнуў. І нават цяпер, калі стаіць стол на стыку, але ўсё ж такі нейкі метр займае і плошчы "Перахода", гаспадар "Перахода" прыходзіць браць відэакасеты на прагляд, бясплатна.

А чаго толькі на магнітафонных стужках не назапісвана! На адной — суцэльная пахабшчына адкрытым тэкстам. Нейкі дамарослы хрыпач-шаптун са смакам, віртуозна практыкуецца ў мацюках, гераіня песенькі бл... Снягурачка, героі Дзед Мароз (па яго адрасе таксама нагаворана), а яшчэ нейкі педэраст.

"Мэйк мані"... Нікому няма справы да распаўсюджвання такое культуры, галоўнае — за месца заплачана!

(Працяг будзе)

Меркаванне

КУДЫ ІДЗЁМ?

Напэўна, чытач прыкмеціў, што апошнім часам з'яўляецца ўсё больш розных канцэпцый і праграм, як вывесці з крызісу Аграпрамысловы комплекс (АПК). Іх столькі набіраецца, што, як зазначыў адзін народны дэпутат, прычым не дэмакратычнага кшталту, галава ідзе кругам. Пішуць вучоныя-аграрнікі, эканамісты, спецыялісты-практыкі, у адзіночку і групамі. На жаль, іх падыходы і аналізы мала чым адрозніваюцца ад тых, якія рабіліся ў перыяд камуністычнага таталітарызму: сістэма добрая, прагрэсіўная, але ёсць асобныя недахопы і хібы, іх належыць ліквідаваць, і ўсё будзе ў парадку. Калі ж закранаецца пытанне аб прыватнай уласнасці на зямлю, то ў самага жадаючага займець яе прападае жаданне — столькі ў тых дакументах агаворак і абмежаванняў. А што сельскагаспадарчая вытворчасць больш за 70 гадоў не спраўляецца са сваімі задачамі, то ў гэтым, галоўным чынам, вінавата адміністрацыйна-каманднае кіраўніцтва, недастатковая ўвага дзяржавы і г.д.

Шаноўныя аўтары падобных "пражэктаў", дазвольце з вамі паспрачацца.

З таго часу, як гвалтоўная калектывізацыя зруйнавала прыватна-ўласніцкае земляробства, яно, адміністрацыйна-каманднае кіраўніцтва, было "выратавальнікам" сельскагаспадарчай вытворчасці. Згадаем пра райкамы і абкамы, якія не злазілі з каркаў калгасаў-саўгасаў, дыктавалі, што і калі сеяць і ўбіраць, дзень і ноч выбівалі збожжавыя нарыхтоўкі, мяса, малако.

Скажуць няма ж ужо гэтых усеўладных структур, чаму ж калгасы-саўгасы не толькі не расквітнелі, а па ўсіх параметрах, як гавораць, пакаціліся па нахільнай?

Вінаваты крызіс, адсутнасць парытэтаў, неплацяжы і г. д.? Так, гэта не на карысць любой вытворчасці.

Справа ж у тым, што грамадска-сацыяльныя структуры, у якіх працаўнік пазбаўляецца сродкаў вытворчасці і вынікаў сваёй працы, набываюць прыгонна-рабскі характар. А прыгон і рабства, як паказвае практыка, не былі і не могуць быць жыццяздольнымі, прадуктыўнымі, эфектыўнымі, прагрэсіўнымі. І нішто — ні перадавыя тэхналогіі, ні самыя дасканалыя машыны, ні дасягненні навукі, ні адміністрацыйныя ўздзеянні (бізун і пернік), ні выхаванне "новага чалавека", чым хваліліся камуністы — не можа кампенсаваць гэты фактар. Нават сытыя рабы, у лепшым выпадку, здольныя толькі сяк-так утрымліваць грамадства на дасягнутым узроўні. І не больш.

Дарэчы, "адкрыццё" гэтае належыць правадыру сусветнага пралетарыяту. І ці трэба шукаць лепшую ілюстрацыю, чым уся гісторыя земляробства савецкага перыяду.

Дык што, камуністычная партыя не надавала належнай увагі сельскай гаспадарцы? Яшчэ як надавала! Як толькі завяршылася суцэльная калектывізацыя, яна вачэй не спускала з вёскі. Напачатку з калгасаў і саўгасаў выганялі кулакоў і падкулачнікаў, якія "ціхай сапай" пралезлі туды. Затым іх умацоўвалі кадрамі, аказвалі ім усялякую дапамогу. Згадваем: кожны генсек, які прыходзіў да ўлады, пачынаў сваю дзейнасць з уздыму сельскай гаспадаркі. І што толькі для гэтага ні рабілася... Гаспадаркі ўздымалі, "рэфармавалі", мянялі формы аплаты працы. Каб зацікавіць калгаснікаў, у ход ішлі бізун і пернік.

У нейкія гады замахнуліся на прысядзібныя ўчасткі, якія нібыта адрываюць сяльчан ад грамадскай працы. (Сёння, наадварот, прысядзібныя ўчасткі ўсяляк расшыраюць, нават плошчай да гектара. А што рабіць? Трэба ж неяк утрымаць рэшткі жыхароў на вёсцы, ды адначасова хоць крыху зменшыць дэфіцыт харчовых прадуктаў). Словам, усё не ўспомніш, не пералічыш.

Аднак агромністы патэнцыял, які нібыта тоіцца ў калгасна-саўгасным ладзе, не раскрываўся.

Нежыццяздольнасць калгасаў і саўгасаў сёння прызнаюць і самі кіраўнікі гаспадарак. Напрыклад, расійскі лідэр старшынёўскага корпуса М. Вагін прама гаворыць: "Усё. Калгасы сябе вычарпалі. Пара разганяць. Інакш поўная дэградацыя". І далей: "Калгасы — школы спажывецтва, п'янства, крадзяжу".

Аналагічную думку наш лідэр старшынёўскага корпуса В. Старавойтаў выразіў словамі: "Няма ў калгасе такой сілы, якая прымусіла б чалавека добра працаваць". Як вядома, свой знакаміты калгас "Рассвет" ён ужо рэфармаваў.

Звычайна на падобныя думкі і дзеянні заўзятыя прыхільнікі калгасна-саўгаснага ладу адказваюць: "Вы лічыце, што калгасы-саўгасы — не эфектыўныя формы гаспадарання? А чаму на тым самым Захадзе, якім вы захапляецеся, фермеры таксама аб'ядноўваюцца? А мы што, будзем разбураць гатовае?.."

На першы погляд — пераканаўча. Але толькі на першы. Калі ж супаставіць гэтыя аб'яднанні, то яны розняцца паміж сабой, як неба і зямля.

Там аб'ядноўваюцца свабодныя і незалежныя гаспадары-ўласнікі на раўнапраўнай дагаворнай аснове, без якога-небудзь ціску зверху ці яшчэ адкуль, прычым для вырашэння якой-небудзь наспеўшай праблемы. Уласнасць жа іх застаецца непарушнай, недатыкальнай, а ўласнік — свабодным, незалежным чалавекам-вытворцам.

Зусім іншае становішча ў нас. Члены нашых аб'яднанняў, г. зн. калгаснікі-саўгаснікі, якія загнаны ў арцелі гвалтам, не валодаюць ні сродкамі вытворчасці, ні вынікамі сваёй працы, ні належнымі правамі. Сацыяльны статус іх — бяспраўныя прыгонныя, рабы. А гэта, як ужо адзначалася, прыніжае годнасць чалавека, забівае ў ім зацікаўленасць да працы, не гаворачы ўжо пра творчыя адносіны да яе. У гэтым і заключаецца адна з прычын, чаму, нягледзячы на ўсялякія заахвочванні ўлад, усё

жывое і здаровае стараецца развітацца з вёскай.

Яшчэ нямогласць сельскагаспадарчай вытворчасці тлумачаць тым, што з вёскі дзяржава брала занадта шмат, а вяртала мала, а то і зусім забывалася на свае даўгі. Так, гэта было і яшчэ застаецца.

Па-першае, чаму так адбываецца? Ды таму, што вёска, пазбаўленая незалежнасці і правоў, не мае сілы пастаяць за сябе, за свае інтарэсы. Яе б'юць, дзяруць і плакаць не даюць. Таму і сёння ў вышэйшых эшалонах улады як агню баяцца рэфармавання калгасаў і саўгасў так, каб іх працаўнікі займелі прыватную ўласнасць на зямлю і маёмасць, сталі самастойнымі і незалежнымі.

Па-другое, не заўсёды так было. Напрыклад, у перыяд брэжнеўскай "харчовай праграмы". Тады на рэалізацыю трох кітоў уздыму сельскай гаспадаркі — механізацыі і машынізацыі, хімізацыі і меліярацыі — было асігнавана з бюджэтных сродкаў 170 мільярдаў рублёў. Па тым часе гэта было нямала. Але і гэта не прынесла жаданых вынікаў. На пленуме ЦК КПСС генсек дапякаў сваіх паплечнікаў: зрабілі велізарны ўклад у АПК, а аддачы як не было, так і няма.

І па-ранейшаму збожжа і іншую харчовую прадукцыю вымушаны былі завозіць з дзяржаў гнілога капіталізму, як і сёння неакамуністы называюць цывілізаваны свет. Затое людзі даведаліся, які там ядуць хлеб — не тое, што нашы "гліняныя" батоны з дрэннай пшаніцы, вырашчанай на шырокіх сацыялістычных палях.

Бывае, даводзіцца чуць: за "бугром" дзяржавы таксама субсідзіруюць і датуюць фермерскія гаспадаркі. Так, не без гэтага. Але ж робіцца тое не дзеля таго, каб стымуляваць іх вытворчасць, а, наадварот, каб затармазіць, нават прыпыніць яе на нейкі час. Бо ў краіне назапасілася столькі сельскагаспадарчай прадукцыі, што некуды яе дзяваць. Каб фермеры за вымушаны "прастой" не панеслі страт, дзяржава субсідзіруе іх. Напрыклад, у Галандыі існуе заклік (аказваецца, і там яны бываюць): "Забі карову — атрымаеш прэмію".

Іншая справа, калі сельскагаспадарчую вытворчасць спасцігне якое-небудзь стыхійнае бедства. Тады, канешне, дзяржава не пакідае на волю лёсу сваіх хлебаробаў, а ўсё робіць дзеля таго, каб хутчэй яны залячылі нанесеныя раны.

Дык хіба гэта тое, што робіцца ў нас? Пачынаецца пасяўная — давай крэдыт, пачынаецца ўборачная — зноў давай крэдыт. І так бясконца. Прычым, гэтыя і іншыя крэдыты ніколі не вяртаюцца. І іх столькі ўжо набралася, што нельга ўявіць, як з гэтымі даўгамі можна разлічыцца. Праўда, і дзяржава мо яшчэ больш у даўгу перад вёскай. Але гэта — іншая тэма.

Пра негатыўныя з'явы, якія нараджаюцца нашай сістэмай гаспадарання на зямлі, а дакладней казарменным сацыялізмам, можна гаварыць бясконца.

Напрыклад, чаму ў вёсцы, якая раней была ахоўніцай здаровага ладу жыцця і маралі, цяпер развялося столькі выпівох, іншых ненармальных з'яў? Ніколі не акажуць паслугу без пляшкі. Няма пляшкі — няма каня, дроў, саломы, гною і г. д.

Між тым, таму ёсць не толькі сацыяльная, але і свая псіхалагічная аснова. Справа ў тым, што раней, ва ўмовах прыватнай уласнасці, селянін атрымоўваў унутранае задавальненне ад выкананай работы. Чым больш зрабіў, чым больш натаміўся, тым больш задавальнення і радасці. І шукаць станоўчых эмоцый дзесьці на баку не было ніякай патрэбы.

Іншае становішча — ва ўмовах казённай, прыгоннай, не для сябе працы. Тут чалавек не імкнецца зрабіць больш і лепей, а толькі думае пра тое, калі скончацца доўгія гадзіны нялюбай адбывалаўкі. А гэта не прыносіць чалавеку ўнутранага задавальнення, тых станоўчых эмоцый, без якіх жыццё — не жыццё. Вось, дачакаўшыся канца бязрадаснай працы, і бяжыць чалавек да забягалаўкі-піўнушкі, ці шукае выпадку, каб прыкласціся да пляшкі. І, такім чынам, кампенсаваць дэфіцыт у станоўчых эмоцыях.

Або яшчэ. Колькі ў савецкія часы гаварылася пра нашу перадавую сацыялістычную аграрную навуку. Але ж дзе яшчэ ў свеце так здзекаваліся з зямлі-карміцелькі, пераворваючы яе да пяску, не дадаючы ўгнаенняў, пестыцыдаў і г. д.

Я чуў, што нібыта міністр сельскай гаспадаркі сп. Лявонаў хоць і не гаворыць прама, што ляжыць у аснове неэфектыўнасці нашай сельскагаспадарчай вытворчасці, аднак выхад з цяжкага становішча бачыць у развіцці прыватнай уласнасці на зямлю, у фарміраванні гаспадара-ўласніка, адраджэнні сялянскасці, традыцыйнай вёскі.

Чуў, што нават ахрысцілі міністра "ворагам калгасаў", хоць у гэта слаба верыцца.

На жаль, у Вярхоўным Савеце, які нарэшце абраны, большасць складаюць дэпутаты, якія выступаюць супраць прыватнай уласнасці на зямлю, фермерства і ўсяго, што звязана з гэтым. Вось і ўзнікае пагроза, што і на гэты раз рэфармаванне сельскай гаспадаркі будзе зведзена да нуля, таптання на месцы.

Не дай бог, каб падобнае здарылася. Тады зноў распачнецца тое, што адбывалася ў сельскай гаспадарцы 65 гадоў — далейшае закабаленне радавога працаўніка. Словам — вяртанне да казарменнага сацыялізму. Да гэтага, на жаль, ідзе.

Яўхім ІВАНОВІЧ,
ветэран вайны і працы

ЧОРНАЕ НА БЛАКІТНЫМ...

"Мілая Рузана! Шчыра дзякуем за падоранае Вамі свята, за Вашы непаўторныя творы. Я ўпэўнена, што многім яшчэ і яшчэ раз захочацца сустрэцца з Вашымі цудоўнымі работамі... Мы, беларусы, навапалачане, павінны быць удзячны Богу, што Вы жывяце ў нашым горадзе, што мы можам бачыць Вашы карціны".

"Дзякуй за светлы праменьчык, які асвятліў нашу будзённасць. Няхай Вас часцей наведвае натхненне і вера ў жыццё!"

"Мілая Рузана! Я ўдзячна лёсу, што мне пашчасціла пабываць на тваёй выставуцы. Цудоўна! Глядзіш і ўспамінаеш свой дом, свой край, родных і блізкіх, дзякуючы тваім карцінам інакай успрымаеш свет..."

(З кнігі водгукаў)

Жыла-была дзяўчынка. Далёка-далёка, у амаль казачным Баку. Яна была такая ж, як і яе равеснікі. І не такая. Можа, крыху сур'ёзней глядзела на жыццё, крыху больш яго разумела і крыху вастрэй успрымала ўсё, што адбываецца. Таму, што ўжо тады ў ёй нараджаўся Мастак. І першай гэта заўважыла маці, звярнуўшы ўвагу, як у адзін цудоўны вечар маленькая дзяўчынка намалявала знаёмых герояў з любімага мульціка. Тое, што з гэтага атрымалася, накіравалі ў часопіс "Костер", адкуль прыйшоў добры водгук. А хутка на яго старонках з'явіўся і дзіцячы малюнак. Так быў зроблены першы крок да Яго Вялікасці Мастацтва.

...У маленькіх пакоях інтэрната, дзе жыве Рузана Газаранц з бацькамі, цесна. Але не ад багацця мэблі, а ад карцін. Яны вісяць на сценах, стаяць на падлозе. Вядома, многія з іх хутка апынуцца ў майстэрні, памяшканне для якой прадаставіла кіраўніцтва Наваполацкага гарадскога краязнаўчага музея. Збылася мара Рузаны — мець майстэрню, тое месца, дзе будуць нараджацца карціны, увасабляцца на палотнах думкі, пачуцці, радасці і смутак.

У кожнага мастака — свае этапы творчасці. І ўсе яны — вынік нейкіх падзей. Я пазнаёмілася з Р. Газаранц на мяжы двух этапаў — мінулага і будучага, чорнага і блакітнага. Дзве грані — зло і дабро сустрэліся і, вядома, перамагло дабро. Вось толькі застаўся боль успамінаў і ўвасабленне гэтага болю —карціны, поўныя пакут. Самі назвы сведчаць пра гэта: "Гора ўсяго народа", "Журботныя карыятыды", "Распяцце", "Калос вайны", "Пераадоленне"... Прызнацца, калі б не была знаёма з мастачкай, то палічыла б, што аўтар — чалавек сталы, шмат перажыў на сваім вяку, але ніяк не трыццацігадовая жанчына. Такія яркія, хвалюючыя, уражальныя яе карціны — вынік тых падзей, якія давялося перажыць сям'і Газаранц.

Нагорны Карабах... Што мы ведаем пра яго? Асабліва сёння, калі карабахскія падзеі адышлі на другі план, і ўсе гавораць ці то пра ваенныя дзеянні ў Чачні, ці пра захоп заложнікаў, ці... Але Карабах дагэтуль жыве ў душы Рузаны, яе бацькоў. Гэтага не выкрасліць. "Гэта маё, — гаворыць мастачка, — мой боль, маё жыццё. Мае карціны, у большасці сваёй, прысвечаны гэтаму страшнаму перыяду ў гісторыі майго народа". Было ўсё. Пагромы, збіццё, маральнае і фізічнае знішчэнне армян. Многім з іх давялося пакінуць сваю радзіму — Азербайджан. Сярод іх — і сям'і Газаранц. Паехалі літаральна ўлегцы. Толькі з цяжарам на сэрцы. Вернуцца яны калі ці не? Наўрад. Таму што Карабах прадаўжаецца. У Баку засталіся карціны. Адны падораныя, іншыя... Лёс іх, як і многіх сяброў, знаёмых Рузаны, — невядомы. Ці жывыя? Засталіся толькі ўспаміны. Пра дзядзьку Рубэна Габрыляна, вядомага армянскага мастака, які, магчыма, сам не ведаючы таго, стаў яе духоўным настаўнікам. Пра вучобу ў Бакінскім мастацкім вучылішчы, потым Ерэванскім мастацка-тэатральным інстытуце. З асаблівай цеплынёй успамінае Рузана тыя дні, калі была слухачкай Ленінградскага інстытута жывапісу, архітэктуры і скульптуры імя Рэпіна. Тады яна, акрыленая, жыла адной думкай — тварыць. Але Карабах мог перакрэсліць усё, дзеля чаго яна жыла. Мог. Аднак...

Наваполацк, куды прыехала Рузана з бацькамі, стаў яе новай радзімай і не даў здзейсніцца той вялікай несправядлівасці. Так, дзяўчына хацела кінуць усё, не пісаць карціны, расстацца з творчасцю пасля перажытага... Як адрадзіцца з попелу? Памагла выпадковасць. У пошуках працы яна зайшла ў выставачную залу і разгаварылася з яе супрацоўніцай. Тая, даведаўшыся, што перад ёй мастачка, адразу ж прапанавала арганізаваць выставу. Так Рузана пачала працаваць над карцінамі да першай персанальнай выставы, якая адбылася ў лютым мінулага года. А вынік — шматлікія цёплыя водгукі наведвальнікаў. І другое нараджэнне Мастака.

Вось што гаворыць пра выставу сама Рузана:

— На выставе я прадставіла разнапланавыя работы. Адны кажуць, што гэта кепска, маўляў, не знайшла сябе. А я лічу — гэта нармальна. Чаму трэба прымушаць сябе працаваць у адным стылі? Калі малюю пейзаж, я адлачываю. Мне цікава працаваць у стылі абстракцыянізму — там невычэрпныя магчымасці. Але будучыня за рэалізмам.

— Так, хацелася ўсё кінуць. Але пасля выстаўкі зразумела — мае карціны патрэбны людзям. Буду працаваць, буду рыхтавацца да новай выставы.

— Прынцып маёй творчасці — пісаць праўду. Можа атрымацца добра, можа — кепска, але гэта павінна быць праўда.

— Я не магу працаваць як-небудзь, па кавалачках. Я павінна ўсю сябе аддаваць творчасці.

— Захапляюся буйнамаштабнымі роспісамі. Хацелася б паспрабаваць напісаць штосьці падобнае...

Вось такая яна — Рузана Газаранц. Сур'ёзная, калі расказвае пра творчасць, пра перажытае, пра работу ў школе на мастацкім аддзяленні. Вясёлая, калі гутарыць з сябрамі, глядзіць уласныя слайды, у якіх таксама ўгадваецца рука мастака — цікавыя ракурсы, цудоўныя пейзажы...

Л. ТРАПЕЗНІКАВА

Наздымках: Рузана ГАЗАРАНЦ і яе карціны.

Іван САЧЫВЕЦ

СТРАЙКАР

ГУМАРЭСКА

Вырашыў і я страйкаваць. Цвёрда вырашыў. Бо загадчык базы так мяне дапёк, што далей цярпець я ўжо не мог. Можна было б плюнуць на ўсё і звольніцца. Па ўласным жаданні. Але яму гэта было б на руку. Новага работніка знойдзе. Падатлівага. А дапёк мяне загадчык вось чым. То па кватэрах з пакункамі бегай. То з чорнага ходу яго сябрам і начальнікам тавар адпускай. То сваімі грашамі за абеды з рэвізорамі разлічвайся.

— Колькі яшчэ можна цярпець? — пайшоў я да загадчыка і паставіў пытанне рубам.

— Што цярпець? — запытаў Макарчук, нават не падняўшы галавы. Быццам бы маё пытанне пачулася з космасу.

— Эксплуатацыю чалавека чалавекам, — удакладніў я.

— А хто гэты чалавек, якога эксплуатуюць? — пацікавіўся Макарчук, скідваючы бляшанкі з заморскімі далікатэсамі ў свой аб'ёмны партфель.

— Я.

— Ха! — толькі і прагучала ў адказ. — Ты палітэканомію вывучаў? — ужо вытарашчыўся на мяне загадчык.

— Не, — адказваю.

— Тады навошта ты слова "эксплуатацыя" ўжываеш?

— А што, хіба нельга?

— Можна. Хто з паняццем.

— А хіба я без паняцця?

— Выходзіць, што так. Чым табе дрэнна на базе?

— Надакучыла быць на пабягушках. Абрыдла працаваць у звышурочны час. А зарплата мізэрная.

— Якая ўстаноўлена штатным раскладам, такую табе і даюць. Ды яшчэ і сам нешта цягнеш.

— Гэта мяне не задавальняе.

— Не задавальняе? Тады я заўтра цябе вытуру адсюль, а на тваё месца дзесяць чалавек знойдзецца.

— Не маеце права. Гэта вам не капіталізм, што можна за вароты выгнаць.

— Вось толькі пагавары! Я табе дам "капіталізм"! І прэч з маіх вачэй! У мяне няма настрою размаўляць з табой. Сам за вароты выскачыш.

Я пайшоў пакрыўджаны. Зняважаны. Амаль усю ноч не спаў. Усё думаў, як прыструніць чыноўніка, які зазнаўся. Рашэнне прыйшло хутка: страйкаваць. Баяцца няма чаго. Цяпер за гэта не пасадзяць. Вунь шахцёры Кузбаса страйкавалі. Шахцёры Данбаса. І што ім за гэта? Сяброўская размова з урадам. Нават падтрымка. І задавальненне іх патрабаванняў. Няхай і мой загадчык патанцуе.

Раніцай, паклаўшы ў кішэню бутэрброд, я пайшоў на базу. І стаў ля варот. Людзі ідуць на працу, абмінаюць. Ніхто не пытаецца, чаго я ля прахадной тырчу. Нарэшце Будэнка падышоў. Знаёмы.

— А чаго ты яшчэ тут аціраешся? Хіба табе яшчэ рана?

— Не, не рана. Але я сёння страйкую, — адказаў я Будэнку.

— Як? — вытарашчыўся на мяне таварыш.

— А вось так. Буду тут стаяць, каб прыцягнуць увагу супрацоўнікаў. Гэтым я выкажу пратэст супраць уціску з боку Макарчука. Супраць сацыяльнай несправядлівасці.

— Дурань! — абразуміў мяне Будэнка. — Хіба ж так звяртаюць на сябе ўвагу?

— А як?

— Трэба ўзяць у рукі які-небудзь транспарант са сваімі патрабаваннямі.

— Ды дзе ж яго ўзяць?

— Закажы мастаку, або сам намалюй.

— Я не ўмею.

— Давай я цябе выручу. За паўлітра. Толькі маўчок. Мяне ў гэту справу не ўцягвай.

Трэба сказаць, што Будэнка хутка зрабіў транспарант на славу. З такім нават у Амерыцы можна выходзіць на вуліцу. Да вялікай палкі ён цвікамі прыбіў фанеру, а на ёй напісаў два словы: "Я страйкую". Праўда, вынесці і даць мне ў рукі ён пабаяўся. А асцярожна падкраўся за гараж і там паставіў. Надлісам да сцяны. Цяпер я стаю з транспарантам. Шкада толькі, што ўсе ўжо прайшлі на працу, і мяне фактычна ніхто не бачыць.

У абедзенны перапынак я з'еў свае харчовыя запасы. Падмацаваў сілы, а на нагах стаяць усё ж было цяжка. Пайшоў на абочыну. На бардзюр сеў. Плакат утыркнуў у зямлю. Рэдкія прахожыя не звярталі ніякай увагі. Толькі нейкія двое словамі перакінуліся.

— Тут, напэўна, фільм здымаюць, — заўважыў адзін.

— Ты чаму так думаеш? — запытаўся другі.

— Ды вунь з плакатам страйкар стаіць. Толькі ў яго морда нейкая не закардонная. І вопратка вельмі на нашу падобная.

Увагі я так і не дачакаўся. Хто выходзіў з тэрыторыі базы, спярша здзіўлена глядзеў на мяне, затым на мой плакат, ад нечага рабіць сплёўваў на зямлю. Але пасля сабраўся невялікі натоўп.

— Ты ад якой арганізацыі? — пыталіся.

— Ад сябе.

— Ты б дома гэты плакат выставіў. Ха-ха!

— Жонка б тады пачаставала лепш.

— Хе, хе! Гарачым баршчом.

— А міліцыі не баішся?

— Цяпер дэмакратыя! — адрэзаў я. — Гэта ж страйк, а не хуліганства.

— Ты лепш ідзі ў цэнтр. На плошчу. Там цябе падтрымаюць. Нефармалы. Цяпер такіх шмат развялося.

Хутка ўсе разышліся. Нехта глядзеў на мяне, як на дурня. Я яшчэ трошачкі пастаяў. Пасля надумаў збірацца. Аж тут Макарчук з варот выязджае. На сваёй "Волзе".

— Ты што, на рабоце сёння не быў? — запытаўся ён, адчыніўшы дзверцы машыны.

— Я страйкую.

— Ну, ну, — пакруціў і ён пальцам ля скроні. — Мы цябе заўтра...

Пасля сабраўся прафсаюзны камітэт. За прагул з мяне вылічылі грошы. Пазбавілі прэміяльных. Грэзіліся перанесці адпачынак на снежань. Але не гэта мяне мучыла. Усе чамусьці падкрэслівалі, што ў мяне слабая палітычная падрыхтоўка. Што я "плаваю" ў марксізме, і зусім не разумею такой з'явы, як страйкавы рух. Таму настойліва рэкамендавалі і нават абязалі вучыцца палітграмаце. На днях я ўзяў у бібліятэцы "Капітал". Буду яго штудзіраваць. Каб наступны страйк правесці ў тэарэтычным узбраенні.

Пераклаў з украінскай Валерый БАБЕЙ

ЛіМ ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ

Саюз беларускіх пісьменнікаў; Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь; калектыў рэдакцыі газеты "Літаратура і мастацтва"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Газету рэдагавалі:

Х.Дунец	(1932-35)
І.Гурскі	(1935-41)
А.Куляшоў	(1945-46)
М.Горцаў	(1947-49)
П.Кавалёў	(1949-50)
В.Вітка	(1951-57)
М.Ткачоў	(1957-59)
Я.Шарахоўскі	(1959-61)
Н.Пашкевіч	(1961-69)
Л.Прокша	(1969-72)
Х.Жычка	(1972-76)
А.Асіпенка	(1976-80)
А.Жук	(1980-86)
А.Вярцінскі	(1986-90)

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ, Міхась ЗАМСКІ, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Жана ЛАШКЕВІЧ, Алесь МАРЦІНОВІЧ, Барыс ПЯТРОВІЧ — *першы намеснік галоўнага рэдактара*, Юрась СВІРКА, Віктар ШНІП — *намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі — 332-461
намеснікі галоўнага рэдактара — 332-525, 331-985
аддзелы:
публіцыстыкі — 332-525
пісьмаў і грамадскай думкі — 331-985
літаратурнага жыцця — 332-462
крытыкі і бібліяграфіі — 332-204
паэзіі і прозы — 332-204
музыкі — 332-153
тэатра, кіно і тэлебачання — 332-153
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў — 332-462
навін — 332-462
мастацкага афармлення — 332-204
фотакарэспандэнт — 332-462
бухгалтэрыя — 268-640

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Апаратныя сродкі і тэхнічная падтрымка — фірма "Дайнова"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку" (г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77)

Індэкс 63856. Наклад 7500.
Нумар падпісаны 1.2.1996 г.
Заказ 548/Г

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12